ISBN 978-985-6941-80-4

Нацыянальны інстытут адукацыі

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

ФАКУЛЬТАТЫЎНЫЯ ЗАНЯТКІ

Т. У. Логінава, Т. І. Мароз

# ТАЯМНІЦА ПАЭЗІІ І ЗАГАДКА ПРОЗЫ

7 КЛАС

Дапаможнік для вучняў

Нацыянальны інстытут адукацыі

Беларуская літаратура
Факультатыўныя заняткі

**Т. У. ЛОГІНАВА, Т. І. МАРОЗ**

# ТАЯМНІЦА ПАЭЗІІ І ЗАГАДКА ПРОЗЫ

## 7 клас

***Дапаможнік для вучняў агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання***

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Літаратура і Мастацтва»
2010

УДК 821.161.3.09(075.3=161.3=161.1)
ББК 83.3(4Беи)я721
Л69

Серыя заснавана ў 2010 г.

**Логінава, Т. У.**

Л69 Таямніца паэзіі і загадка прозы : 7-ы кл. : дапам. для вучняў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / Т. У. Логінава, Т. І. Мароз. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010. — 168 с. — (Беларуская літаратура. Факультатыўныя заняткі).

ISBN 978-985-6941-80-4.

**УДК 821.161.3.09(075.3=161.3=161.1)**
**ББК 83.3(4Беи)я721**

**ISBN 978-985-6941-80-4**

© Нацыянальны інстытут адукацыі, 2010
© Афармленне. РВУ «Літаратура і Мастацтва», 2010

## *Дарагія сябры!*

Перад вамі кніга, якая разам з вучэбным дапаможнікам «Беларуская літаратура. 7 клас» адкрые для вас шырокі свет мастацкага слова.

Як і ў падручніку, у гэтым дапаможніку творы падабраны такім чынам, каб скіраваць увагу на высвятленне галоўных асаблівасцей літаратуры як аднаго з відаў мастацтва. У абедзвюх кнігах мастацкія творы і заданні да іх дапамогуць вам знайсці блізкасць і падабенства або адрозненне паміж мастацкімі тэкстамі і выказанымі ў іх думкамі, літаратурнымі героямі, мастацкімі асаблівасцямі твораў.

Паглыбленне ў свет мастацкай літаратуры ў 7 класе працягваецца праз разгляд і супастаўленне двух відаў літаратурнай творчасці — паэзіі і прозы.

Прапанаваныя празаічныя і вершаваныя творы і заданні да іх дадуць вам магчымасць убачыць не толькі знешнія, фармальныя, адрозненні паэзіі і прозы, але і зразумець самае істотнае ў гэтых відах літаратурнай творчасці. На характар паэтычных і празаічных твораў надзвычай моцна ўплываюць іх дачыненні да жыцця, той жыццёвы змест, што яны выяўляюць. Паэзія — гэта не толькі рытмічная мова, але і мастацкая творчасць, якая абуджае моцныя

перажыванні, пачуцці, выклікае асаблівую настроенасць душы пры ўспрыманні з'яў навакольнай рэчаіснасці. Галоўнае ў прозе — стварэнне нейкай карціны жыцця, дакладнае, але пры гэтым вобразнае, апісанне жыццёвага факта ці эпізоду, паводзін чалавека. У празаічных творах увага акцэнтуецца не толькі на дадзеных буйным планам фігурах людзей і прадметах, але і на розных падрабязнасцях, што характарызуюць героя або канкрэтныя абставіны яго жыцця.

Спадзяёмся, што гэты дапаможнік зацікавіць вас, пашырыць веды пра мастацкую літаратуру, дапаможа знайсці адказы на тыя пытанні, што вас хвалююць.

# І. ЧАРАДЗЕЙНАЯ СІЛА МАСТАЦТВА

Пры дапамозе мастацтва кожная эпоха нясе ў будучае самыя свае запаветныя мары, думкі і пачуцці, самае істотнае з пражытага. Мастацтва адлюстроўвае ідэалы свайго часу, раскрывае душу народа, яго характар, здзяйсненні і надзеі.

Усе віды мастацтва (сярод іх літаратура, музыка, жывапіс, танец, скульптура і г. д.) вобразна адлюстроўваюць свет, але сродкі стварэння вобразаў у кожнага з іх свае: у музыцы — гукі і мелодыя, у жывапісе — фарбы і лініі, у танцы — рух. У літаратуры сродкам стварэння вобразаў служыць слова, мова.

Мастацтва валодае вялікай сілай уздзеяння на чалавека. Мы атрымліваем асалоду, калі слухаем музыку, чытаем добрую кнігу або ўглядаемся ў твор жывапісу. І адбываецца гэта дзякуючы людзям, якія малююць карціны, ствараюць музычныя творы, пішуць казкі альбо складаюць вершы. Усе гэтыя людзі — мастакі, якія ад прыроды надзелены талентам — здольнасцю да творчасці. Мастакі валодаюць уменнем перадаваць свае ўяўленні, пачуцці, думкі іншым людзям у мастацкіх вобразах. Іх адрознівае павышаная ўражлівасць, адчувальнасць да ўспрымання жыцця. Акрамя таго, гэтыя людзі надзелены абвостраным

пачуццём справядлівасці, спагадлівыя да чужой бяды, гатовыя прыйсці на дапамогу слабым і абяздоленым, заступіцца за іх. У часы радасці і смутку яны выступаюць сапраўднымі выразнікамі думак і пачуццяў свайго народа. За гэтыя якасці мастакі-музыкі заўсёды карысталіся сярод людзей вялікай павагай. У беларускім фальклоры мастак-музыка выступае як сапраўдны народны герой, надзяляецца самымі выдатнымі якасцямі: смеласцю, справядлівасцю, непадкупнасцю. І сёння да гэтай тэмы звяртаюцца пісьменнікі, амаль у кожнага з іх мы можам знайсці творы пра вялікую сілу мастацтва.

## МУЗЫКА-ЧАРАДЗЕЙ

*(Беларуская народная казка)*

Жыў некалі на свеце адзін музыка. Пачаў ён іграць яшчэ змалку. Бывала, пасучы валоў, зробіць з лазы дудачку ды як зайграе, дык валы скубці траву перастануць — натапыраць вушы ды слухаюць. У лесе птушкі прыціхнуць, нават жабы ў балоце не крумкаюць.

Паедзе на начлег — там весела: хлопцы і дзяўчаты пяюць, жартуюць — ведама, маладосць. А ноч цёплая, аж парыць. Любата.

Але вось музыка возьме ды зайграе на сваёй дудачцы. Усе — і хлопцы і дзяўчаты — адразу, як па камандзе, суцішацца. І кожнаму ў гэты час здаецца, што быццам нейкая слодыч улілася яму ў сэрца, нейкая невядомая сіла падхапіла яго і нясе ўсё ўгору ды ўгору — у чыстае сіняе неба, да ясных зорак.

Сядзяць начлежнікі, не зварухнуцца, забыліся, што натруджаныя за дзень рукі і ногі баляць, што голад даймае.

Сядзяць і слухаюць. І хочацца сядзець гэтак усё жыццё і слухаць ігру музыкі.

Змоўкне дудачка. Ды ніхто не адважыцца і з месца крануцца, каб не спужаць таго чароўнага голасу, што рассыпаўся пошчакам[1] па лесе, па дуброве ды ўздымаецца ў самае неба.

Зноў зайграе дудачка, ужо жаласліва. І тут такая нудота ўсіх ахопіць.

Ідуць позна дамоў з паншчыны мужыкі і бабы, пачуюць музыку, спыняцца, заслухаюцца. Вось так усё іхняе жыццё перад вачыма і стаіць — бядота ды гарота, ліхі пан ды цівун з прыганятымі. І такі іх жаль агорне, што не толькі бабы, а і мужыкі, старыя, барадатыя, плачуць, як па нябожчыку або нібы сынкоў у салдаты праводзяць.

Але вось музыка зайграе вясёлае. Пакідаюць мужыкі і бабы косы, граблі, вілы, возьмуцца ў бокі і давай скакаць.

Скачуць людзі, скачуць коні, скачуць дрэвы ў дуброве, скачуць зоркі, скачуць хмаркі — усё скача і смяецца.

Такі быў той музыка чарадзей: што захоча, тое з сэрцам зробіць.

Падрос музыка, зрабіў сабе скрыпачку ды пайшоў у свет. Куды прыйдзе — пайграе, за гэта яго накормяць, напояць, як самага лепшага госця, і яшчэ на дарогу дадуць.

Доўга хадзіў так па свеце музыка, весяліў добрых людзей, а ліхім панам без нажа сэрца рэзаў: бо куды ён не прыйдзе, там людзі перастаюць паноў слухаць. Стаў ён ім упоперак дарогі, як костка ў горле.

Надумаліся паны са свету яго звесці. Пачалі падгаворваць аднаго, другога, каб музыку забіў ці ўтапіў. Ды не знайшлося ахвотніка: простыя людзі любілі музыку, а прыганятыя баяліся: думалі, што ён чараўнік.

---

[1] Пошчак — рэха, водгулле.

Згаварыліся тады паны з чарцямі. А ведама: паны і чэрці — аднае шэрсці.

Ідзе аднаго разу музыка лесам, а чэрці наслалі на яго дванаццаць галодных ваўкоў. Заступілі яны музыку дарогу, стаяць, зубамі ляскаюць, вочы, як распаленыя вугалі, гараць.

Няма ў музыкі нічога ў руках, толькі пад пахаю скрыпка ў мяшэчку. «Ну, — думае ён, — канец мой прыйшоў».

Дастаў музыка з мяшэчка скрыпачку, каб яшчэ раз перад смерцю пайграць, прыхіліўся да дрэва ды павёў смычком па струнах.

Як жывая, загаварыла скрыпка, пайшоў пошчак па лесе. Замерлі кусты і дрэвы — лістком не варухнуць. А ваўкі як стаялі з разяўленымі пашчамі, так і скамянелі. Слухаюць і пра голад забыліся.

Перастаў музыка іграць, а ваўкі, як сонныя, у лес пацягнуліся.

Пайшоў музыка далей. Сонейка ўжо за лес закацілася, толькі яшчэ свеціць на самыя верхавінкі, быццам аблівае іх пазалотаю. Ціха, як у вуху. Вельмі харошы вечар.

Сеў музыка на беразе ракі, дастаў з мяшэчка скрыпку і зайграў. Ды так прыгожа, што заслухаліся і неба, і зямля. А калі ўрэзаў полечку, дык усё навакол давай скакаць. Зоркі мітусяцца, як зімою мяцеліца, хмаркі плаваюць па небе, а рыба так узгулялася, што рака кіпіць, як вада ў гаршку.

Не вытрымаў і вадзяны цар — пусціўся ў скокі. Ды так разышоўся, што вада заліла берагі; чэрці напужаліся і павыскаквалі з рачных нетраў. Усе злосныя, зубамі скрыгочуць, а нічога музыку зрабіць не могуць.

Тым часам бачыць музыка, што вадзяны цар нарабіў людзям бяды — заліў палеткі і агароды. Перастаў ён іграць, палажыў скрыпачку ў мяшэчак і пайшоў далей.

Ідзе ён ды ідзе, аж вось падбягаюць да яго два панічы.

— У нас сёння ігрышчы, — кажуць. — Пайграй нам, пане музыка. Мы табе заплацім, што захочаш.

Падумаў музыка — ноч на дварэ, начаваць няма дзе, ды і грошай няма.

— Добра, — кажа, — пайграю.

Прывялі панічы музыку ў палац. Бачыць ён — панічоў і паненак там хоць гаць гаці.

На стале нейкая вялікая ды глыбокая міска стаіць. Панічы і паненкі па чарзе падбягаюць да яе, памочаць палец у міску і мажуць сабе вочы.

Падышоў да міскі і музыка. Памачыў палец і памазаў вочы. І толькі зрабіў так, бачыць, што гэта не паненкі і панічы, а ведзьмы і чэрці, што ён не ў палацы, а ў пекле.

«Эге ж, — думае музыка, — дык вось на якое ігрышча зацягнулі мяне панічы! Ну добра. Я ж вам зараз пайграю!»

Наладзіў ён скрыпку, ударыў смычком па жывых струнах — і тут адразу ўсё пекла ў шчэпкі разляцелася, а чэрці з ведзьмамі разбегліся хто куды.

## Пытанні і заданні

1. На якi роздум навяло вас знаёмства з творам «Музыка-чарадзей»?

2. Знайдзіце ў казцы словы пра тое, як уздзейнічае мастацтва (гранне музыкі) на людзей, якія адчуванні выклікае ў іх.

3. Як характарызуецца ў казцы музыка-чарадзей?

4. Перакажыце эпізод казкі, як паны спрабавалі знішчыць музыку. Карыстайцеся сказамі з трапнымі народнымі выслоўямі:

а) Доўга хадзіў па свеце музыка, весяліў добрых людзей, а ліхім панам без нажа сэрца рэзаў.

б) Надумалі паны звесці са свету музыку.

в) А ведама: паны і чэрці — аднае шэрсці.
г) Заступілі ваўкі музыку дарогу, стаяць, зубамі ляскаюць, вочы, як распаленыя вугалі, гараць.
д) Як жывая, загаварыла скрыпка.
ж) Ваўкі, як сонныя, у лес пацягнуліся.

5. Што дапамагло музыку перамагчы ваўкоў?

6. Якой сілай была надзелена скрыпка?

7. Успомніце сродак мастацкай выразнасці, які характарызуецца моцным перавелічэннем памераў, уласцівасцей або якасцей.

8. Знайдзіце гіпербалы ў казцы «Музыка-чарадзей». З якой мэтай яны ўжываюцца? Пры адказе на гэтае пытанне можаце выкарыстаць слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў.

9. Да якога віду казак адносіцца гэты твор?

10. Паспрабуйце самі скласці фантастычную казку (з зачынам, традыцыйнымі паўтарамі і канцоўкай), каб галоўным героем выступаў таленавіты чалавек.

## Віктарына

♦ Прачытайце, як уздзейнічала музыка на герояў казкі, назавіце гэтых герояў:

1. У лесе птушкі прыціхнуць, нават жабы ў балоце не крумкаюць. — ...

2. І кожнаму ў гэты час здаецца, быццам нейкая слодыч улілася яму ў сэрца, нейкая невядомая сіла падхапіла яго і нясе ўгору ды ўгору — у чыстае сіняе неба, да ясных зорак. — ...

3. І хочацца сядзець гэтак усё жыццё і слухаць ігру музыкі. — ...

4. Скачуць людзі, скачуць коні, скачуць дрэвы ў дуброве, скачуць зоркі, скачуць хмаркі — усё скача і смяецца. — ...

5. Як жывая, загаварыла скрыпка, пайшоў пошчак па лесе. Замерлі кусты і дрэвы — лістком не варухнуць. — ...

6. А калі ўрэзаў полечку, дык усё навакол давай скакаць. Зоркі мітусяцца, як зімою мяцеліца, хмаркі плаваюць па небе, а рыба так узгулялася, што рака кіпіць, як вада ў гаршку. — ...

7. …Ударыў смычком па жывых струнах — і тут адразу усё пекла ў шчэпкі разляцелася… — ...

*Казачныя героі:*

1) валы і птушкі слухаюць гранне музыкі;
2) хлопцы і дзяўчаты;
3) начлежнікі;
4) мужыкі і бабы;
5) ваўкі;
6) вадзяны цар;
7) чэрці з ведзьмамі.

♦ назавіце тое агульнае, што яднае галоўнага героя народнай казкі «Музыка-чарадзей» з героем твора М. Багдановіча «Музыка».

♦ Якую ролю, на вашу думку, адыгрывае мастацтва ў жыцці чалавека?

***Генрык Сянкевіч[1]***

## ЯНКА-МУЗЫКА

Дзіця прыйшло на свет слабае і кволае.

Суседкі, што сабраліся ля ложка маткі,ківалі галовамі і над ёю, і над дзіцем.

Сымоніха, якая была разумнейшай за ўсіх, пачала суцяшаць хворую.

---

[1] Генрык Сянкевіч (1846—1916) — выдатны польскі пісьменнік. Напісаў шмат буйных твораў на гістарычныя тэмы («Агнём і мячом», «Патоп», «Крыжакі»), а таксама невялікія апавяданні пра жыццё бедных людзей.

— Дайце, — сказала яна, — запалю я над вамі свечку. Ужо нічога з вас, кумка, не будзе: час вам на той свет збірацца. І па ксяндза[2] паслаць трэба, каб ён вам грахі вашы дараваў.

— Ды ўжо ж, — падхапіла другая. — А хлопчыка ўжо зараз ахрысціць трэба, бо ён і ксяндза не дачакаецца. Добра, калі хоць нехрышчоны не памрэ.

Гэтак гаворачы, яна запаліла свечку, пасля, узяўшы дзіця, папырскала на яго вадою, так што яно вочкі пачало жмурыць, а сама праказала:

— Хрышчу цябе і даю табе імя Янка. А цяпер, душа хрысціянская, ідзі туды, адкуль прыйшла. Амін!

Але «душа хрысціянская» не мела ніякага жадання адыходзіць туды, адкуль прыйшла, і пакідаць сваё худзенькае цельца. Наадварот, яна пачала дрыгаць ножкамі і плакаць, хоць так слаба і жаласна, што суседкі казалі:

— Можна падумаць, што гэта кацянё запішчала.

Паслалі па ксяндза. Ён прыехаў, зрабіў сваю справу і паехаў.

Але хворай стала лепей. Праз тыдзень выйшла яна на работу. Хлопчык ледзь дыхаў. Толькі на чацвёртую вясну ён крыху акрыяў і сяк-так дацягнуў да дзесяці год.

Быў ён худы, загарэлы, жывот уздуты, а шчокі запалыя. Валасы, як лён, амаль белыя, звісалі на выпучаныя светлыя вочкі, якія пазіралі на свет так, быццам углядаліся на бяскрайнюю далеч.

Зімою сядзеў Янка ў запечку і плакаў часам ад холаду, часам ад голаду, калі ў мацеры не было чаго яму ні зварыць, ні спячы.

---

[2] Ксёндз — свяшчэннаслужыцель у касцёле.

Улетку хадзіў ён у кашульцы, падпяразанай матузком, і ў саламяным капелюшы, з-пад якога выглядаў, нібы верабей, задзіраючы галаву ўгару.

Маці яго, бедная падзёншчыца, перакідалася з дня на дзень, нібы ластаўка пад чужой страхой. Можа, яна і любіла яго па-свойму, але лупцавала часта, абзываючы зазвычай чарцянём.

На восьмым годзе ён быў ужо падпаскам і, калі дома не было чаго есці, хадзіў у лес па грыбы. Як яго воўк там не з'еў — незразумела.

Быў ён хлопчык нябойкі і, як усе вясковыя дзеці, калі гаварыў з людзьмі, палец у рот засоўваў. Не думалі людзі, што будзе з яго нейкі толк, не спадзяваліся, што вырасце ён матцы на радасць, таму што не ахвотнік ён працаваць. І незразумела, як гэта здарылася, што ён да адной толькі рэчы аказаўся здатны — да музыкі. Ён чуў яе ўсюды, і як толькі падрос крыху, дык ужо ні аб чым іншым і не думаў. Пойдзе, бывала, у лес са стадам або з дзецьмі ў ягады пабяжыць, вернецца без ягад і гаворыць:

— Матуля! Там штосьці ў лесе грала: вой, вой!

А маці яму на гэта:

— О то ж я табе зайграю! Дачакаешся ты ў мяне!..

І задавала часамі яму трапкачом «музыку». Хлопчык крычаў, абяцаў, што больш не будзе, а сам усё ж такі думаў:

«А ў лесе штосьці грала!»

Але што? Хіба ж ён ведаў?

Хвоі, бярозы, птушкі — усё грала. Увесь лес іграў, і ўсё тут.

Рэха таксама...

У полі граў яму быльняк, у садзе пад страхою чырыкалі вераб'і, ды так, што вішні гнуліся! Вечарамі слухаў ён галасы на вёсцы і, пэўна, думаў, што ўся вёска грае.

А як паслалі яго на поле гной раскідаць, дык яму нават вецер граў на вілах.

Угледзеў аднойчы прыганяты, як ён стаіць з раскудлачанымі валасамі і слухае гранне ветру на вілах, і, зняўшы з сябе папругу, адлупцаваў яго, каб памятаў. Але гэта не дапамагло.

Празвалі яго людзі Янка-музыка.

Вясною ўцякаў ён з дому майстраваць дудкі ля крыніцы. Начамі, калі жабы пачыналі квакаць, дзяргач[1] на лугах скрыпець, кнігаўкі па росах крычаць, а пеўні за плятнямі пяюць, Янка не мог спаць і ўсё слухаў. І хто яго ведае, якую ён у гэтым знаходзіў музыку!..

Маці не магла яго браць з сабою ў касцёл. Як толькі, бывала, загудзе арган ці пачнуцца спевы, Янкавы вочкі зацягвала туманам, і ўвесь ён рабіўся сам не свой.

Уночы вартаўнік, што хадзіў па вёсцы, бачыў не раз, як мільгала белая кашулька Янкі, які прабіраўся да карчмы. Там, прытаіўшыся ля сцяны, ён слухаў. Людзі ў карчме старанна скакалі «Абёртас»[2]. Хлопцы пакрыквалі: «У-ха!» Чуваць быў тупат ботаў і галасы дзяўчат. Скрыпкі пелі ціха: «Будзем есці, будзем піць, будзем весела мы жыць!» А кантрабас важна ўторыў ім грубым голасам. Вокны ў карчме ярка свяціліся, і здавалася, кожная бэлька таксама дрыжыць, пяе і грае.

А Янка слухаў...

Што б ён аддаў за тое, каб мець скрыпку, якая б так міла спявала: «Будзем есці, будзем піць, будзем весела мы жыць!» Такія дошчачкі пявучыя! Так, але дзе ўзяць іх?

---

[1] Дзяргач, або драч — лугавая птушка.
[2] «Абёртас» — назва танца.

Дзе іх робяць? Калі б хоць раз адзін далі яму ў рукі штонебудзь падобнае... Ды дзе ўжо! Яму толькі слухаць можна, і то да пары, пакуль вартаўнік не пакліча яго ў цемры:

— А ці не час табе ўжо дадому?

Тады босы бег ён дадому, а ў цемры наўздагон яму ляцеў голас скрыпкі:

Будзем есці, будзем піць,
Будзем весела мы жыць!

— і паважны голас кантрабаса ўторыў ёй.

Вялікім святам было для яго паслухаць скрыпку ці на вяселлі, ці на дажынках. Пасля залезе на печ і цэлымі днямі маўчыць, паглядаючы з цемнаты, нібы кот, бліскучымі вачыма.

Нарэшце ён сам сабе змайстраваў скрыпку з дранак і конскага воласу, але яго скрыпка не хацела так цудоўна граць, як там, у карчме: ціха-ціха пішчэла яна, нібы камар або мышка.

Усё ж іграў ён на ёй з ранку да вечара, хоць столькі за гэта перападала яму штурхачоў, што стаў ён падобен да пабітага зялёнага яблыка. Але, відаць, так яму было суджана! Хлопчык усё больш худзеў, толькі жывот у яго быў заўсёды ўздуты ды валасы на галаве зрабіліся гусцей, а шырока раскрытыя вочы ўсё часцей набягалі слязьмі. І ўсё глыбей западалі шчокі і грудзі.

Зусім не быў ён падобны да іншых дзяцей, ён быў больш падобны да сваёй скрыпкі з дранак, якая ледзь-ледзь гучэла. Перад новым хлебам амаль паміраў ён з голаду і жывіўся толькі жывой морквай ды марай набыць скрыпку.

Але гэта не давяло яго да дабра.

У панскім маёнтку меў скрыпку слуга, які часамі па вечарах граў на ёй.

Янка падкраўся праз лапухі да расчыненых дзвярэй буфетнай, каб паглядзець на скрыпку. Скрыпка вісела на сцяне, якраз насупраць дзвярэй.

І ўсю сваю душу ўкладаў хлопчык у разгляданне скрыпкі. Здавалася яна яму недаступнай святыняй, да якой ён няварты дакрануцца, здавалася самай заветнай любоўю. І ўсё ж ён прагнуў яе мець. Хацелася яму хоць адзін раз узяць яе ў рукі і паглядзець бліжэй. Яго беднае маленькае сэрца дрыжэла ад адной думкі аб такім шчасці.

Аднаго разу ўначы ў буфетнай нікога не было. Паны даўно жылі за граніцай, дом быў пусты, і слуга сядзеў на другой палавіне пакояў. Прытаіўшыся ў лапухах, Янка даўно ўжо глядзеў праз расчыненыя дзверы на мэту ўсіх сваіх жаданняў. Поўны месяц свяціў у небе, і святло яго коса падала ў акно буфетнай, адбіваючыся вялікім светлым квадратам на процілеглай сцяне. Гэты квадрат паволі набліжаўся да скрыпкі, пакуль, нарэшце, не асвятліў яе ўсю. Здавалася, што з цёмнай глыбіні пакоя скрыпка струменіць срэбнае святло. Яе краі і пукатыя часткі былі асветлены так моцна, што Янка ледзь мог глядзець на іх. У гэтым святле ўсё было выразна відаць: увагнутыя бакі, струны і выгнутая шыйка. Як светлякі, свяціліся калочкі, а смычок звісаў, нібы срэбны прут.

Як усё гэта было прыгожа, нібы ў казцы. І з якою прагнасцю глядзеў на ўсё гэта Янка! Прытаіўшыся ў лапухах, упёршыся локцямі ў худыя калені, сядзеў ён з адкрытым ротам і ўсё глядзеў і глядзеў. То страх утрымліваў яго на месцы, то нейкая незвычайная сіла штурхала наперад.

Ці чары якія, ці што?

Скрыпка ў месячным ззянні, здавалася, плыла, набліжаючыся да дзіцяці. Момантамі яна цьмянела, каб пасля яшчэ мацней заблішчэць. Чары, сапраўды, чары!

Але вось падзьмуў вецер, зашумелі ціха дрэвы, зашасталі лапухі, і Янка выразна пачуў:

— Ідзі, Янка! У буфетнай няма нікога. Ідзі, Янка!

Ноч была светлая, ясная. У панскім садзе, над прудом, салавей пасвістваў то цішэй, то гучней: «Ідзі! Увайдзі! Вазьмі!»

Казадой закружыўся над галавою хлопчыка і крыкнуў: «Не трэба, Янка, не трэба!»

Але казадой паляцеў, а салавей застаўся, і лапухі шапталі ўсё ясней: «Там няма нікога!»

Скрыпка заззяла зноў.

Бедная, маленькая, сагнутая постаць паволі і асцярожна пасоўвалася ўперад, а салавей ціхенька пасвістваў: «Ідзі! Увайдзі! Вазьмі!»

Белая кашулька мільгала ўсё бліжэй, пасоўваючыся да дзвярэй буфетнай. Яе ўжо не хаваюць цёмныя лапухі.

На парозе буфетнай чуецца частае дыханне хворых грудзей хлопчыка...

Яшчэ хвіліна — і белая кашулька знікла, і толькі адна босая ножка яшчэ відаць за парогам. Дарэмна, казадой, прылятаеш ты яшчэ раз і крычыш: «Не, не!» Янка ўжо ў буфетнай.

Нібы спалохаўшыся, заквакалі жабы ў ставе і сціхлі. Салавей спыніў свой спеў, лапухі перасталі шастаць. Янка поўз паволі і асцярожна, але раптам яму зрабілася страшна. У лапухах ён адчуваў сябе, як дзікі звярок у лясным гушчары, а тут ён быў як дзікі звярок у пастцы. Рухі яго сталі таропкімі, дыханне кароткім, са свістам. Цемра атуліла яго з усіх бакоў. Ціхая летняя бліскавіца, праляцеўшы з усходу на захад, асвятліла яшчэ раз буфетную і Янку, які стаяў на чацвярэньках перад скрыпкай, з галавой, паднятай угару.

Але бліскавіца знікла, хмарка засланіла месяц, і ўжо не было больш нічога ні відаць, ні чуваць.

Праз момант з цемры пачуўся гук, ціхі-ціхі і плаклівы, быццам хтосьці неасцярожна крануў струны... і раптам...

Грубы сярдзіты голас з кута буфетнай запытаў сярдзіта:

— Хто там?

Янка затрымаў дыханне, але грубы голас зноў запытаў:

— Хто там?

Запалка чыркнула аб сцяну, зрабілася светла, а потым... Пачуліся праклёны, удары, плач дзіцяці, просьбы... брэх сабакі, мільганне святла ў вокнах, крык на двары...

Назаўтра бедны Янка стаяў перад судом старасты.

Збіраліся там яго судзіць, як злодзея? Вядома. Але паглядзелі на яго староста і суддзі, як ён стаяў перад імі, спалохана вылупіўшы вочы, засунуўшы палец у рот, маленькі, худы, не разумеючы, дзе ён і чаго ад яго хочуць...

Як судзіць такога? Дзесяць год яму толькі, і сам ён ледзь на нагах трымаецца.

У турму яго адаслаць, ці што?

Трэба ўсё ж такі пашкадаваць крыху дзіця. Няхай возьме яго вартаўнік і дасць яму розгі, каб не краў другі раз, і ўсё.

— Правільна!

Паклікалі вартаўніка Стаха.

— Вазьмі і дай яму, каб помніў!

Стах кіўнуў сваёю дурною галавой, узяў Янку пад паху, нібы кацянё, і панёс у хлеў.

Янка ці не разумеў, у чым справа, ці вельмі напалохаўся, але ён не сказаў ні слова і толькі глядзеў, як птушанё.

Наўрад ці ён ведаў, што з ім зробяць. Толькі калі Стах паклаў яго ў хлеве на зямлю і, задраўшы кашульку, з усёй сілы хвастануў розгай, толькі тады Янка крыкнуў:

— Мама!..

І за кожным ударам ён ускрыкваў: «Мама! Мама!..» — але ўсё цішэй, слабей, пакуль, нарэшце, зусім не заціх і не зваў ужо маці.

Бедная, разбітая скрыпка!

Эх, дурны, злы Стах! Хто ж б'е так дзяцей? Ён жа маленькі і слабы і заўсёды ледзь жывы быў...

Прыйшла маці, забрала хлопчыка дадому, але прыйшлося ёй несці яго на руках.

На другі дзень не ўстаў Янка, а на трэці пад вечар ціха паміраў на лаве пад дзяругамі.

Ластаўкі шчабяталі на чарэшні, што расла ля хаты.

Праменьчык сонца, што пранік у акно, залаціў ускудлачаную галоўку дзіцяці і тварык, у якім не засталося ні крывінкі.

Запалыя Янкавы грудзі слаба дыхалі, а сам ён нібы прыслухваўся да гукаў вёскі, што даляталі да яго праз адчыненае акно. Быў вечар, і дзяўчаты, вяртаючыся з сенажаці, спявалі: «Ой, на мураве, на зялёнай». Ад крыніцы даносілася пяянне дудачак. Янка апошні раз слухаў, як грае вёска.

Каля яго ляжала яго скрыпка з дранак.

Раптам твар паміраючага дзіцяці прасвятлеў, і з бялеючых вуснаў сарваўся шэпт:

— Мама!

— Чаго, сынок? — адгукнулася маці, якую душылі рыданні.

— Мама, ці будзе ў мяне на тым свеце сапраўдная скрыпка?

— Будзе, сынок!..

Больш яна не магла гаварыць: з яе грудзей раптам вырваўся крык невыказнай роспачы. Яна ўпала тварам на

скрыню і пачала стагнаць, як звар'яцелая, як маці, якая зразумела, што не вырве ўжо ў смерці сваё дзіця.

І сапраўды не вырвала, таму што, калі яна падняла галаву і паглядзела на Янку, вочы маленькага скрыпача былі расплюшчаны і нерухомы, твар жа пацямнеў і застыў. Прамень сонца таксама знік.

Спі спакойна, Янка!

Назаўтра вярнуліся з Італіі гаспадары маёнтка. Яны гаварылі паміж сабою:

— Якая цудоўная краіна Італія! Якое шчасце знаходзіць там таленты і дапамагаць ім!

Над Янкам шумелі бярозы.

## Пытанні і заданні

1. Які эпізод апавядання зрабіў на вас самае моцнае ўражанне? Чаму?

2. У якой сям'і нарадзіўся Янка? Як складвалася яго жыццё?

3. Як аўтар характарызуе героя, малюе яго партрэт? Зачытайце адпаведныя прыклады з твора.

4. Якое было ў Янкі самае вялікае захапленне?

5. За што быў пакараны хлопчык? Ці быў ён у чым-небудзь вінаваты?

6. Параўнайце Янку з Сымонкам — героем твора Якуба Коласа «У яго быў свет цікавы...» (урывак з паэмы «Новая зямля»).

— Адшукайце ў тэксце абодвух твораў радкі, у якіх аўтары раскрываюць непаўторнасць успрымання Сымонкам і Янкам навакольнага свету. Зачытайце іх.

— У чым яшчэ вы бачыце падабенства іх лёсаў? Пры адказе карыстайцеся цытатамі з тэксту.

— Прывядзіце аргументы да выказвання: «У творах Я. Коласа і Г. Сянкевіча паказана цяжкае жыццё таленавітых дзяцей. Яднае Янку з Сымонкам і тое, што родныя і чужыя людзі абыякава ставіліся да іх незвычайнай адоранасці»

7. Ці адчуваеце вы адносіны аўтара да гаспадароў маёнтка ў перадапошніх радках апавядання: «Якая цудоўная краіна Італія! Якое шчасце знаходзіць там таленты і дапамагаць ім!»?

## Крыжаванка

Праверце свае веды па творы Г. Сянкевіча «Янка-музыка» і назавіце ключавое слова, якое абазначае адлюстраванне жыцця ў мастацкіх вобразах.




1. Музыкант або від мастацтва.

*2.* Птушка, якая адгаворвала Янку лезці ў пакой па скрыпку.

3. Імя вартаўніка, якога прызначылі пакараць Янку.
4. Здольнасць да творчасці.
5. Краіна, з якой вярнуліся гаспадары маёнтка.
6. Занятак маці героя.
7. Пакой, у якім знаходзілася скрыпка.
8. Прозвішча аўтара твора.
9. Свята збору ўраджаю, на якім герою даводзілася слухаць скрыпку.

*Словы для выкарыстання: буфетная, дажынкі, Сянкевіч, талент, Стах, казадой, музыка, падзёншчыца, Італія,*

***Змітрок Бядуля***

## МУЗЫКА

Пастушок Васілька з самых малых дзён любіў іграць на жалейцы. Іграючы, яму ніколі не было нудна са статкам сваім у самым дзікім гушчары, на самых глухіх палянах сярод балота.

Ён іграў і іграў. Так шчыра іграў, ад усёй душы, ажно сам цешыўся, і ўсё навокал яго цешылася. Васілька любіў усім сэрцам сваю жалейку. Моцна любіў. Ён мог забывацца палуднаваць, але іграць ён ніколі не забываўся. І таму ён навучыўся іграць вельмі прыгожа.

Гэта ўцяміла ўся ваколіца. Гэта ведаў яго статак. У гэтым пераканаліся лес, поле, рэчка, рыбкі, птушкі, звяры, казюлькі і ўсе самыя драбнюткія стварэнні на паляне.

Бывала, як зайграе Васілька вясёлую песеньку, дык неба весялілася, сонца смяялася, дрэўцы ківаліся ў такт. Зляталіся розныя птушкі, збягаліся розныя звяры, спаўза-

ліся розныя гадзіны слухаць ігру пастушка. Рэхі каціліся ад дрэва да дрэва, ад горкі да горкі, ад лугу да лугу і склікалі ўсіх. Усім істотам было весела і добра ад яго песняў.

А калі пастушок іграў жаласлівую песню, дык сумна рабілася на полі. Краскі слязамі расістымі пакрываліся. Дрэўцы і кусты нямелі, а высока над полем хмаркі затулялі яснае неба. Усе жывыя істоты апускалі галовы і глыбока задумваліся. Але і смутак-жаль ад трэляў жалейкі быў усім прыемны, як свежы ранішні туман, і салодкі, як ліпавы мёд. Усім нечага надзвычайнага жадалася пры яго ігры. Усіх Васілька зачароўваў. Над усім ён панаваў са сваёй жалейкай, якая мела ў сабе вялікую сілу.

Прыходзілі на адукацыю да настаўніка ўсе, хто толькі меў сэрца жывое. Ён іх вучыў старанна, бо чым болей музыкаў было вакол, тым болей ён радаваўся. А вучыў ён не проста, але па нотах. Нотамі ў яго былі не такія нямыя і мёртвыя значкі і круцёлачкі на паперы, а ўся жывая зямелька са сваімі рознакаляровымі краскамі, траўкамі, дрэвамі і серабрыстымі крынічкамі. Блакітнае неба са сваімі свечкамі-зоркамі, размаітымі хмаркамі, пераліўнымі зарніцамі і фарбамі. Гэта ўсё было нотамі для пастушка, гутарлівымі, спяваючымі і рухлівымі. Па іх вельмі лёгка было вучыцца.

Першага навучыў пастушок сваёй музыцы салоўку. Салоўка быў яго найлепшым вучнем. Калі адукаваны салоўка спяваў апоўначы ў бярэзніку, дык не то што блізкія істоты, але і далёкія зоркі ў небе слухалі з прыемнасцю і пераміргваліся ад дзіва паміж сабой, кажучы: «Глядзіце, сястрычкі, такі малы шэры жэўжык, а якія слаўныя трэлі выводзіць».

Пасля салоўкі вучыўся ў пастушка жаваранак. Гэта была не такая здольная птушачка, як салоўка, але з грахом папалам і жаваранак патрапіў бы іграць вяселле

лёгкім хмаркам пад вясновым небам над свежым, пуховым чарназёмам.

Пасля салоўкі і жаваранка вучыліся і іншыя птушкі. «Усе пяюць, усе іграюць, — падумаў хлопчык. — Увесь свет пад сонейкам мае сваю музыку». Вялікая пашана з'явілася ў хлопчыка да ўсяго свету.

«Давай, — падумаў хлопчык, — зайграю для сонейка, якое пануе над усім светам!»

І вось у адну пекную раніцу хлопчык яшчэ цямнютка выгнаў статак у поле. На прасторы ён зайграў на сваёй жалейцы. Зайграў прыгажэй, чым заўсёды. Уся пекната летняй зямлі адбілася ў яго песні.

Гэткай прыгожай музыкі яшчэ ніхто на свеце не чуў. Гэта была песня без слоў, бо хлопчык іграў для сонейка, а сонейка без слоў добра разумела. Дзівіўся статак. Дзівіліся дрэвы, птушкі, рэчка, неба. Дзіву давалася ўся зямля.

— Калі для сонейка, дык і мы да кампаніі! — сказалі ўсе істоты ў полі і ў лесе.

І вось на ўсходзе сонейка на лузе пачалася вялікая музыка: усе стварэнні на зямлі і сама зямля ігралі і спявалі, кожны на свой лад, на тысячы-тысячы галасоў.

Увесь свет выглядаў велізарнай скрыпкай з незлічона многімі струнамі. Гэта было так хораша, так цудоўна прыгожа, ажно само сонейка вельмі ўзрадавалася. Спусцілася сонейка з неба на сваіх лёгкіх прамяністых скрыдлах і пацалавала маленькага хлопчыка ў самыя вусны. Пацалунак быў такі лёгкі, што пастушку здалося, нібы кволы ветрык толькі крануўся яго твару. Пацалунак быў такі шчыры, што хлопчык да самай магілы аб ім не забудзе.

А сонейка было такое радае і добрае, што задумала апрануць зямлю ў багатыя вопраткі, у шаўковыя і залатыя колеры. І ззяць, ззяць і радаваць усіх.

З-пад аксамітнай і пурпуровай хмаркі ўзышло яно гарачае і бліскучае. Узышло ды ўсміхнулася. Усміхнулася ды яшчэ вышэй паднялося і абсыпала сваімі праменнямі зялёны ўзгорак, дзе стаяў пастушок. Пастушок выглядаў не то сярэбраным, не то залатым. Праменні красавалі, як агнёвыя васількі, на яго галаве. Праменні пырскалі яму ў твар дыяментавымі снапамі. Праменні сыпаліся бліскучымі іскрамі, каляровым макам з яго вачэй. Здавалася, што ў пастушковых вачах драбнюткія хохлікі крэсяць агонь бесперастанку.

Хлопчыку так добра зрабілася на душы, што яму захацелася глянуць на сябе. Ён падышоў да рэчкі, каб зірнуць у яе, як у люстэрка.

— Глядзі, глядзі ў мяне, — сказала рэчка, — бо твая душа чыстая і празрыстая, як мая вада!

Зірнуў хлопчык у ваду і сам сябе не пазнаў. Такі ён стаў прыгожы!

Гэты цуд утварылі над ім летняе сонейка і надзвычайнае шчасце, якое азарыла яго ўсяго...

## Пытанні і заданні

1. Якімі якасцямі надзелены галоўны герой твора? У чым выявіўся яго талент?

2. Якую сілу мела жалейка?

3. Як рэагуюць на гранне пастушка людзі і прырода? Назавіце герояў (устаўце патрэбнае слова), якія так радуюцца вясёлай песеньцы пастушка (пры неабходнасці звярніцеся да тэксту):

весяліліся...

смяяліся...

ківалі ў такт...

зляталіся...

спаўзаліся...
каціласся ад дрэва да дрэва, ад горкі да горкі...

А зараз назавіце тых, чыё сэрца напаўняецца смуткам ад жаласлівай песні Васількі:
слязьмі расістымі пакрываліся...
нямелі...
затулялі яснае неба...
апускалі галовы і глыбока задумваліся...

4. Пастушок вучыў усіх жадаючых свайму майстэрству па нотах. Ці звычайныя былі гэтыя ноты?

5. Назавіце аднаго з вучняў пастушка, які спяваў так, што не толькі «блізкія істоты, але і далёкія зоркі ў небе слухалі з прыемнасцю».

6. Узгадайце вучня Васількі, які быў здольны «іграць вяселле лёгкім хмаркам».

7. З якой нагоды сталася, што «увесь свет выглядаў велізарнай скрыпкай з незлічонымі многімі струнамі»

8. Як аддзячыла сонейка пастушку і ўсяму свету за чароўную музыку?

9. Вызначце ідэю твора.

10. Што яднае Васільку з героем народнай казкі «Музыка-чарадзей» і Янкам з апавядання Г. Сянкевіча «Янка-музыка»?

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ ПАДАГУЛЬНЕННЯ ПА РАЗДЗЕЛЕ

1. Успомніце творы, вывучаныя ў папярэдніх класах і прачытаныя самастойна, дзе галоўнымі героямі з'яўляюцца таленавітыя людзі.

2. Дайце азначэнне таленту. Працягніце пералік эпітэтаў да характарыстыкі таленту: яскравы, бліскучы, магутны, выключны...

3. Чаму, на вашу думку, вобразы музычных інструментаў: дудкі, жалейкі, скрыпкі, гусляў — сімвалізуюць мастацтва ў літаратурных і фальклорных творах?

4. Чым адрозніваюцца фальклорныя казкі ад літаратурных?

5. Да якіх твораў (фальклорных ці літаратурных) адносіцца казка?

6. Па якіх законах будуюцца казкі?

7. Якія віды казак традыцыйна вылучаюцца?

8. Пазнайце героя па апісанні знешнасці:

«Быў ён худы, загарэлы, жывот уздуты, а шчокі запалыя. Валасы, як лён, амаль белыя, звісалі на выпучаныя светлыя вочкі, якія пазіралі на свет так, быццам углядаліся на бяскрайнюю далеч».

9. Успомніце назву твора і яго аўтара па прапанаваным урыўку:

«І ўсю сваю душу ўкладаў хлопчык у разгляданне скрыпкі. Здавалася яна яму недаступнай святыняй, да якой ён няварты дакрануцца, здавалася самай заветнай любоўю. І ўсё ж ён прагнуў яе мець. Хацелася яму хоць адзін раз узяць яе ў рукі і паглядзець бліжэй. Яго беднае маленькае сэрца дрыжэла ад адной думкі аб такім шчасці».

10. Аб'яднайце аўтараў і іх творы:

| | |
|---|---|
| Генрык Сянкевіч | «Музыка» |
| Народная казка | «Музыка-чарадзей» |
| Змітрок Бядуля | «Янка-музыка» |

11. Прадоўжыце пералік рыс характару, якія аб'ядноўваюць герояў усіх прачытаных у раздзеле твораў.

а) незвычайная адоранасць ва ўспрыманні свету;

б) служэнне народу;

в)
г)
д) і інш.

12. Ці можна сцвярджаць, што самае галоўнае, што аб’ядноўвае розныя віды мастацтва, — уздзеянне на чалавека, на яго пачуцці, што мастацтва валодае вялікай сілай уздзеяння на чалавека, творы мастацтва не толькі прыносяць асалоду, яны здольныя зрабіць чалавека лепшым? Прывядзіце аргументы.

13. Падрыхтуйце паведамленне «Вобраз творцы ў мастацтве: літаратуры, жывапісе, музыцы».

# II. АКРЫЛЕНАСЦЬ ПАЭЗІІ І РАЗВАЖЛІВАСЦЬ ПРОЗЫ

Праверце свае веды пра асаблівасці вершаваных і празаічных твораў:

Літаратурныя творы бываюць двух відаў: ... і ...

Звычайна невялікія па аб’ёме ... творы, значна большыя — ... творы.

Кароткімі радкамі і ў слупок пішуцца ... творы.

Сказамі, якія могуць быць і кароткія, і вельмі доўгія, пішуцца ... творы.

Існуе вялікая розніца ў асаблівасцях мовы: наяўнасць рытму і рыфмы ўласціва ... мове, а свабодна арганізаваная мова ўжываецца ў ... творах.

Аднак і гэтым не абмяжоўваюцца адрозненні паміж … і … творамі. Ёсць яны і ў спосабах, сродках і прыёмах паказу жыцця: у ... творах вялікая роля належыць вобразным выразам, паэтычным прыёмам — параўнанням, эпітэтам, метафарам, гукавым паўторам і г. д. Яны робяць

твор перапоўненым моцнымі ўражаннямі, перажываннямі, а мове надаюць эмацыянальнасць і ўзрушанасць.

У ... творах такія сродкі і прыёмы таксама ўжываюцца, але не на іх акцэнтуецца ўвага. Галоўнае ў ... творы — стварэнне нейкай карціны жыцця, дакладнае, хоць і таксама вобразнае апісанне эпізоду ці паводзін чалавека. У ... творы ўвага спыняецца не толькі на дадзеных буйным планам фігурах людзей ці прадметах, але і на розных падрабязнасцях: рысах твару, дэталях аддзення, — якія характарызуюць героя або абставіны яго жыцця.

Два розныя віды літаратурнай творчасці — ... і ... — складаюць тое, што мы называем мастацкай літаратурай.

Прачытайце творы на адну тэму. Звярніце ўвагу на знешняе адрозненне, а таксама на спосабы, сродкі і прыёмы паказу жыцця ў вершаваных і празаічных творах.

*Валерый Пазняк*

## ПРЫХОДЗІЦЬ ЧАС СВЯТЫ

Маэстра, выхад ваш. Музыкі
Смыкамі толькі павялі...
І вось прыходзіць час, калі,
Хай на хвілінку, на зямлі
Маленькі чалавек — вялікі.

Да сэрца скрыпку — як дзіця.
Хай тут — хвіліны забыцця,
Ды, можа, гэтыя хвіліны —
Таго, сапраўднага жыцця,
Якім і быць яно павінна?

Здаецца, жорсткасць, хцівасць, злосць
Кудысьці ўдалеч адыходзяць...
Прыходзіць час святы, прыходзіць,
Калі святло ў душы ўзыходзіць
І свет ратуе прыгажосць.

## Пытанні і заданні

1. Якія пачуцці перадае аўтар у гэтым творы?

2. Які цуд здольна тварыць музыка? Пры адказе прывядзіце прыклады таго, што мастацтва ўзвялічвае чалавека, паднімае яго над паўсядзённасцю, робіць шчаслівым.

3. Прачытайце яшчэ раз першы вершаваны сказ: «Маэстра, выхад ваш». Тлумачальны слоўнік дае такое вызначэнне слову «маэстра»: ганаровая назва выдатнага кампазітара, музыканта або іншай творчай асобы. На які лад настройвае такі зварот да музыканта? Якой патрабуе інтанацыі?

4. Якім, на думку аўтара, павінна быць «сапраўднае жыццё»?

5. Як вы разумееце выраз: «свет ратуе прыгажосць»?

6. Знайдзіце ў вершы надзвычай выразны і наглядны вобраз, які створаны пры дапамозе параўнання.

7. Якімі яшчэ вобразна-выяўленчымі сродкамі карыстаецца аўтар, каб данесці да нас чарадзейную сілу мастацтва?

8. Вызначце аўтарскія адносіны да ўзнятай праблемы.

*Кастусь Жук*

## СКРЫПКА

Не слухаў скрыпкі я даўно.
Той, на якой адзін музыка
выпешчваў гэтакія зыкі —
Дых перахватвала ажно.

Няма музыкі ўжо на свеце,
Ды выраслі музыкі-дзеці,
І, чутка ёсць, малодшы сын
Умее так, як граў Марцін.

Ото і граў ён! Божа мой...
Здавалася:
гусей чароды
Плылі ў палоне асалоды
І пошум крыл — над галавой.

Стаіш, не ведаючы, што
Цябе трымае, не пускае,
А песня доўгая такая —
Са струн то весялосць, то стогн...

І не сказаць, што пальцаў двух
Не стала ад вайны ў Марціна:
Спявае скрыпка,
як даліна,
Дзе ў травы свішча вецер-зух.

Няма Марціна ўжо даўно...
А я ўсё помню,
як музыка

Выпешчваў гэтакія зыкі —
Дых перахватвала ажно.

## Пытанні і заданні

1. Перадайце свае ўражанні ад верша.

2. Што яднае верш Кастуся Жука «Скрыпка» з папярэднім вершам на тую ж тэму?

3. Чаму ў галоўнага героя нават праз шмат гадоў засталося незабыўнае ўражанне ад грання Марціна? (Пры адказе на гэта пытанне выкарыстайце радкі:

А песня доўгая такая —
Са струн то весялосць, то стогн...)

4. Растлумачце сэнс радка «выпешчваў гэтакія зыкі». (Звярніце ўвагу на дзеяслоў *выпешчваў*, які мае агульны корань са словам *пяшчота*. Ці дапамагае гэта зразумець аўтарскія адносіны да Марціна?)

5. Ці маглі б мы назваць Марціна маэстрам? Што дае нам такое права?

6. Якія радкі верша даюць падставу сцвярджаць думку пра неўміручасць мастацтва?

7. Назавіце ўжытыя аўтарам вобразныя сродкі пры стварэнні мастацкага вобраза скрыпкі:

Спявае скрыпка,
як даліна,
Дзе ў травы свішча вецер-зух.

8. Калі абагульніць усе вашы веды пра таленавітых людзей, то якімі рысамі абавязкова будзе надзелены зборны вобраз мастака-музыкі?

*Уладзімір Дамашэвіч*

## АБУДЖЭННЕ

Мне было тады гадоў дзесяць, не больш. Мы жылі бедна, свае зямлі мелі ўсяго каля трох гектараў, а зямля пясчаная, камяністая, неўрадлівая. Хлеба да новага ніколі не хапала. Нават не да новага, а да вясны. Таму бацька часта паўтараў паляшуцкую прымаўку, што ніколі не даводзіцца наесціся на поўную губу бярозавага соку з хлебам: хлеб ёсць — соку няма, ёсць сок — хлеба няма.

Бацька ездзіў па заработках, а летам, ухадзіўшыся ля дома, ішоў на работу да пані Ласоўскай, у суседнюю вёску Гасцілавічы. Туды ж я кожны дзень улетку вадзіў на павадку пасвіць сваю карову, а за гэта памагаў панскаму пастуху сцерагчы вялізны статак.

Пані Ласоўская, старая ўдава, мела добры маёнтак, сваю сыраварню. У яе было трое ўжо дарослых дзяцей: два сыны і дачка-красуня. Дачку звалі Маруся. Ёй было гадоў мо васямнаццаць, калі пачалі гаварыць, што хутка яна выходзіць замуж за маладога статнага шляхцюка з-пад Клецка — Сеўрука.

Вяселле назначылі недзе перад жнівом, бо ў маладога не так даўно памерла маці і ў яго гаспадарцы не было жанчыны. Вось ён і спяшаўся. Вяселле было багатае, люднае. І не дзіва — адна дачушка, пешчаная, прыгожая, як ружа. Чарнявая, з доўгімі косамі, з тонкім прамым носам, з поўнымі вуснамі, стройная, як маладая таполя, яна з малых год ведала сабе цану. Казалі, што ў панны Марусі не было адбою ад жаніхоў — багатых, паважаных і, як звычайна, паноў у гадах, але яна выбрала хоць не такога багатага, як сама, але чалавека прыстойнага і сімпатычнага з твару.

Словам, вяселле было як трэба. Гасцей напрыязджала многа, і ўсё не абы-хто: суседзі — паны і паўпанкі, чыноўнікі з Ляхавіч, нават з Баранавіч, і яшчэ вышэй — з ваяводства, што ў Навагрудку.

Але ўсё гэта зацьміла музыка. Іграў аркестр. Не аркестр, а хутчэй сямейны ансамбль ці як яго яшчэ лепш назваць. Музыканты былі з Баранавіч, усе з адной яўрэйскай сям'і: дзве сястры, брат і муж аднае з сясцёр. Чатыры музыканты на чатыры інструменты: скрыпку, акардэон, віяланчэль і бубен. Але як яныігралі! Гэта трэба было чуць і бачыць. Больш за ўсіх кідалася ў вочы скрыпачка, апранутая ў чорную дарагую сукенку, чорненькая, невысокая і зграбная, з вялікімі цёмнымі вачыма на белым твары і чорнымі пышнымі валасамі. Другая, маладзейшая, была бландзінка, але вельмі падобная на старэйшую сястру — такі ж тып інтэлігенткі, толькі з прымессю нетутэйшай крыві. У яе таксама былі вялікія вочы і яркая белазубая ўсмешка, як і ў старэйшай сястры. Яна туліла да сваіх высокіх грудзей бліскучы ад перламутру вялікі акардэон. Мужчыны былі зусім розныя. Малодшы, брат жанчын, барабаншчык, быў яшчэ зусім юнак, невысокі і шчуплы, а той, што іграў на віяланчэлі ці на басэтлі, як мы тады думалі, быў высокі і здаравенны мужчына з тыпова яўрэйскім гарбатым носам і капою густых рыжых валасоў, такіх густых і віхрастых, што, здавалася, як толькі і брала іх расчоска. Сваю віяланчэль ён мог бы трымаць так жа лёгка, як яго жонка скрыпку.

Іграючы, мужчыны сядзелі, а жанчыны стаялі. Салíравала чарнявая скрыпачка. Яна стаяла крыху наперадзе ўсіх і іграла. Іграла не толькі скрыпка ў яе руках. Яна ўся іграла сама — ад спрытных ног у элегантных чорных лакірках да кончыкаў валасоў над белым мармуровым ілбом, на якім не было ні адной маршчынкі.

Мазуркі, абэркі, паланэзы, танга, вальсы... Танцы ў розным тэмпе, з розным настроем, у кожнага была свая душа, свой гукавы воблік. І скрыпачка ўвесь час мянялася: іншы выраз твару быў у яе, іншая ўсмешка, іншая пастава; па-другому хадзіла правая рука, у якой свабодна і плаўна, як дасканалая дырыжорская палачка, лётаў тонкі рухавы смычок. Ён далікатна, але ўпэўнена дакранаўся да струн, і яны давалі жыццё тысячам чароўных гукаў, якія напаўнялі ўсё наваколле, западалі ў душу. О, гэтая скрыпка! Што яна рабіла з людзьмі!

А мо вінавата была не так скрыпка, як тая скрыпачка, што трымала яе ў сваіх віртуозных руках? Я ўпэўнен, што ў іншых руках тая скрыпка не мела б такое магічнае сілы. Яна жыла, дыхала, але жыццё гэтае перадавалася ёй ад чароўнай невялічкай жанчыны-артысткі, што, крыху нахіліўшы галаву і стоячы перад астатнімі музыкантамі, злёгку прытупвала левай нагой, нібы адбіваючы рытм. Смычок, як прыліпшы да струнаў, то плаўна перабягаў справа налева, то вяртаўся зноў. Першая струна вяла тоненька, аж ныла, як посвіст ветру праз саломінку, а калі смычок забіраў улева, пачынаў гусці бас — ён гуў, нібы вялізны чмель, і нават густыя пявучыя гукі віяланчэлі не маглі яго заглушыць. А ў гэты самы час пальцы левай рукі скрыпачкі, тонкія, далікатныя жаночыя пальцы, песцілі грыф, перабягалі па струнах, нібы гладзілі іх, пераскоквалі то ўверх, то ўніз, надаючы гуку характэрнае дрыжанне.

Здавалася, скрыпка ўздыхала ледзь прыхаваным чалавечым болем.

Дзіўна, што я перастаў заўважаць астатніх аркестрантаў разам з іх інструментамі. Аркестр жыў неяк па-за скрыпкай: вось так, як сама скрыпачка стаяла спераду, а ўсе астатнія музыканты за ёю, так і скрыпка была на

першым плане, а ўсе іншыя інструменты рабіліся проста фонам, акампаніравалі ёй, — так, як нізкія ноты ў акардэоне ствараюць фон для высокіх галасоў. Чуваць была толькі скрыпка, усе іншыя інструменты толькі падпявалі ёй, толькі памагалі. Яна здавалася мне голасам птушкі на фоне бясконцага ляснога шуму, хоць спачатку можна і падумаць, што яны не звязаны адно з другім. Не, яны звязаны, і яшчэ як моцна, а адно без другога яны адразу блякнуць, трацяць усю першародную прыгажосць. У гэтым я пераканаўся трохі пазней...

Скрыпачцы было цяжка, яна стамлялася, але рэдка хто мог гэта заўважыць за ўсмешкай, якая час ад часу — і вельмі дарэчы — прабягала па яе вуснах, за прыгожым паваротам ці за мяккім і такім натуральным па, якое яна рабіла часам у такт свайму гранню.

Пары, танцуючы, падыходзілі да яе ўпрытык, і мужчыны, не баючыся пакрыўдзіць сваіх партнёрак, пасылалі ёй цёплыя, а то і шматзначныя ўсмешкі; а стары вусаты пан з лысаю бліскучаю галавою, кружачы дзябёлую, вышэйшую за сябе, пані, відаць, не сваю жонку, кожны раз, робячы круг і праходзячы каля музыкантаў, пасылаў скрыпачцы сімвалічны пацалунак.

Ёсць такое няпісанае правіла — хто заказвае, той і плаціць. Ёсць яно і ў музычным свеце. Той, хто хацеў заказаць сабе танец, падыходзіў да музыкантаў і даваў старшаму з іх пэўную суму, і чым яна была большая, тым большы гонар быў для заказчыка. Гэты раз паны асабліва не скупіліся, і амаль што ўсе танцы былі заказныя, і ў белую далікатную руку скрыпачкі перайшла не адна дзясятка злотых. Гэта рабілася проста, без намёку на абразу ці прыніжэнне, як падаюць каму-небудзь шклянку вады. Яна адказвала тым жа: ветліва схіляла галаву, усмешка,

самая шчырая і зычлівая, асвятляла яе твар, толькі ля вачэй з’яўляліся ледзь прыкметныя маршчынкі. Пасля яна абводзіла позіркам сваіх калегаў-музыкантаў, нібы пытаючы ў іх дазволу, і ківала галавою ў знак згоды.

Зноў пачынаўся танец, зноў кружыліся пары, а скрыпка спявала яшчэ галасней, перакрываючы сярэбраныя пералівістыя гукі акардэона, падымаючыся над нізкімі жалобнымі нотамі віяланчэлі. Скрыпка спявала і плакала, смяялася і галасіла наўзрыд, уздыхала, шаптала і ўмольвала, яна злавала, загадвала і праклінала. Было ў яе голасе ўсё, што ёсць у кожнай чалавечай душы. Нездарма скрыпка мае сваю «душу». Няйначай яна іграла славуты «Паланез» Агінскага...

Урэшце скрыпачку запрасіў на танец адзін адмысловы франт з вусікамі і ў камізэльцы, відаць, заўзяты танцор, які перабраў ужо ўсіх паненак і, пэўна, не знайшоў сабе па густу. Яна спачатку хацела адмовіцца — яе справа іграць, але ён настойваў, і яна, паклаўшы скрыпку на калені свайму мужу, пайшла танцаваць.

— Вы замужам? — спытаў кавалер па-польску.

— Так, — адказала яна гучна і з годнасцю, — мой муж іграе на...

Я не разабраў апошняга слова — можа, таму, што яно было незнаёмае для майго вуха.

— Шкада, — з жалем у голасе сказаў ён.

Яны танцавалі хуткую польку, многія пары адразу выйшлі з кола, не вытрымаўшы шпаркага тэмпу, і засталіся толькі франт з вусікамі і скрыпачка.

Цяпер усе зявакі, раскрыўшы раты, пазіралі не на аркестр, а на танцораў, і менавіта на яе, бо дагэтуль на франта ніхто асабліва не заглядваўся. Чамусьці адразу збяднеў і аркестр, нечага ў ім стала бракаваць і, здаецца, ці не самага галоўнага... Так, не хапала ў ім душы, не хапала таго

агню, таго высокага напалу, які прыносіць сапраўднае натхненне. Такі праўда: шумеў лес, толькі не было ў ім салаўінай песні, і не было ансамбля.

А танцавалі яны здорава! Франт, па ўсім відаць, быў танцор адмысловы. Ён кружыў яе, як пушынку. Тэмп быў шалёны, а яны ўдваіх рабілі такія нечаканыя павароты — справа налева ці наадварот, так раптоўна мянялі кірунак ці рвалі з месца, што ўсе ахалі. Здаецца, ногі ў іх не датыкаліся да падлогі.

Усмешка, на гэты раз больш напружаная, не сыходзіла з яе вуснаў, але не было відаць стомы ў яе шырока адкрытых вачах, толькі рука, што ляжала ў партнёра на плячы, выдавала яе трывогу — яна баялася канфузу, — і, напэўна, хацела даказаць, што і ў танцы яна не горшая, чым у музыцы. І яна гэта даказала! Першы здаўся кавалер. Ён раптоўна спыніўся і, як сянкевіцкі шляхціц, упаў перад ёю на адно калена, аж задрыжала падлога, пасля далікатна пацалаваў ёй руку. Твар яго гарэў агнём, а яна стала яшчэ больш бледная, толькі дыхала глыбока і часта. Усе запляскалі ў далоні, зашумелі, пасыпаліся воклічы «брава».

...Ад таго вяселля застаўся яшчэ адзін малюнак.

На прасторным двары выстраіўся цэлы абоз брычак і фаэтонаў, а наперадзе іх, перад ганкам, стаяла запрэжаная шасцёркаю дагледжаных коней нейкая адмысловая карэта з адкідным верхам.

З пакояў выйшлі маладыя — ён вясёлы, узбуджаны, апрануты ў чорнае, яна заплаканая, бледная, уся ў белым, як лебедзь, у доўгім вэлюме.

Яны ўзняліся ў карэту, чынна раскланяліся і селі.

Малады фурман, які з выпадку такой урачыстасці быў апрануты пад паноў, устаў з перадка і, напяўшы скураныя лейцы, падняў угору правую руку.

— Бах! Бах! Бах!

Тры стрэлы прагрымелі адзін за адным. Спуджаныя коні рванулі з месца. За маладымі рушылі госці...

Пасля той музыкі я доўга быў сам не свой, жыў як у сне. Я спыняўся сярод дарогі, вочы мае самі заплюшчваліся, і я выразна чуў музыку, толькі трохі прыглушаную адлегласцю, нібы яна даходзіла да мяне праз якую не надта шчыльную перагародку. Музыка была ў маёй галаве, ва ўсёй маёй істоце, яна перапаўняла мяне да краёў. За тыя дні я патравіў каровамі многа пасеваў, нарабіў не раз шкоды, і карова мая часцяком прыходзіла дадому адна, а я, як сонны, плёўся ззаду. Бацька крычаў, маці гразіла паскамі. Я ачынаўся, рабіў, што мне казалі, а пасля зноў нешта на мяне находзіла, і я зноў чуў музыку.

У вольную часіну я ўцякаў у лес, які быў пры самай хаце, клаўся на траву, глядзеў на разгатыя галіны бяроз, якія ледзь варушыліся на ветры, і тады да мяне прыходзіла музыка. Увесь лес быў ужо для мяне аркестрам, я мог слухаць яго ўволю. Хутка я ўжо нічога не бачыў, не адчуваў, дзе я і што са мною, — была толькі музыка, музыка без канца і краю, і адкуль яна ішла — нельга было разабраць. А над усім гэтым морам музыкі чуваць было, як спявае і плача скрыпка. Бацькі ўжо хацелі везці да доктара, але паступова ўсё прайшло. Ды не, не ўсё! З таго часу я нібы ачнуўся ад доўгага сну, глянуў на свет другімі вачыма і ўбачыў новыя змены. Я ўбачыў, што таго, чым я жыў дагэтуль, ужо для мяне мала, бо на свеце ёсць нешта большае і прыгажэйшае, нешта такое, без чаго жыццё будзе здавацца няпоўным і нецікавым.

Ва мне абудзіўся чалавек...

## Пытанні і заданні

1. Што так моцна паўплывала на галоўнага героя і змяніла яго адносіны да свету? Чаму яму стала мала таго, чым ён жыў дагэтуль?

2. Якія сродкі выкарыстаў аўтар, каб паказаць нам уздзеянне музыкі на галоўнага героя? Якая роля ў гэтым належыць падрабязнаму апісанню ігры незвычайнай скрыпачкі?

3. Знайдзіце і зачытайце апісанне знешнасці таленавітай дзяўчыны. Пра што яшчэ, акрамя знаёмства са знешнім выглядам, даведаліся мы з гэтага апісання? Якой паўстае гераіня твора?

(Звярніце ўвагу на тое, што партрэт гераіні падаецца не ў адным месцы, а як бы раскідана штрыхамі па тэксце. Пачынаецца апісанне так: «Больш за ўсіх кідалася ў вочы скрыпачка, апранутая ў чорную дарагую сукенку, чорненькая, невысокая і зграбная, з вялікімі цёмнымі вачыма на белым твары і чорнымі пышнымі валасамі...» У іншым месцы адзначаецца: «Усмешка, на гэты раз больш напружаная, не сыходзіла з яе вуснаў, але не было відаць стомы ў яе шырока адкрытых вачах, толькі рука, што ляжала ў партнёра на плячы, выдавала яе трывогу — яна баялася канфузу, — і, напэўна, хацела даказаць, што і ў танцы яна не горшая, чым у музыцы», — і г. д.)

4. Што яднае гэты празаічны твор з папярэднімі паэтычнымі творамі па змесце? Чым адрозніваюцца яны па сродках стварэння мастацкіх вобразаў?

5. Ці існуе розніца ў інтанацыі, з якой трэба чытаць вершаваныя і празаічныя творы? Праілюструйце гэта на прыкладах.

6. Якія вершаваныя радкі з папярэдніх вершаваных твораў можна выкарыстаць у якасці эпіграфа да твора Уладзіміра Дамашэвіча «Абуджэнне»?

## Крыжаванка

Праверце свае веды па творы У. Дамашэвіча «Абуджэнне».

Асаблівасць гэтай крыжаванкі ў тым, што, акрамя ўтоенага слова, усе астатнія непасрэдна звязаны з музыкай.




**Па вертыкалі:**

Утоенае слова — гэта з'ява, якая дазволіла галоўнаму герою глянуць на свет іншымі вачыма, перавярнула яго светапогляд.

**Па гарызанталі**:

1. Скрыпка, акардэон, віяланчэль, бубен на вяселлі складалі...
2. Назва самага нізкага гука, які магла вывесці скрыпка.
3. Адна з частак музычнага інструмента, на якім так віртуозна іграла скрыпачка.
4. На гэтым інструменце іграла малодшая сястра таленавітай выканаўцы музычных твораў.

5. Прыметнік да ўтоенага слова, з якім параўноўвае аўтар смычок ў руках скрыпачкі.

6. З гэтым інструментам галоўны герой пераблытаў віяланчэль.

7. Вядомы твор Агінскага, які выконваўся на вяселлі.

8. Тое, што перадае музычны гук на пісьме і што ў тэксце звязана непасрэдна з ігрою на музычных інструментах.

9. Агульная назва скрыпкі, акардэона, віяланчэлі, бубна і г. д.

*Словы для выкарыстання: бас, акардэон, ноты, дырыжорская (палачка), паланэз, інструменты, басэтля, аркестр, струны.*

***Максім Лужанін***

## ДОЖДЖ

Нечаканы, буйны, зразу,
Сек і ўпоперак і ўдоўж.
Па платах, па пералазах
Бег упарты, спорны дождж.

І рака дыхнула вольна
Паднялася, паплыла.
У дубоў па чорным голлі
Кроплі падалі з чала.

Заблішчала сіняй пражай
Маладая збажына.
Вось цяпер ніхто не скажа,
Што спазнілася вясна.

## Пытанні і заданні

1. Якія пачуцці абудзіў у вас гэты верш? Паспрабуйце ўявіць створаную аўтарам маляўнічую карціну прыроды і перадаць яе змест сваімі словамі.

2. Зачытайце радкі, у якіх аўтар расказвае пра нечаканае з'яўленне дажджу. Якім паказаны ён ў вершы?

3. Што змянілася ў прыродзе пасля дажджу?

4. Як вы разумееце вершаваныя радкі:

У дубоў па чорным голлі
Кроплі падалі з чала.

5. Якія мастацкія прыёмы дапамаглі стварыць яркія, запамінальныя вобразы ў вершы?

6. Як уплывае інтанацыя на гучанне твора? З якой інтанацыяй трэба чытаць гэты верш: бадзёрай, радаснай, усхваляванай альбо нетаропкай і сумнай?

7. Якая роля ў вершы адводзіцца рытму?

8. Якую карціну, на ваш погляд, можна было б напісаць паводле гэтага верша?

***Янка Сіпакоў***

## ЧЫМ ПАХНЕ ДОЖДЖ

*(Урывак з нарыса «Даверлівая зямля»)*

Усюды чакалі дажджу.

І ён недзе пад абед нарэшце зашумеў. Ціхі, спорны і, нягледзячы на тое, што з самае раніцы так навальнічна парыла, — без грому. Потым чохнуў як з вядра.

Хораша гэта людзі сказалі: «Як з вядра». Стаіш пад такім дажджом — і табе сапраўды здаецца, што нехта перакуліў на цябе вялізнае, бяздоннае вядро з вадою. Імклі-

вы вадаспад (а можа, гэта ўсяго толькі намоклае адзенне) прыгінае цябе да зямлі, і табе да смешнага верыцца, што такі лівень можа нават паваліць.

Звычайна кожны дождж пахне па-свойму. І гэты пах абавязкова залежыць ад пары года і ад таго, дзе ён, дождж, цябе заспеў. Калі гэта было ў самую квецень і ты стаяў, хаваючыся ад яго, пад яблыняю ці вішняю ў садзе, а буйныя кроплі збівалі пялёсткі, абтрасалі з кволых тычынак на цябе, мокрага, жоўты кветкавы пылок, які прыліпаў да твару, да валасоў, да адзення, — такі дождж, зразумела, пах садам у квецені.

Калі ж увосень ён пераняў цябе на полі, каля задумлівага агню, дзе ў прысаку ўжо даходзіла печаная бульба, — тады дождж абавязкова будзе пахнуць прыемным цеплаватым дымком, а таксама той духмянай параю, якая выбухае з-пад жоўтай і хрумсткай бульбяной скарынкі, калі яе раптам разломіш.

У жніво дождж пахне свежаю саломаю і даспелым коласам, у пару сенавання — прывялай травою, восенню — пераспелымі слівамі, яблыкамі, бульбоўнікам.

Гэты ж, мне здалося, нічым не пах. Проста ён маладзіў, асвяжаў зямлю, якая даўнавата ўжо чакала такой ласкі. І, можа, яшчэ крышачку пах свежасцю — менавіта так пахнуць ранняй вясною абуджаныя пралескі, калі іх раптам унясе нехта неўспадзеў у хату...

Дождж ліў нядоўга. Але ўсё роўна пацяжэлі пасля яго дрэвы, пазвесілі свае мокрыя галіны. Потым, зразумела, узнімецца вецер, паабтрасе светлыя кроплі-пацеркі, што вось зараз качаюцца на лістах, і яны, буйныя і цяжкія, пазашкокаюць, нібы пераспелыя лясоўкі, па кустах, па траве, па зямлі... Тады да дрэў вернецца ранейшая лёгкасць, і яны нават ад лёгкага дотыку ветру зноў будуць нямоцна і супакоена шумець...

## Пытанні і заданні

1. Ад чаго залежыць пах дажджу ў розныя поры года? Знайдзіце і зачытайце радкі твора, якія тлумачаць гэту з'яву.

2. Вызначце ролю параўнанняў у апісанні дажджу. Знайдзіце і зачытайце найбольш маляўнічыя вобразы, створаныя пры дапамозе гэтага вобразна-выяўленчага сродку.

3. На якія падрабязнасці звяртае ўвагу аўтар, калі расказвае пра тое, як ажывае прырода пасля дажджу? Зачытайце гэтыя радкі.

4. Патлумачце сцверджанне, што дэталёвае апісанне прыроды дапамагае аўтару стварыць запамінальны вобраз дажджу.

5. Параўнайце гэты твор з вершам Максіма Лужаніна «Дождж». Што яднае і адрознівае гэтыя творы?

*Паўлюк Трус*

## НАД ВОЗЕРАМ

Возера дрэмле...
Вербы зялёныя
стан пахілілі
на сонную гладзь,
у постаці ціхай,
пад ночы апонаю,
сны старажытнасці сняць.
Ўдовы-бярозы
сваімі каралямі
горда глядзяцца
ў люстэрка вады;
ззяюць крышталынымі,

дзіўнымі хвалямі,
сцелюць на воду
адбіткі-сляды.
Месяц-юнак,
круглаліцы, бялявы,
поглядам ніжа
азёрную глыб,
косы спусціўшы
на ўдумныя з'явы,
ціха плыве
над разлогам сяліб.
Зоры гараць
па-над возерам вольным,
човен цалуе
спакойную сінь,
плаўна калышацца
ўзмахам павольным,
будзіць нямую,
застыўшую плынь.

**Пытанні і заданні**

1. Якія пачуцці выклікаў у вас гэты верш?
2. Які вобраз падаўся вам найбольш маляўнічым і яркім? Чаму?
3. Прачытайце першы вершаваны радок і, зыходзячы з яго зместу, паспрабуйце прывесці аргументы на карысць выбранай вамі інтанацыі, з якой неабходна чытаць верш.
4. Вызначце ролю эпітэтаў у вершы.
5. Назавіце сродак мастацкай выразнасці, ужыты аўтарам у наступных радках: «вербы зялёныя... сны старажытнасці сняць».

6. Знайдзіце і зачытайце вершаваныя радкі, у якіх аўтар пры дапамозе параўнання здолеў дасягнуць надзвычайнай выразнасці і нагляднасці ў стварэнні вобраза возера.

7. Назавіце іншыя вядомыя вам вобразна-выяўленчыя сродкі, якія дапамагаюць перадаць захапленне аўтара гармоніяй і прыгажосцю возера.

8. Вызначце вершаваны памер твора.

9. Калі б вы валодалі здольнасцю перадаць напісанае Паўлюком Трусам у карціне, што б вы намалявалі? Якія фарбы пераважалі б на вашым палатне? Наколькі б адпавядаў ваш твор агульнаму настрою верша?

***Іван Пташнікаў***

## ВОЗЕРА НАРЭЧЧА

*(Урывак з апавядання «На шчасце»)*

Нарэчча — возера. Заўсёды нейкае ціхае і ласкавае, асабліва ад вёскі, ад якой яго аддзяляе цяністая і заўсёды прахалодная маладая дуброва. Сёння яно неяк яшчэ больш сцішылася. Можа, ад спакою тоняў ці ад лагодных усплёскаў хваль у ветраны дзень і вунь тыя дубы, якім карціць з берага ўбачыць свае разгалістыя шаты ў люстранай глыбіні, выдаюць мяккімі і задуменнымі. Яны спачываюць, як і возера, як і рыбак, што развесіў невады пасля рыбнага дня; як і жанчыны, што вяртаюцца з поля, бо чутна іх песня з-за далёкага бярэзніку — жніўная, працяжная, павольная-павольная... Яна плыве. Ад яе вее спакоем і нявыказанай радасцю. Яна нясе звыклыя надзеі чалавека поля, яго ўрачыстасць; нараджае ў думках аповесць аб нечым адвечным, шчырым і шырокім-шырокім, бясконцым у сваім раздоллі і багацці... Гэта аповесць аб дарах зямлі і прыроды.

Гойдаюцца на ўзбярэжжы высокія лапкі мятліцы, бо не заснуў яшчэ нанач вецер. А каля зямлі нават не здрыгнуцца кветкі люцікаў і межыперсніцы. Але і без ветру яны губляюць сваю красу-пялёсткі. Шуршаць травы пад нагамі, шастаюць: жнівень занадта пасуравіў іх, такіх мяккіх і аксамітных у маі.

Дуброва застаецца збоку, за лугамі. Тут кусты — крывы і разгаты альшэўнік, з рэдкім голлем бярэзнік, дзе-нідзе жоўты. Торф, балота з гэтага краю. Даволі часта трапляюцца старыя асушальныя канавы; яны заплылі тванню і зараслі плывунамі.

Да Нарачанкі-вёскі рукой падаць...

Сонца, занадта нейкае жывое і дрыготкае, за Нарачанкай запаліла лес. Пурпур і барва пажару дрыжыць па камлях, абнімае вершаліны, паўзе па зямлі. Чырвонае лона плыве золатам за горку на далёкія лугі, каб астыць там у халодным, як крынічная вада, тумане і вільготных начных росах.

...Спіць, стаілася возера, накрыўшыся коўдрай-туманам. Там, дзе днём гасцявала жніўная песня, ракоча матор, гучна, з нейкім бадзёрым перазвонам. Там жыты: яны пачынаюцца амаль адгэтуль. Мы — ля самага возера. Тут на зямлю апала дзённая цяплынь.

...Тут добра. За плячамі шваргочуць дзікія качкі, нават пралятаюць над намі. Калі глядзець на вёску, відаць густыя агні; за ёй патухае лясны пажар: пурпур палавее, затым шарэе. Яго паглынае блакіт і цемната.

## Пытанні і заданні

1. Якім вы ўяўляеце возера, якое так дэталёва і падрабязна апісаў Іван Пташнікаў? Намалюйце гэту запамінальную карціну словамі.

2. Чым адрозніваецца гэта апісанне возера ад папярэдняга, пададзенага ў вершы П. Труса «Над возерам»? Пры адказе выкарыстайце цытаты з тэкстаў.

3. Якая роля ў раскрыцці непаўторнай прыгажосці нарачанскага краю належыць вобразна-выяўленчым сродкам? Прывядзіце прыклады.

4. Прывядзіце аргументы, якія дапамогуць пераканацца ў тым, што ў празаічным творы сродкі мастацкай выразнасці застаюцца як бы незаўважанымі. Галоўнае ў празаічным творы — дакладнае апісанне з'явы ці прадмета, таму аўтар акцэнтуе ўвагу на шматлікіх жыццёвых падзеях падрабязнасцях.

5. Параўнайце мову верша Паўлюка Труса «Над возерам» і ўрыўка з апавядання Івана Пташнікава «Возера Нарэчча». У якім творы мова свабодна арганізаваная, гучыць звыкла і натуральна, а дзе яна размераная, гучыць складна, напеўна?

***Пятрусь Броўка***

## АХ, ВОСЕНЬ, ВОСЕНЬ...

Ах, восень, восень, ты пад сонцам
Неапісальнай пекнаты,
Ты раскідаеш,
Як чырвонцы,
З кляноў барвовыя лісты.
Табе між сосен нібы цесна,
Ірвешся ўдалеч,
На прасцяг,
Вятрамі завяла ты песню
Па ўсіх дарогах і шляхах.

На праўды ж панасаджала
Шпакоў у некалькі радоў,
Як быццам імі напісала
Жывыя ноты між слупоў.

### Пытанні і заданні

1. Якія зрокавыя асацыяцыі выклікаў гэты верш?
2. Якія карціны восеньскай прыроды падаліся вам найбольш прывабнымі?
3. Назавіце ўзгаданыя ў вершы прыкметы восені. Які настрой яны выклікаюць?
4. Пералічыце асноўныя сродкі і прыёмы, якія дапамагаюць аўтару зрабіць паэтычны малюнак восені па-мастацку дакладным, наглядным, жывапісным?
5. Як, на ваш погляд, адносіцца аўтар да таго, пра што расказвае? Прывядзіце прыклады.
6. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання: падбярыце адпаведную інтанацыю, тэмп чытання, вызначцеся з лагічнымі націскамі і паўзамі. Не забудзьце пра такія прыёмы выразнасці, як міміка і жэсты.
7. Паспрабуйце выказаць свае пачуцці да восені вершаванымі радкамі.

***Іван Шамякін***

## У ЛЕСЕ І Ў ПОЛІ ВОСЕННЮ

*(Урывак з апавядання «Непрыгожая»)*

Ёсць непаўторная паэзія ў асеннім полі, хоць на першы позірк здаецца яно пустое і панурае. Калі вясна вядзе на луг і нараджае жаданне гарэзліва весяліцца, бегаць і

скакаць, а ўлетку цягне паляжаць на ўзлеску, бяздумна ўглядаючыся ў бяздонны блакіт неба, то ўвосень хочацца ісці і ісці па палявых дарогах у бяскрайнюю далеч і... думаць. Не ведаю, як каму, а мне асабліва хораша думаецца ў асеннім полі. Нідзе думкі не плывуць так спакойна, шырока, павольна, нідзе ні ў якую іншую пару года не з'яўляюцца такія эпічныя сюжэты, як на той бязлюднай палявой дарозе, на якой цяжка нават спыніць на чым-небудзь позірк. Хіба толькі падзівішся, адкуль гэты гарэза вецер мог нанесці столькі вішнёвага, грушавага і бярозавага лісця, што ім забіты каляіны. Здаецца ж, бяроз і блізка няма, ды і вішнякі ледзь віднеюцца з аднаго і другога боку дарогі — у вёсках, што туляцца там, дзе шырокая палявая раўніна горбіцца невялікімі ўзгоркамі, перасякаецца доламі і рачулкамі.

У асеннім лесе таксама добра думаецца. Але думкі тут маюць іншую форму: яны яркія, кароткія і хутка змяняюць адна адну. Можа, гэта таму, што ўсё навокал гарыць фарбамі згасаючага сонца — цёплымі фарбамі жыцця і змагання, якія заўсёды ўзбуджаюць. І шмат што перашкаджае спакойнай і павольнай плыні думак. Шуміць лес. Шамаціць пад нагамі лісце. Дзіўным веерам — у тры бакі ад сябе — насыпала на яшчэ зеленаватую траву залатовак прыгажуня бяроза. Як яны гараць, гэтыя лісцікі — ну, сапраўды, як тыя залатоўкі! І зусім не падобныя на тых сваіх сясцёр, якія апынуліся ў полі, у каляінах: тыя — скамечаныя, скручаныя, пачарнелыя, а на гэтыя глядзіш — і ажно вачам горача.

Дубы насцілаюць пад сабой цёмна-карычневую мяккую пасцелю, лісце іх не ляціць далёка, яно цяжкае і нават у вецер падае амаль вертыкальна, толькі больш, чым у цішу, кружыць у паветры і даўжэй варушыцца на зямлі,

быццам доўга прымошчваецца, каб зручней легчы. У гэтую пасцелю мякка шлёпаюцца жалуды...

Зоркай іншага сусвету бліснуў кляновы ліст, што раптам з'явіўся перад вачамі на дарозе. Я заварожана спыніўся перад ім. Адкуль ён зляцеў? Ах, вунь ён дзе, клянок! Невялічкі, зусім непрыкметны побач з волатамі-дубамі; улетку, напэўна, і не бачыў бы яго. А цяпер колькі красы ён рассыпаў навокал! Мноства яго лісцяў — найпрыгажэйшы дыван, вытканы рукой дзівоснага мастака. І я не мог прайсці па ім у запыленых ботах. Я асцярожна адступіў і абышоў бокам. Усю дарогу праз лес мяне суправаджала нябачная птушка тоненькім жалобным плачам. Што яна страціла? Па чым плакала?

## Пытанні і заданні

1. На які роздум наводзіць вас хараство і непаўторнасць восені?

2. Адшукайце ў тэксце апісанне кляновага ліста. На чым акцэнтуе ўвагу аўтар, распавядаючы пра гэта дзіва прыроды?

3. Зачытайце найбольш яркія мастацкія дэталі, якія дапамагаюць перадаць прыгажосць бярозавых лістоў.

4. Параўнайце паказ аднолькавай з'явы прыроды ў паэтычным творы Петруся Броўкі «Ах, восень, восень...» і ў празаічным творы Івана Шамякіна «У лесе і ў полі восенню» па знешніх адзнаках, па мове, па спосабах, прыёмах і сродках стварэння вобразаў у розных відах мастацкай творчасці.

5. У якім з гэтых двух твораў голас пры чытанні гучыць раўнамерна, то ўзвышаецца, то паніжаецца, нібы адбівае такт, нібы перадае нейкі музычны найгрыш?

6. Напішыце замалёўку пра восень, акцэнтуйце ўвагу на тых прыкметах, якія перададзены ў вершы П. Броўкі «Ах, восень, восень...»

***Пятро Глебка***

## ХМАРКІ

Ад лютай летняй спёкі
Гарыць сухі пясок,
І пачарнеў далёкі
Нахмураны лясок.

Заціхлі скрозь жняяркі —
Прыпынак на абед.
А перыстыя хмаркі
Плывуць няспынна ў свет.

Ад іхніх крыл у ясны,
Гарачы летні дзень
На полі невыразны
Кладзецца лёгкі цень.

І павявае з долаў
Цудоўным халадком,
І жыта хіліць голаў
Пад свежым вецярком.

Падзяку шэпчуць дрэвы
За гэты добры дар,
І жывяць іх павевы
Людскі спацелы твар.

Вітанне ж вам, аблокі!
Вы, быццам чарадзей,
Бароніце ад спёкі
І травы і людзей.

## Пытанні і заданні

1. Якія пачуцці выклікала ў вас паэтычная карціна летняга спякотнага дня перад навальніцай?

2. Як на вашу думку, ці складана было б перадаць тую асаблівую прыгажосць, якую раскрыў нам паэт у вершы «Хмаркі», простым пераказам? Паспрабуйце зрабіць гэта самастойна, не карыстаючыся дапаможнікам.

3. Звярніце ўвагу на настрой верша і назавіце галоўныя словы, якія яго выражаюць. Настрой аднолькавы ці мяняецца?

4. Якімі мастацкімі сродкамі ствараецца вобраз хмарак-аблокаў?

5. Узгадайце азначэнне рыфмы і вызначце яе ў наступных вершаваных радках:

Ад лютай летняй спёкі
Гарыць сухі пясок,
І пачарнеў далёкі
Нахмураны лясок.

6. Чым дасягаецца рытмічнае гучанне ў вершы?

7. Вызначце ў творы вершаваны памер.

*Міхась Лынькоў*

## ПОЗНЯЯ ВОСЕНЬ

*(Урывак з апавядання «Недапетыя песні»)*

Хутка імчалі над лесам ускудлачаныя хмаркі.

Дзесьці высока-высока, за самымі хмарамі, курлыкалі журавы. І кожнаму хацелася ўбачыць іх, і ўсе ўглядваліся ў глыбокую цемрадзь неба, сілячыся разгадаць, распазнаць у цьмяным мігценні зораў, у разрывах хмар сілуэты прываблівых і загадкавых птушак. Але яны былі ўжо далёка. Ледзь-ледзь далятала жураўліная песня і, праглынутая ноччу, вятрамі, непрыкметна злівалася з шолахамі лісту, з шархаценнем травы, з няўмоўчным гоманам бору. І толькі на сэрцы доўга аддавалася яна невыразным болем, горыччу нявыказанай патраты...

Узышоў над лесам месяц. Выразна выступілі зубчастыя верхавіны елак, у срэбраным ззянні ўсталі задумлівыя хвоі, глыбокія цені ахуталі лясную паляну. Людзі прыніклі да зямлі, не варушыліся, прагна прыслухоўваліся да гукаў восеньскай ночы: дзесьці хрупаснуў сучок, мякка ўпала паблізу хваёвая шышка, за лесам гучна заржала жарабя, — і зноў усё ціха і глуха. Толькі верхавіны соснаў гудзелі ледзь чутна, ды шалясцелі няўмоўчныя трапяткія асіны, перашэптваючыся аб нечым сваім з пакрыўджанымі непагаддзю бярозамі. Пахла перакіслымі брусніцамі, прэлай саломай, прыхвачаным першым замаразкам грыбам. Ды яшчэ даляталі ледзь улоўныя пахі каменнавугальнага гару і сатлелай шпалы, якая доўга праляжала ў зямлі.

## Пытанні і заданні

1. Чым прываблівае вас карціна позняй восені? Што вы адчулі, пазнаёміўшыся з тэкстам?

2. Наколькі супадае аўтарскае апісанне з вашым успрыманнем гэтай пары года?

3. Перакажыце прыродаапісальны ўрывак, выкарыстаўшы з тэкста найбольш яркія вобразы: «ускудлачаныя хмаркі», «пакрыўджаныя непагаддзю бярозы», «перакіслыя брусніцы», «прэлая салома» і інш.

4. Чаму жураўліная песня доўга аддавалася ў сэрцы «невыразным болем, горыччу нявыказанай патраты...»? Чаму, на ваш погляд, восень традыцыйна звязваюць з сумам і тугою, «болем, горыччу»?

5 Якімі сродкамі дасягае аўтар адухаўлення прыроды? (Пры адказе звярніце ўвагу на выразныя мастацкія дэталі і падрабязнае апісанне прыкмет восені).

6. На якой падставе можна параўнаць гэты празаічны твор з вершам Пятруся Броўкі «Хмаркі»? Ці толькі апісанне адной і той жа прыроднай з'явы яднае іх?

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ ПАДАГУЛЬНЕННЯ ПА РАЗДЗЕЛЕ

1. Вызначце, дзе гутарка ідзе пра паэзію, а дзе — пра прозу:

• У творы абвостраныя пачуцці падаюцца ў лаканічнай форме, сам твор невялікі па памерах, мова строга падпарадкавана рытму, вобразна-выяўленчыя сродкі дапамагаюць зрабіць мову больш эмацыянальнай.

• У творах мова свабодна арганізаваная, у цэнтры ўвагі такіх твораў — стварэнне нейкай карціны жыцця, да-

кладнае, хоць і таксама вобразнае, апісанне жыццёвага факта ці эпізоду, паводзін чалавека.

2. Прывядзіце прыклады празаічных і вершаваных твораў на адну тэму, з якімі вы пазнаёміліся на ўроках беларускай літаратуры. Чым яны адрозніваюцца ў дачыненні да вобразна-выяўленчых сродкаў, па ўздзеянні на чытача?

3. Якія творы, празаічныя ці паэтычныя, вы больш любіце чытаць? Чаму?

4. Параўнайце творы У. Дамашэвіча «Абуджэнне» і К. Жука «Скрыпка». Які з гэтых твораў падпадае пад азначэнне «невялікі празаічны твор, у якім расказваецца пра асобную падзею, здарэнне ў жыцці чалавека, героя твора»? Назавіце па азначэнні жанр твора.

5. Успомніце назву твора і яго аўтара па прапанаваным урыўку:

«...Увесь лес быў ужо для мяне аркестрам, я мог слухаць яго ўволю. Хутка я ўжо нічога не бачыў, не адчуваў, дзе я і што са мною — была толькі музыка, музыка без канца і краю, і адкуль яна ішла — нельга было разабраць. А над усім гэтым морам музыкі чуваць было, як спявае і плача скрыпка».

6. Калі параўноўваць празаічныя і паэтычныя творы з музычнымі творамі і творамі жывапісу, якія з іх бліжэй да музыкі, а якія — да жывапісу?

7. Падрыхтуйце вуснае выказванне на тэму: «У вершаваным слове ўсё!» — альбо: «Вось яны лёсы людскія!»

# III. НАМ РОДНАЯ ПЕСНЯ Ў СЭРЦА ЗАПАЛА

Пачатак паэзіі — у вуснай народнай творчасці. Самыя выдатныя ўзоры паэзіі — народныя песні. Гэта творы, якія складаліся на працягу доўгага часу. Слова да слова, мелодыя да мелодыі, яны перадаваліся з вуснаў у вусны, удасканальваліся, станавіліся спадарожнікамі чалавека праз усё жыццё.

Ад нараджэння да скону яны суправаджалі чалавека і ў радасці, і ў горы, у час працы і ў святы. У песнях раскрывалася душа народа, яго высокія парыванні да шчасця і сумныя настроі ў трагічных абставінах жыцця. На першы погляд, народная песня — твор вельмі просты, незамыславаты па змесце. Але не трэба спяшацца рабіць такі вывад. Толькі па тэксту, які друкуецца ў кнігах, аб вартасці песні меркаваць немагчыма. Народная песня не бытуе без мелодыі, асобна без напеву. Яе трэба не проста чытаць, яе трэба слухаць у выкананні менавіта як твор вакальнага (спеўнага) мастацтва. І ў гэтай еднасці слова з мелодыяй (напевам) выяўляецца незвычайная змястоўнасць народных песень, іх эмацыянальная насычанасць, задушэўнасць, сардэчнасць.

Народныя песні маюць усе адзнакі пазнейшай пісьмовай, кніжнай паэзіі: у іх выразна адчуваецца рытмічнасць, напеўнасць, меладычнасць мовы. Прысутнічае ў народных песнях і **рыфма** (сугучнасць слоў у канцы радкоў). Але асабліва часта тут сустракаюцца **паўторы**. Паўтараюцца як асобныя словы («рабіна, рабіначка»), так і цэлыя выразы («Ох, і сеяла Ульяніца лянок, ох, і сеяла Іванаўна лянок»). Характэрны для народнай песні **памяншальна-ласкальныя словы** (вяночак, таночак, дзянёчкі, дзевань-

ка і г. д.), **сталыя эпітэты** («сырая зямелька», «ясныя дзянёчкі»), **прыём адухаўлення**, ажыўлення прыроды («едзе вясна», «вязе, вязе вясна»).

Гэтыя і іншыя асаблівасці надаюць народным песням адметнае гучанне, меладычнасць, мяккасць, выяўляюць тонкія адценні перажыванняў і пачуццяў чалавека ў розных жыццёвых абставінах.

## Пытанні і заданні

1. Успомніце і назавіце віды народных песень.
2. Як ствараліся народныя песні? Хто быў іх аўтарам?
3. Чым адрозніваюцца народныя песні ад звычайных вершаў? Што ў іх агульнага?
4. Якія паэтычныя прыёмы асабліва часта сустракаюцца ў народных песнях?

# ПРЫЙДЗІ, ПРЫЙДЗІ, ВЯСНА...

Прыйдзі, прыйдзі, вясна,
Прыйдзі, прыйдзі, красна,
К нам у таночак[1].
Прынясі нам збожжа,
Прынясі нам красак,
Каб нам звіць вяночак.
Едзе вясна, едзе
На залатым кані
У зялёным саяні[2],

[1] Танок — карагод (танцы з песнямі на зборах вясковай моладзі).
[2] Саян — від жаночага адзення (спадніца, сарафан).

На сасе седзячы,
Сыру зямлю аручы,
Правай рукой сеючы,
А смыком[3] скародзячы[4].
Вязе, вязе вясна,
Вязе, вязе красна
Ясныя дзянёчкі,
Чыстыя дажджочкі,
Зялёныя травы,
Красныя цвяточкі
Нам на вяночкі.

## Пытанні

1. Як можна растлумачыць змест песні, выказаныя ў ёй пажаданні, пачуцці?
2. Якія характэрныя для народных песень паэтычныя прыёмы тут ужываюцца? Якую ролю яны выконваюць?

## ОХ, І СЕЯЛА УЛЬЯНІЦА ЛЯНОК

Ох, і сеяла Ульяніца лянок,
Ох, і сеяла Іванаўна лянок.
Ох, сэрца лянок
Мая радасць ты, лянок,
Ўсё бялюсенькі кужалёк!

Ох, і палола Ульяніца лянок,
Ох, і палола Іванаўна лянок.

---

[3] Смык — тут: барана.
[4] Скародзіць — баранаваць узараную зямлю.

Ох, ірвала Ульяніца лянок,
Ох, ірвала Іванаўна лянок.

А сарваўшы, у снапочкі ставіла,
А сарваўшы, у снапочкі ставіла.

Ох, і слала Ульяніца лянок,
Ох, і слала Іванаўна лянок.

Ох, і прала Ульяніца лянок,
Ох, і прала Іванаўна лянок.

Ох, і ткала Ульяніца лянок,
Ох, і ткала Іванаўна лянок.

А саткаўшы, ды сарочак нашыла,
А саткаўшы, ды бялёвых нашыла.

### Пытанні

1. Як выяўляюцца ў песні адносіны да працы? Якім агульным настроем прасякнута песня? Пры дапамозе якіх паэтычных сродкаў выяўляецца гэты настрой?

2. Як вы лічыце, чаму героем народных песень часцей за ўсё выступае жанчына?

## АХ ТЫ, СОНЦА-СОНЕЙКА...

— Ах ты, сонца-сонейка,
Я на цябе віну маю,
Віну маю вялікую:

Што ты раненька усходзіш,
Што ты позненька заходзіш.
— Ах ты, дзеўка-дзеванька,
Не вінуй жа ты мяне,
Вінуй жа свайго пана:
Хоць я раненька ўзыйду,
Цябе на ніўцы знайду,
Хоць і позненька зайду,
Цябе на ніўцы пакіну.

## Пытанні

1. У якой жыццёвай сітуацыі ўзнікла гэта песня?
2. Як паказаны ў ёй умовы працы вясковай жанчыны?
3. Як паказана прырода: яна раўнадушная да жанчыны-гаротніцы ці спачувае ёй?
4. Вы не раз сустракаліся з прыёмам адухаўлення прыроды ў паэтычных творах. Як вы думаеце, адкуль прыйшоў гэты прыём у літаратуру?

## РАБІНА, РАБІНАЧКА...

Рабіна, рабіначка,
Рабіна мая,
Чаму ж ты, рабіначка,
Рана адцвіла?
Дзяўчына, дзяўчыначка,
Дзяўчына мая,
Чаму ж ты, дзяўчыначка,
Засмуцілася?
Ой, не ў тую пораньку

На свет я прыйшла,
Маці, не падумаўшы,
Замуж аддала.
Ды ў тую вёсачку —
Не ў вядомую,
У чужу сямеечку —
Не ў вясёлую.
Дальняя староначка
Без ветру сушыць,
Не родны татулечка
Без віны журыць.
Вось жыву гадочак я,
Жыву і другі,
А на трэцім годзіку
Занудзілася.
К мамачцы ў госцікі
Захацелася,
Па родным татулечку
Затужылася.

## Пытанні і заданні

1. Пра што расказваецца ў гэтай песні?

2. Якімі жыццёвымі абставінамі выкліканы яе журботны настрой?

3. Назавіце паэтычныя прыёмы, пры дапамозе якіх раскрываюцца перажыванні і пачуцці гераіні. Якую ролю ў песні выконвае вобраз рабіны?

4. Падрыхтуйце вуснае сачыненне-разважанне «Што за дзіва гэтыя песні!».

# IV. ЗАГАДКАВАЯ КРАІНА ПАЭЗІЯ

Вы ведаеце, што вершаваныя творы называюць яшчэ паэтычнымі і адносяць да паэзіі. Слова **паэзія**, такім чынам, азначае не толькі творы вершаванай формы, хоць гэта азначэнне несумненна важнае. Калі мы гаворым пра паэзію, то маем на ўвазе асаблівы змест твораў, іх здольнасць перадаваць моцныя і яскравыя ўражанні, глыбокія перажыванні, узнёслыя думкі, асаблівы настрой.

Пра паэзію напісана шмат вершаў. Давайце яшчэ раз звернемся да іх, прыслухаемся да тых думак, якія выказваюць паэты.

Пачнём мы размову пра таямніцу паэзіі з верша пра незвычайнага чалавека, які здольны здзіўляцца, марыць, верыць у добрае і прыгожае, нават у вельмі складаных абставінах, нягледзячы ні на якія страты і няшчасці. Як адзначыў даследчык літаратуры М. А. Лазарук, «...размову пра паэзію трэба пачынаць з гэтага, бо менавіта з умення здзіўляцца, з такой схільнасці і здольнасці чалавека пачынаецца паэзія, нараджаецца паэзія. І ў душы паэта, і ў душы кожнага, хто чытае і любіць паэзію».

***Анатоль Вярцінскі***

## ДЗІВАК ЧАЛАВЕК

Дзівак чалавек...
Глядзіць на расінку макавую,
а цэлае сонца
бачыць перад сабой.[1]
Дзівак чалавек...

---

[1] Згадайце выраз «як у кроплі вады», г. зн. у маленькім бачыць вялікае.

Бярэ звычайную ракавіну
і чуе ў ёй акіянскі прыбой.[1]
Дзівак чалавек...
Бачыць сцяжынку гладкую,
а марыць аб трудных,
цярністых шляхах
з іх круцізною,
з іх небяспечнай загадкаю,
і будзе ісці,
пакуль мае сілу ў нагах.
Дзівак чалавек...
Са стратаю непапраўнаю
не мірыцца ён ні за што ў душы.
З няпраўдай не мірыцца,
і з крыўднаю праўдаю
не хоча мірыцца —
хоць кол ты на ім чашы.
Дзівак чалавек...
Яму шмат чаго адмовілі.
А ён не здаецца,
а ён не спіць па начах.
Ён верыць усё
ў свой перпетуум-мобіле[2],
у панацэю[3],

---

[1] Калі прыкласці да вуха маленькую ракавінку, у ёй сапраўды нібы чуецца шум мора ці акіяна.

[2] Перпетуум-мобіле — вечны рухавік, якія імкнуліся стварыць многія вынаходцы (звычайна, вялікія летуценнікі), але пакуль што беспаспяхова.

[3] Панацэя — сродак ад усіх бед і няшчасцяў, але такога сродку людзі яшчэ не прыдумалі.

у цудадзейны рычаг[1].
Дзівак чалавек...
Яму — Хірасіму[2], Асвенцім[3],
яму, замест імя, —
асвенцімскае таўро.
А ён паўтарае,
што ёсць дабро на свеце,
што будзе дабро
і што пераможа дабро.
Дзівак чалавек...
Не можа не спадзявацца,
не можа не верыць,
не можа ніяк!
Дзівак чалавек...
І гэта яго дзівацтва —
ратунак яго,
яго чалавечы знак.

## Пытанні

1. У жыцці дзіваком называюць чалавека, які дапускае незразумелыя ўчынкі, нават недарэчна паводзіць сябе. Ці такога чалавека мае на ўвазе паэт? Як вы разумееце назву верша?

---

[1] Цудадзейны рычаг — кажуць, што выдатны вучоны старажытнасці Архімед, які зрабіў вялікія адкрыцці, у тым ліку і ў прымяненні рычага, гаварыў: «Дайце мне пункт апоры, і я перавярну свет».

[2] Хірасіма — японскі горад, на які амерыканцамі была скінута атамная бомба ў час Другой сусветнай вайны.

[3] Асвенцім — канцэнтрацыйны лагер, дзе фашысты знішчалі людзей у газавых камерах; «асвенцімскае таўро» — кляймо з лічбай, якім фашысты памячалі людзей, нібы жывёлу.

2. Як можна было б выказаць галоўную думку, якая праходзіць праз увесь верш?

3. Ці можа жыць чалавецтва без такіх адносін да жыцця, пра якія гаворыцца ў вершы? Як вы разумееце радкі: «Дзівак чалавек... // І гэта яго дзівацтва — ратунак яго, яго чалавечы знак»?

4. Што дапамагае чалавеку быць і заставацца такім, якім яго бачыць і паказвае паэт?

## ПАДАГУЛЬНЕННЕ ВЕДАЎ ПРА ВЕРШАСКЛАДАННЕ

***Устаўце патрэбнае слова***

Важнейшымі адзнакамі верша з'яўляюцца:

... — раўнамернае паўтарэнне, чаргаванне націскных і ненаціскных складоў;

... — сугучнасць канчаткаў вершаваных радкоў.

... — група складоў з адным націскным, якія раўнамерна паўтараюцца ў вершаваным радку.

... бываюць двухскладовыя (... і ...) і трохскладовыя (..., ..., ...).

***Вершаваныя памеры:***

Калі ж хто часам з ім не зладзіць,  
То дзядзька толькі вус пагладзіць...  
(*Якуб Колас* «Дзядзька-кухар»)

— —′/ — —′/ — —′/ — —′/ —  
— —′/— —′/— —′/— —′/—

... — двухскладовая стапа з націскам на другім складзе.

Ці не вецер гэта звонкі
Ў тонкіх зёлках шапаціць?
(*Максім Багдановіч* «Маёвая песня»)

—́ — / —́ — / —́ — / —́ —
—́ — / —́ — / —́ — / —́

... — двухскладовая стапа з націскам на першым складзе.

Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая!
(*Якуб Колас* «Родныя вобразы»)

—́ — — / —́ — — / —́ — — / —́ —
—́ — — / —́ — — / —́

... — трохскладовая стапа з націскам на першым складзе.

Я гэта люблю падарожжа,
З якім і зраўняцца не можа
Вандроўка ў любыя Таўрыды...
У казачныя краявіды.
(*Максім Танк* «Я гэта люблю...»)

— —́ — / — —́ — / — —́ —
— —́ — / — —́ — / — —́ —
— —́ — / — —́ — / — —́ —
— —́ — / — —́ — / — —́ —

... — трохскладовая стапа з націскам на другім складзе.

Пацяклі, паплылі за гадамі гады...
На гусляравым наспе жвіровым
Палыны ўзышлі, вырас дуб малады,
Зашумеў непанятлівым словам.

(*Янка Купала* «Курган»)

__ __ __´ / __ __ __´ / __ __ __´ / __ __ __´
__ __ __´ / __ __ __´ / __ __ __´ / __
__ __ __´ / __ __´ __ / __´ __ __´ / __ __ __´
__ __ __´ / __ __ __´ / __ __ __´ / __

... — трохскладовая стапа з націскам на трэцім складзе.

***Цікава ведаць***

Рускі пісьменнік Мікалай Гумілёў, які вырашыў дапамагчы сваім вучням лягчэй разабрацца ў складаных трохстопных памерах, прыдумаў наступнае: назвы вершаваных памераў ён замяніў прозвішчамі вядомых пісьменнікаў.

Напрыклад, ён не называў памер дактылем, а называў яго Ахматава (прозвішча вядомай паэтэсы), паколькі ў яе прозвішчы націск падае на першы з трох апошніх складоў (__ __´ __ __ ). Замест анапеста гучаў Гумілёў — націск ў прозвішчы падае на апошні склад ( __ __ __´ ). А паэт Іванаў стаў амфібрахіям: націск падае на другі склад ( __ __´ __ ).

Што тычыцца двухскладовых памераў, то назва «харэй» паходзіць ад грэчаскага слова, якое перакладалася як «танцавальны». А ямб атрымаў сваю назву ад імя міфічнай царскай служанкі Ямбі, якая спявала багіні Дземетры вясёлыя песні. Таму гэты памер як «спеўны» супрацьпастаўляецца «танцавальнаму» харэю.

*Максім Танк*

## ПАЭЗІЯ

Я ведаў, што ты — бліскавіца,
Што хмары рассекла;
Я ведаў, што ты — вызваленне
З няволі і пекла.
Вясновая кветка,
Што камень прабіла магільны,
Разведчыка след
На дарозе крамністай і пыльнай,
Я ведаў, што ты — пацалунак,
Ты — дружба і радасць,
Ты — чорствага хлеба скарынка
І сок вінаграда.
А ты аказалася большым:
Ты — кроў, што пульсуе па жылах,
Ты — сонца, якое
Прасторы святлом азарыла,
І без чаго, як без маці
Або без радзімы,
Ні нараджацца, ні жыць
На зямлі немагчыма!

### Пытанні і заданні

1. Як бы вы сваімі словамі або словамі паэта перадалі асноўную думку — ідэю верша?

2. Растлумачце сэнс паэтычных вобразаў-параўнанняў: паэзія — «бліскавіца, што хмары рассекла», «вясновая кветка», «разведчыка след», «сок вінаграда», «сонца, якое прасторы святлом азарыла», і г. д.

3. Чаму паэт лічыць нават, што без паэзіі, «...як без маці // Або без радзімы, // Ні нараджацца, ні жыць // На зямлі немагчыма!»?

4. Падумайце, з якой інтанацыяй трэба чытаць гэты верш уголас (бадзёрай, узнёслай, удумліва-разважнай ці якой іншай).

***Алег Лойка***

## РАДЗІМЕ

Усім карэннем — у табе,
Адной галінкай — над табою...
Чым заслужыў, калі паспеў,
Што ты мяне з крыніцаў поіш?..

А чым табе даўгі сплаціць,
Якіх, чым больш жыву, не меней?..
Як зорны, хлеб мой зіхаціць:
Скарынка —
у духмяным кмене[1].

А я — галіначка адна
Між вечных зор і тых, якія
З крыніц мігочуць давідна,
Упаўшы ў нетры іх жывыя.

І сэрца, як лісток, трымціць,
Што супакоіць немагчыма:

[1]Кмен — расліна з духмяным пахучым насеннем, якое прымяняюць як прыправу.

«А чым даўгі табе сплаціць,
Мая Радзіма?!»

Хай не глынуць мне даўкі ком,
Хай шчодрасць мне твая дакорам, —
Не сорамна быць даўжніком,
Забыцца,
            што даўжнік ты,
                        сорам.

Не сорамна любіць да слёз,
Лічыць твой боль і ўзлёт сваімі
І дзякаваць вялікі лёс,
Што даў спазнаць цябе, Радзіма.

Аглухну — не ад зім і лет,
Аслепну — не ад скрух і плачу, —
Ад прагі чуць твой кожны шэпт
І ўсю тваю бясконцасць бачыць,
Мая Радзіма!..

## Пытанні і заданні

1. Якія пачуцці і думкі ўзніклі ў вас пры чытанні гэтага верша? Якія вобразныя сродкі выкарыстаў паэт, каб перадаць свае адносіны да роднай зямлі?

2. Назавіце выкарыстаны ў вершы мастацкі прыём, калі аўтар у вельмі эмацыянальнай форме звяртаецца да Радзімы.

3. Вызначце асноўную думку, ідэю гэтага верша. У якіх радках яго ідэя, на ваш погляд, выказана асабліва выразна?

4. Якім памерам напісаны верш?

5. Колькі радкоў у строфах верша і як рыфмуюцца радкі?

6. Супастаўце гэты верш з наступным. Падумайце, чым яны збліжаюцца і чым адрозніваюцца.

7. Падрыхтуйце выразнае чытанне верша.

*Сцяпан Гаўрусёў*

## ХЛЕБ-СОЛЬ

На ручніках, расшытых пеўнямі,
Хлеб-соль падносім для гасцей,
Вядзём за стол, каўшамі markdownннымі
Частуем брагай пагусцей.

І не хаваем — дзе падзенешся? —
Сваіх пачэсных мазалёў.
А трэба — крошкаю падзелішся:
Лепш сто сяброў, чым сто рублёў.

Наш дом з адкрытымі варотамі
На скрыжаванні ўсіх дарог.
Але з нявыцертымі ботамі
Не запрашаем на парог.

Хто з каменем ішоў за пазухай,
Збіраўся сесці за наш стол
(Мо пабалюю ўволю раз няхай?),
І сёння корміць цвёрды дол.

Рукамі, ад спякоты чорнымі,
Што выціраць не любяць слёз,

Мы перамолвалі, як жорнамі,
Не раз, не два свой горкі лёс.

Але з пакорнымі далонямі
Мы не хадзілі на паклон,
Калі усходамі зялёнымі
Ад хцівых рук наш гінуў плён.

Спіной не гнуліся жабрацкаю...
І хоць шануем свой мазоль,
Мы дзелім хлеб рукою брацкаю,
І любяць нас,
І ў гэтым — соль!

**Пытанні і заданні**

1. Якія думкі і пачуцці выклікаў у вас верш С. Гаўрусёва?

2. У чым выявілася арыгінальнасць раскрыцця тэмы? Якая роля ў вершы адводзіцца народным прыказкам, прымаўкам, дасціпным выслоўям і выказванням?

3. Растлумачце сэнс выразаў: «Хлеб-соль падносім для гасцей», «...каўшамі пеннымі частуем брагай пагусцей», «...крошкаю падзелішся», «Лепш сто сяброў, чым сто рублёў», «...корміць цвёрды дол» і г. д. Адшукайце іншыя падобныя выразы ў вершы.

4. Якія рысы беларусаў паэтызуе, ухваляе паэт? Супастаўце іх з характарыстыкай беларусаў у вершы Р. Барадуліна «Мы — беларусы...».

5. Якая галоўная рыса беларусаў падкрэслена назвай твора? Як абыграна гэта назва ў самым канцы верша?

6. Вызначце, якім памерам напісаны гэты верш, і падрыхтуйце яго выразнае чытанне.

***Рыгор Барадулін***

## МАТЫЛЁК

Б’ецца, ўецца шпаркі, лёгкі
Сінякрылы матылёк.

*Максім Багдановіч*

Лілею
млявы
плёс
люляе,
З-пад злежаных аблок
здалёк
Ляціць віхлясты і бялявы,
Пялёстак лёгкі — матылёк.

Ён кліча у блакіт лілею,
Каб не любіла больш да слёз

Бліскучы ад лускі і глею,
Самлелы,
абмялелы
плёс.

Дзе лашчыць цёплай ласкай хваля
Лінёў — злянелых цельпукоў,
Паблісквае няблізка
далеч,

Дзе ў іле не злічыць малькоў,
Дзе глыб угнеўлена шыпела,
Калі
на хвалі
лівень
лёг...

Засумавалы,
белы,
белы,
Ляціць удалеч
матылёк...

## Пытанні і заданні

1. Які настрой, якія пачуцці выклікаў у вас верш? Для чаго, на вашу думку, ён пісаўся: для таго, каб пры дапамозе слова намаляваць прыгожы вобраз матылька, ці за гэтым малюнкам хаваецца нешта большае — адносіны паэта да прыроды, да сваёй зямлі, увогуле да жыцця? Якія гэта адносіны: абыякавыя, зацікаўленыя, захопленыя, гарманічныя? Абгрунтуйце свой адказ.

2. Успомніце, якую ролю адыгрывае пейзаж у літаратурным творы. Падумайце, чым адрозніваецца мастацкі пейзаж ад апісанняў прыроды ў падручніку па прыродазнаўстве.

3. У вершы вельмі яўна чуюцца паўторы аднаго гука. Назавіце гэты гук і скажыце, якое ўражанне выклікае паўтор — **гукапіс**, якое гучанне надае ён вершу: напружанае, мяккае, ляніва-закалыхваючае, лагоднае? Як гэтае ўражанне суадносіцца са зрокавымі вобразамі: белая лілея, бялявы матылёк, белыя аблокі і інш. — супярэчліва ці сугучна?

4. Якія паэтычныя сродкі і прыёмы ўжывае паэт, малюючы карціну прыроды? Назавіце эпітэты, параўнанні, метафары, адухаўленні, пры дапамозе якіх паэт ажыўляе прыроду, надае ёй чалавечыя якасці і рысы.

5. Верш «Матылёк» — пейзажны твор, у якім паэт малюе карціну прыроды, робіць гэта пры дапамозе асобных дэталей, штрыхоў, намёкаў так па-майстэрску, умела, тонка, што па гэтым кароценькім вершы можна ўявіць сабе і пару года, і час дня, і выгляд неба, наваколля і г. д. Паспрабуйце перадаць усё гэта ў форме празаічнага апісання, аповеда пра тое, як аднойчы, седзячы на беразе невялікай ці вялікай, спакойнай ці бурлівай ракі, вы наглядалі такую карціну і перажывалі тое, што перажываў паэт. Нічога не дадумвайце ад сябе, бярыце ўражанні толькі з верша. Яны ў вершы надзвычай багатыя і яркія, паэтычныя! Вось адзін толькі радок: «Лілею млявы плёс люляе...» Тут жа адразу бачна, што гэта ў ясны, спакойны летні ці вясновы (калі цвітуць лілеі), пагодлівы (злежаныя аблокі ўдалечыні) дзень, а перад тым, відаць, было і такое, «калі на хвалі лівень лёг...», і г. д., словам, пра ўсё, як у вершы паэта.

6. Вызначце, якім памерам напісаны верш.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ ПАДАГУЛЬНЕННЯ ПА РАЗДЗЕЛЕ

1. Што такое паэзія? Пры адказе выкарыстайце выказванні пра паэзію, прыгадайце вершы, прысвечаныя паэту, паэзіі.

*Паэзія — помнік, у якім увасоблены лепшыя і найбольш шчаслівыя імгненні самых лепшых і найшчаслівейшых розумаў. (П. Б. Шэлі)*

*Паэзія — як жывапіс: адзін твор уражвае цябе болей, калі ты будзеш разглядаць яго паблізу, а другі — калі адыдзеш далей. (Гарацый)*

2. Ці звычайны чалавек паэт? Якімі якасцямі яму неабходна валодаць?

3. Да якіх тэм звяртаюцца паэты? Прывядзіце прыклады вершаў на розную тэматыку. Якія пачуцці перадаюць гэтыя вершы?

4. Якія сродкі мастацкай выразнасці вы ведаеце? Падмацуйце свой адказ прыкладамі з твораў.

5. Назавіце від работы з мастацкім творам, пры якім патрэбны хуткасць, тэмп, інтанацыя, лагічныя націскі, паўзы, жэсты, міміка.

6. Вызначце рыфму ў наступных вершаваных радках. Якімі сродкамі і спосабамі дасягаецца рытмічнасць мовы?

І сэрца, як лісток, трымціць,
Што супакоіць немагчыма:
«А чым даўгі табе сплаціць,
Мая Радзіма?!»

7. Ведаючы законы, па якіх дасягаецца рытмічнасць мовы, устаўце ўслед за пісьменнікам М. А. Уласенкам патрэбныя словы ў чатырохрадкоўі:

Эх, цяжкая гэта штука —
школьная ... ,
А ці ж я не здатны
Вучыцца на ....

Хай кожны з нас
на вус накруціць:
Хто пытае,
той не ...

8. Як называюць духскладовую стапу з націскам на першым складзе?

> Со́нца ўсюды хо́дзіць з ласкай,
> Со́нца све́ціць ро́ўна ўсім.
> (*Я. Колас* «Сымон-музыка»)

—́ — / —́ — / —́ — / —́ —
—́ — / —́ — / —́ — / —́

9. Вызначце вершаваны памер верша Максіма Багдановіча «Зімой».

> Здаро́ў, маро́зны, зво́нкі ве́чар,
> Здаро́ў, скрыпу́чы, мя́ккі сне́г!
> (*М. Багдановіч* «Зімой»)

— —́ / — —́ / — —́ / — —́ / —
— —́ / — —́ / — —́ / — —́

10. Суаднясіце вершаваны памер і яго рытмічную схему:

| | |
|---|---|
| Ямб | ( — — —́ ); |
| Харэй | ( — —́ — ); |
| Дактыль | ( — —́ ); |
| Амфібрахій | ( —́ — ); |
| Анапест | ( —́ — — ); |

11. Ці звязаны паэтычныя творы з іншымі відамі мастацтва? Прывядзіце прыклады.

12. Прачытайце выразна верш, які вам асабліва падабаецца.

13. Падрыхтуйце вуснае выказванне на адну з тэм:

– Чаму чалавеку патрэбна паэзія?

– Паэзія пачалася з песні...

– «Усякая паэзія ёсць выражэнне душэўнага стану» (А. Бергсан);

– «Паэзія — як жывапіс: адзін твор уражвае цябе болей, калі ты будзеш разглядаць яго паблізу, а другі — калі адыдзеш далей» (Гарацый);

– «Крыніца ўсякай паэзіі — глыбокае адчуванне невыразнага» (Ж. Л. Арэа).

# V. ТАЯМНІЧАЕ Ў ЗВЫЧАЙНЫМ І ПАЎСЯДЗЁННЫМ

У адрозненне ад паэтычных твораў, якія ствараюцца пад асаблівы настрой, калі чалавекам валодаюць моцныя пачуцці і перажыванні, празаічныя творы па накале эмоцый іншыя. Яны зблiжаны з паўсядзённым жыццём і побытам людзей. Проза тым і адрозніваецца ад паэзіі, што паказвае, апісвае жыццё ў яго «натуральным» выглядзе.

Але проза таксама мае свае мастацкія сакрэты.

Адным з важнейшых сродкаў мастацкага паказу жыцця з’яўляецца аўтарская фантазія і вымысел. Дзякуючы творчаму ўяўленню пісьменніка ствараюцца карціны жыцця, якія здаюцца нам рэальнымі, апісваюцца паводзіны людзей ў той альбо іншай сітуацыі, нібы сфатаграфаваныя з паводзін нашых блізкіх і знаёмых.

Яшчэ адзін сакрэт прозы ў тым, што кожная расказаная аўтарам гісторыя хавае глыбокі роздум пісьменніка аб жыцці. Пісьменнік не толькі дзеліцца сваімі думкамі, ён

прапануе задумацца над нейкімі жыццёвымі пытаннямі і чытачу. Самае важнае для празаіка — данесці да чытача нейкую думку, «ісціну». Такім чынам, мастацкая проза — гэта не проста займальнае чытанне. Пісьменнік заўсёды засяроджвае нашу ўвагу на такіх з'явах і фактах, аб якіх мы не вельмі задумваліся, каб паказаць, што за імі хаваецца нешта істотнае, важнае для чалавека. У празаічных творах асаблівае значэнне мае **пазнанне** жыцця.

Празаічныя творы дзеля таго і пішуцца, каб выклікаць у нашай свядомасці глыбокі роздум, прымусіць хвалявацца за лёс герояў, успрымаць іх учынкі, удачы і няўдачы, як свае.

## Пытанні

1. У чым галоўнае адрозненне твораў празаічных ад паэтычных у іх змесце?
2. Якое значэнне мае вымысел, фантазія ў паказе жыцця ў празаічных творах?
3. Што дае нам чытанне празаічных твораў у пазнанні жыцця?

***Васіль Хомчанка***

## ЗВОН ПАД ЗЯМЛЁЙ

Баба Настачка, седзячы ў цяньку хаты на ўслончыку, карначом скрабла маладую бульбу і кідала яе ў чыгунок з вадою. Бульбіна булькала, вада пырскала і на самую бабу, і на Васілька, які прымасціўся на загавальні. Халодныя пырскі — вада толькі што са студні — прыемна, быццам ільдзінкі, паколвалі скуру, і Васілёк кожны раз, калі баба падносіла бульбіну да чыгунка, знарок падстаўляў твар пад гэтыя пырскі. «Блюм!» — глытала вада бульбіну.

«Блюм!» — гаварыў Васілёк, зажмурваючыся ад пырскаў. Старая баба, скурчыўшыся на ўслончыку і ўся рупліва засяроджаная сваім заняткам, нічога гэтага не заўважала. Яе бурыя сухія пальцы бясконца варушыліся, і бліскучае лязо карнача варушылася, здзіраючы ружовае шалупінне. А калі ў чыгунку бульбы пабольшала, а вады паменшала і яна ўжо не пырскалася, Васілёк сказаў:

— Баба, а чаго я сяджу на двары? Чаго не збегаю на луг?

— А ты не сядзі, пабегай каля хаты.

— Я каля хаты бегаў. Тут куры і горача. Я на луг хачу.

— На лузе рэчка, і ты ўтопішся.

— Не ўтаплюся, навошта мне тапіцца.

Баба Настачка нічога не адказала, перастала скрабці бульбу і задумалася. Вочы ў бабы маленькія, вузенькія, вакол іх, нібы павуцінне, зморшчынкі, а старкаваты твар шэры, выцвілы, як пустое поле ў познюю восень. Баба не заўважыла, што ўжо не ў цяньку сядзіць — сонца выглянула з-за хаты і смаліла ёй галаву. Яна не пасунулася бліжэй да сцяны, а толькі нацягнула рог белай, у чорную гарошыну хусткі ніжэй на твар. Дачысціла бульбу, паклала нож у чыгунок і, выпрастаўшы рукі на каленях, адпачывала. Васілёк устаў з загавальні, абхапіў бабу за цёплую шыю і пачаў лашчыцца, як лашчыўся заўсёды, калі хацеў нешта выпрасіць.

— Баба, родненькая, пусці мяне.

Рука бабы Настачкі пасунулася па Васільковай спіне і плячы, легла на галаву, паказытала валасы.

— Не, унучак, я лепш табе моркаўку вырву. Сало-о-дкая моркаўка.

Васілёк пакрыўджана сеў на загавальню, абхапіў рукамі калені, а на калені паклаў галаву. Так ён сядзеў і чакаў, калі пашкадуе яго баба. Плакаць ён не збіраўся, ды і не змог бы заплакаць — крыўда ж яшчэ не моцная.

Сухі ліпень затапіў зямлю гарачынёй, спякотным сонечным святлом, парнай цішынёй, высініў неба, сцёршы з яго ўсе хмурынкі і аблачынкі, і яно апусцілася нізка, нібыта хацела параўнаць сваю сінюю красу з красой зямной, зялёнай. Чорныя кропкі ластавак прашывалі сінечу неба, і чым гарачэй рабілася на зямлі, тым вышэй і вышэй узнімаліся ластаўкі. Млосна стагналі куры пад сенцамі, на двары цыбаў, з булькannем у горле, певень. Рыжы кот выцягнуўся на саломе і ляжаў як нежывы, раз-пораз высалопваючы чырвоны, падобны на стручок перцу, язык. Зрачкі ў ката як дзве макавыя бубачкі, а хвост — прамая палка: колькі Васілёк ні глядзеў, хвост ні разу не варухнуўся.

Пуста ў вёсцы і ціха. Хто на сенажаці, хто ў лесе, хто на рэчцы. Не чуваць нічыйго крыку, піску, смеху. Хоць вазьмі Васілёк ды крычы за ўсіх сам, на ўсё сяло.

— А вунь і да цябе ідуць, — ці што пачула, ці ўбачыла баба.

Васілёк, усё яшчэ седзячы ў той самотнай паставе, пачаў глядзець то на зачыненыя вароты, то на агарод — там, дзе ў затравелым рагавічку былі веснічкі і сцежка ў поле. Але нічога не ўбачыў. Ён падскочыў і спытаў:

— Дзе, баба, дзе? — І нарэшце ўбачыў над варотамі зялёнае вудзільна, а ў шчыліне нечае вока. Вароты з рыпам адцісnуліся ад шула, і на двор зайшоў Антон.

— На Беседзь іду,— сказаў ён.

Васілёк чакаў, што Антон і яго запросіць на рэчку, але той не запрашаў.

— Ну дык пасядзі перад дарогай, — сказала баба Антону. А той як стаў пасярод двара, так моўчкі і стаяў, мыляючы сваімі тоўстымі мокрымі губамі.

— Сядзь, — запрасіў і Васілёк, паляпаўшы па загавальні, і сеў сам.

Антон падышоў да загавальні, паставіў на яе босую закарэлую нагу, але не сеў. Яму хацелася нешта сказаць па сакрэце Васільку, і каб не чула баба.

— Баба, давай я чыгунок у хату занясу, — зразумеўшы Антона, сказаў Васілёк.

Баба спахапілася, устала з услончыка, зірнула на сонца, а яно ўжо высока ўзабралася, — войкнула, што яшчэ столькі работы, і, захапіўшы чыгунок, паспяшалася ў прыхатак.

— Што ты, Антон, хацеў сказаць? — шэптам спытаў Васілёк.

— Дай гурок, — таксама шэптам папрасіў Антон.

— Гурок? — расчараваўся ў Антонавай таямніцы Васілёк. — Яны яшчэ горкія.

— Дай гурок, і я залезу на неба.

— Хо! — разявіў рот Васілёк. — На неба?

— Ага.

Было цікава, што прыдумаў сёння гэты Антон, цыганаваты і дурнаваты, як яго называла Васількова маці. Ен заўсёды што-небудзь ды выдумляў, і ўсе яго выдумкі мелі на мэце адно — нешта сабе выгадаць. Не так даўно разам з малышнёй Антон узяў і Васілька ў суніцы. І калі ўсе назбіралі ягад і наеліся да аскомы, Антон аб’явіў, што яны заблудзіліся: «вось туды Амерыка, там Нямеччына, там Японія. А дзе наша сяло, не ведаю». Лёгшы на зямлю, Антон прыкладваў то адно, то другое вуха, слухаў. «Ведаю, дзе сяло, ды не скажу». Дзятва, як ягняты, збілася вакол Антона, просіць, каб сказаў. «Добра, — згадзіўся ён, — кожны палову сваіх суніц аддае мне». Суніцы тады пааддавалі ўсе, і Васілёк палову сваіх высыпаў у Антонаў кошык.

А цяпер вось гэта прыдумка Антона на неба залезці.

— Аж туды вунь, дзе ластаўкі лятаюць, залезеш? — не паверыў Васілёк.

— І вышэй.

— Ого ж!

Ці ж пашкадуеш агурка, каб такое ўбачыць? Васілёк азірнуўся на вокны хаты, бабулі нідзе не было відаць, і пераскочыў цераз прасла на грады. Сарваў два агуркі, кінуў Антону, які з сабачым спрытам падхапіў іх і запхнуў у кішэнь штаноў. Назад з агарода пералазіў не спяшаючыся. Думаў, якім жа чынам гэты Антон будзе ўзбірацца на неба? А калі ўзлезе, як назад спусціцца?

Антон стаў на загавальню абедзвюма нагамі і так пазіраў у неба, быццам прымерваўся да яго высі, выбіраў туды карацейшую дарогу. Жаўтаватыя вочы яго не хітравалі. Вось ён патрос чорнай усклычанай галавой, з доўгімі хвосцікамі валасоў на скронях і шыі, — даўным-даўно галава не бачыла нажніц, — адтапырыў ніжнюю, таўсцейшую губу.

— Н-да, — паварушыў ён гэтай губой. — А цяпер давай мне лесвіцу.

— Якую лесвіцу? — здзівіўся Васілёк.

— А па якой я на неба залезу.

Васілёк заміргаў вейкамі, ледзь не зарагатаў: дзе гэта можна такую лесвіцу дастаць? Ды адразу зразумеў, што Антон і на гэты раз яго абхітрыў.

— Ты ж не казаў, што палезеш па лесвіцы.

— І не казаў, што палезу без яе. Не казаў?

— Цыган, дурны цыган! — канчаткова зразумеўшы Антонаву хітрасць, крыкнуў Васілёк. — Толькі падманваеш заўсёды. Ідзі з двору!

У Антона была рэдкая хлапчукоўская якасць: ён ніколі ні на каго не злаваўся, не кідаўся з кулакамі і не біўся, абыякава пераносіў кепікі і дражнілкі. І ў гэты раз ён стаяў спакойна і ніяк не рэагаваў на Васількову абразу.

— Цыган!

— Цыс-с! — паднёс Антон палец да рота. — Ціха, званы звоняць!

Пакрыўджаны Васілёк не разумеў, пра якія званы гаворыць Антон, і гатоў быў вось-вось заплакаць, бо не мог яму дараваць падману.

— Цы-ган, — расцягнуў ён плаксіва рот і заміргаў вачыма, стрымліваючы слёзы.

— Бом! Дзілінь, дзілінь, бом! Чуеш?

— Не чую. Дзе? — нарэшце зацікавіўся Васілёк.

— На Гарадзішчанскай гары, пад зямлёй. Чэснае слова, — пастукаў Антон сябе па грудзях. — Пойдзем слухаць.

— Баба не пусціць.

— А ты з бабай і пайдзі. Да зямлі прыкладзі вуха і пачуеш: «Бом, дзілінь, дзілінь!..»

Антон, убачыўшы, што крыўда ў Васілька патухла, ускінуў вуду на плячо і падаўся да варот. Нагой адкінуў іх ад шула, бокам пралез на вуліцу.

Васілёк жа застаўся адзін на двары. Нават баба і тая не паказвалася з хаты, усё нешта там рабіла. Ён выйшаў за вароты, зірнуў на пустую вуліцу, а потым палез на прасла, спрабуючы ўбачыць Гарадзішчанскую гару, пад якой б'юць званы.

— Бом, бом, дзілінь-дзілінь! — уголас паўтарыў Васілёк, і ў грудзях яго адклікнулася нешта казытліва-салодкае.

Бульбяное поле густа цвіло белымі і сінімі кветкамі, якія пілі сонца і шчодра дзяліліся сваім сокам з усёй жыўнасцю, што кішэла на іх. Ад бульбы ішоў здаровы цёплы пах зямлі.

Баба Настачка, сагнуўшыся, ішла па баразне, ірвала свінням траву і складвала ў фартух. Паўзучая бярозка, учэпіста абкруціўшы бульбоўнік, цяжка паддавалася яе рукам і адрывалася з трэскам. Аднак сухаватыя, загарэлыя бабіны рукі даволі шустра мільгалі ў бульбоўніку. Калі фартух набіваўся, бабка выпрамлялася і размінала дзвюма рукамі паясніцу. Твар яе ад таго, што падоўгу не разгіналася, быў чырвоны. Адпачыўшы трохі і размяўшы паясніцу, яна ішла на мяжу і складвала траву ў мех. Баба нават не заўважыла, што з'ехала

хустка з галавы і агаліла сівыя, нібы мукой абсыпаныя, валасы. Андарак на бабе доўгі, да самых забарсней, бурачнага колеру, з шырокім падалом, аблямаваным зялёнымі і чорнымі паскамі. А кофта белая, падраная на локцях.

Васілёк ішоў услед за бабай па ўтаптанай сцежцы, між палосай бульбы і суседскім просам. У руках яго лазінка, якой ён махаў у паветры, слухаючы, як яна тонка, па-птушынаму, свішча. Часам ён цэліў па матыльку, але не трапляў.

— Баба, а матыльку баліць, калі ўдарыць?

— Баліць.

— А траве?

— І ёй баліць. Усяму жывому баліць.

— Гэта трава крычыць: «трэсь, трэсь», — калі ты рвеш яе?

— Крычыць.

Васілёк задумаўся над складанасцю гэтага жывога незразумелага свету, які быў вакол яго, які ён бачыў, адчуваў і якім ён дыхаў... А свет гэты велізарны, неабдымны — нават у думках нельга ахапіць яго і ўбачыць, дзе канчаецца сіняе неба, што чашай вісіць над ім і бабай, зялёная зямля, над якой у паветры захлыналіся ад спеву жаваранкі. Жаваранкаў ён не бачыў, хоць і хацеў убачыць іх, — дрыготкая сінеча неба смактала і сляпіла вочы...

Калі прайшлі амаль усю палосу і ўзышлі на пагорачак, перад вачыма адкрыўся шырокі луг, падзелены на двое Беседдзю.

Дальні бераг рэчкі быў нізкі, з рэдкім лазняком, а гэты, бліжэйшы, высокі, абрывісты, з гарой Гарадзішча на ім. Беседзь здавалася такой блізкай, што Васілёк быццам на дотык адчуваў прахалоду і ласкавасць яе вады. З лугу і ад рэчкі свежа і мякка патыхала ветрыкам. На тым нізкім беразе чарнела рухавая постаць нейкага рыбака. Васілёк адразу здагадаўся, што гэта Антон. «Каб табе не злавілася нічога, — пажадаў ён свайму крыўдзіцелю, усё яшчэ помнячы тую лесвіцу ў

неба. — Ні вялікая рыбка, ні малая». Але неўзабаве пашкадаваў Антона і ўзяў свой праклён назад.

Баба напхала поўны мех травы, вынесла яго на сцежку і прысела на гэты мех. Стомленыя рукі ляжалі на каленях, прыжмураныя вочы глядзелі ў зямлю. Васілёк прысеў побач, зазірнуў у бабчын твар, спытаў:

— Баба, а чаму ты жмурышся? Спаць хочаш?

Баба засмяялася, на твары яе пырснулі маршчынкі.

— Старая я. Вочы слабыя, на сонца цяжка глядзець.

— А ты на зямлю глядзі.

— Я і гляджу. Старасць заўсёды да зямлі гне.

— Няўжо ты такая старая?

— Ды ўжо ж.

Гэтак размаўляючы з бабай, Васілёк не зводзіў вачэй з Беседзі і прырэчнай гары Гарадзішча. Гара, зарослая на адхонах кустоўем, жаўцела, як прасяная. Нешта незвычайнае хацелася ўбачыць хлопчыку на гэтай гары: ну хоць бы чужых людзей, якіх ён там да гэтага ніколі не бачыў. Але гара ніякага дзіва яму не паказвала. Не далятала ад яе і ніякіх гукаў.

«Падмануў Антон і пра звон пад зямлёй, — падумаў Васілёк. — Ён усё можа, гэты цыган».

— Старая ўжо я, старая, — яшчэ раз паўтарыла баба і ніжэй схілілася да зямлі.

Васілёк адразу забыўся на Антона і пачаў думаць пра бабу. Яе словы, што яна старая, ён успрыняў па-свойму. Яна здалася яму сухой вярбой каля іх лазні. Бацька не раз браўся за тапор, каб ссячы вярбу, ды заўсёды шкадаваў: «Глядзі ж ты, трухлявая, а жыве, парасткі дае, і якія буялыя», — гаварыў ён... Такая ж і баба Настачка — старая і трухлявая, нібы тая вярба. Толькі ж вярба жывыя парасткі пусціла, а дзе ж бабіны парасткі?

Ён хацеў пра гэта спытаць у бабы, але тая неяк сцішылася, як бы заснула.

— Баба, — шапнуў ён, каб праверыць, ці спіць яна. — Ба-ба!

Старая не азвалася, не варухнулася.

— Ну і спі, — сказаў ён ціхенька. — Ты ж старэнькая, і я цябе шкадую, як бацька вярбу.

У грудзях Васілька стала прыемна і цёпла, быццам улілася туды жывая вада. Ён зразумеў, што гэта варухнулася дабрата і жаласць да бабы, і яму захацелася зрабіць для яе нешта прыемнае і добрае. І ў гэты момант, калі ён думаў, што б такое зрабіць бабцы, аднекуль неспадзявана пачулася:

— Дзілінь-дзілінь, бом!

Ён азірнуўся, не разумеючы, адкуль ідзе звон. Рашыў, што гэта звініць недзе ў яго нутры тая цёплая жывая вада.

— Спі, бабулька, спі, — гладзіў ён яе па худым і цвёрдым, як сук, локці. — Выспішся — і мы з табой занясём траву двору, памыем у карыце, пасячом.

— Дзінь, бом! — зноў празвінела, і зноў Васілёк падумаў, што гэта звініць у яго нутры. Толькі ў трэці раз, калі звон крануў вушы, спачатку тоненькімі, хрупка крыштальнымі гукамі, а пасля басавітым гулам, Васілёк насцярожыўся: не душа звінела, а званы, і недзе далёка-далёка. Ён ускочыў, паглядзеў у бакі, прыслухаўся, але так і не зразумеў, з якога боку вецер прынёс песню званоў. Можа, паслала неба сіняе? Ці плесканула сваімі хвалямі Беседзь? І раптам сэрца яго замлела ад здагадкі: гэта ж з Гарадзішчы ідзе звон!

— Баба, чуеш? — прашаптаў хлопчык, нахіліўшыся да бабульчынага вуха.

Але баба спала, мякка седзячы на мяху з травой, сагрэтая цёплым сонцам.

— Спі, спі, — не стаў яе будзіць Васілёк, а сам падаўся на выпетраную ўпоперак палос сцяжынку, потым подбегам пашыбаваў туды, дзе ў срэбным мроіве жаўцела пясчаная гара, а пры ёй сінела Беседзь.

«Баба Настачка не пускае мяне аднаго, баіцца, што ўтаплюся, — думаў ён. — А я не палезу ў рэчку, нават там, дзе мелка. Я толькі на гару ўзбяруся».

Пратэпаў Васілёк праз усё бульбяное поле, сасцяжыўся на шлях, туды, дзе выраіліся купаю бярозы. Дрэвы нібыта спалі, лісцікі не варушыліся, і цені ад іх ляжалі кружочкамі на затканай падарожнікам і трыпутнікам дарозе. Пагладзіў Васілёк цёплую бяросту, пакратаў раны-насечкі — вясной з іх капаў бярозавік, і Васілёк прыбягаў сюды піць яго праз саломінку, — пастаяў яшчэ крыху і пайшоў бліжэй да Гарадзішчы.

Дарога — вузкая травяная стужка з тупкімі каляінамі — вілася па полі ўлева-ўправа, рассоўваючы ў бакі то палосы бульбы, то жыта. Дарозе было горача, і яна падціскалася сваімі краямі ў цень. Па гэтых краях Васілёк і стараўся ступаць, там было халадней нагам. Жыта шумела ціхім пошумам, звінела птушкамі і трашчала цвыркункамі, між сцяблін свіцілася празрыстая зялёная цішыня. Ідучы, хлопчык раз-пораз падскокваў, каб убачыць гару. Ішлося лёгка — ці ж цяжка яму несці на плячах свае шэсць гадоў. А каласы, што хіліліся над дарогай, пяшчотна казыталі твар і пахлі, як свежы бохан хлеба. Неўзабаве Васілька абступіла задужа высокае жыта, і цяпер, як ні падскокваў Васілёк, нічога вакол не мог убачыць.

Раптам да яго даляцеў стук колаў. Хлопчык спыніўся, збочыў у жыта. Праз колькі хвілін ён убачыў над жытам зялёную дугу, затым конскую гнядую галаву, якая рухалася да Васілька. Мяккі ляскат колаў і тупат капытоў узмацніўся, і неўзабаве перад самым Васільком фыркнула конская храпа і спынілася. Чалавек, што сядзеў на калёсах, звесіўшы босыя ногі, здзіўлена разглядаючы Васілька, спытаў:

— Ты чаго тут?

— Іду.

— Куды?

— На Гарадзішча.

Чалавек усміхнуўся, паляпаў па білах.

— Сядай, падвязу.

Васілёк узлез на калёсы, умасціўся на разасланай не зляжалай траве.

— Ты Васілёк?

— Ага. Адкуль, дзядзька, мяне ведаеш?

— Бабу тваю ведаю, Настассю Акіндзеўну. Яна маіх дзяцей бабіла.

Дзядзька сморгнуў за лейцы — конь з упрэлай спінай крануў з месца нецярплівым трушком, уцякаючы ад назойлівых сляпнёў і мух, што віселі над ім. А дзядзька махаў вераўчанай пугай, не так падганяючы гнядога, як зганяючы з яго розную заедзь. Быў ён не стары, амаль такога веку, як Васількоў бацька, з кароткімі рыжаватымі вусамі і шчэццю на барадзе. На ім белая расхрыстаная кашуля, картуновыя чорныя штаны, закасаныя па калена, пальцы на правай руцэ жоўтыя, закураныя тытунёвым дымам.

Конь трусіў жвава, яго шырокі гладкі крыж, як перавернуты дном човен, калыхаўся ўпоравень з каласамі жыта. На калёсах Васільку сядзелася мякка, утульна, бачылася з іх далёка: сяло з напаўразбураным касцёлам, на круглым даху якога ў гняздзе стаяў бусел, густы ліловы лес, куча вербаў і бяроз на могілках, школа... Дзядзька тоненькім камарыным галаском цягнуў нейкую песеньку. Часам канцы восяў чаплялі жыта, з шорхатам падміналі сцябліны, і яны, зламаныя, адмечаныя чорнымі дзёгцевымі рыскамі, тут жа віслі на зямлю. Заміраны спакой лунаў і рухаўся разам з Васільком сярод жытнёвага прасцягу, агортваючы хлопчыкаву душу і цела. Ён адчуваў, што набліжаецца да нечага шчымліва-радаснага, шчаслівага, якое ён стрэне ўпершыню ў жыцці. І раптам гэта самае, што ён павінен сустрэць,

што ён цяпер чакаў, абвясціла пра сябе ціхенькім звонам: «Дзінь! Бом!»

Васільку здалося, што варухнулася гара.

— Дзядзька, звон!

Дзядзька прыклаў да вуха далонь, павярнуўся то ў адзін, то ў другі бок, прыслухаўся.

— Жаваранкі, — упэўнена сказаў ён.

— Не, не жаваранкі. Яны так: цілінь, цілінь, цілінь. А гэта — бом! Чуеш? Пад гарой звініць, во!

Дзядзька апусціў руку і нічога не сказаў. Яны ўжо пад'язджалі да гары. Бок яе, што старчаком узвышаўся над Беседдзю, быў спярэшчаны пячоркамі-гнёздамі. Стрыжы з цвіканнем лятали каля гары, чыркалі крыльцамі па вадзе. Густая апаяска з дубняку і ляшчэўніку акружала гару па нізу, а вышэй на схіле, аж да самай макаўкі, жаўцелі пясчаныя праплешыны. Дзядзька спыніў каня, злез з калёс. Стоячы спінай да Васілька, пазіраў на верх гары і прыслухоўваўся.

— Праўда твая, Васілёк. Званы звіняць. І я колісь залазіў вунь туды, прыпадаў вухам да зямлі і чуў звон.

Ён узяў Васілька пад пахі, паставіў на зямлю. Васількова ногі ўлезлі ў пясок па костачкі, і так стаяў ён, нібы ў цёплай вадзе.

— А адкуль званы пад зямлёй? — спытаў Васілёк.

— Даўняя гэта гісторыя, мой хлопчык, — ён паклаў руку на галаву Васілька, задумаўся, а потым, як бы гаворачы сам з сабою, працягваў: — Даўным-даўно, калі не было на свеце ні тваёй бабы, ні яе дзеда, ні дзедавага дзеда, жылі на гэтай гары людзі. Гара была тады і шырэй, і вышэй, акружаў яе вал земляны і дубовая сцяна. На самай вяршыні гары стаяла белая цэркаўка з сярэбранымі званамі і залатымі крыжамі. Званы так прыгожа звінелі, што ўсё жывое і нежывое замірала, слухаючы іх.

Аднойчы ў наш край уварваліся орды паганцаў. Мужна змагаліся з ордамі рускія людзі, ды сілы былі няроўныя. Падышлі паганцы і да Беседзі. Убачыў іх хан Гарадзішчанскую цэркаўку і ажно закалаціўся ад зайздрасці, што ў яго ханстве не было такой прыгажосці. Загадаў ён гарадзішчанцаў у палон пабраць, а царкву перавезці ў сваё ханства. Дзень і ноч біліся нашы людзі з паганскім войскам. А калі не ўтрымалі земляныя валы і запалалі дубовыя сцены, гарадзішчанцы схаваліся ў царкву. Падступіўся хан да царквы, а ўзяць не можа. Не здаваліся гарадзішчанцы. Тады люты хан загадаў спаліць царкву разам з людзьмі. Абклалі яе голлем, саломай і падпалілі. Шуганула полымя... І тут адбыўся цуд — цэркаўка раптам разам з людзьмі пачала асядаць у зямлю. А як зусім апусцілася, сышлася над ёй зямля, і як бы не было тут царквы. З той пары і звіняць званы пад зямлёю.

— І людзі там? — спалохаўся Васілёк.

— І людзі. Вось яны і падаюць галасы.

— У званы звоняць, — дапоўніў Васілёк. — А гэта праўда ці казка?

Дзядзька пагладзіў Васілька па льняной галаве, узлез на калёсы і тузануў за лейцы.

— Добрая казка заўсёды праўдзівая.

Апошнія яго словы ўпалі на дарогу, і конь растаптаў іх капытамі. Порстка зрушаныя калёсы пакаціліся да броду, уехалі ў ваду па самыя восі, узбруіўшы каля сябе белыя віхорчыкі. Пераехаўшы на другі бераг, дзядзька спыніў каня і падышоў да жанчыны, што пасвіла карову. Нешта сказаўшы ёй на вуха, паказаў пугай у бок гары і паехаў далей. Хоць Васілёк і не чуў, але зразумеў, што гаварыў дзядзька той жанчыне: «Глядзі, цётачка, каб хлопчык у рэчку не палез».

— Не палезу! — крыкнуў Васілёк і па адхоне гары, упіраючыся і рукамі, і нагамі ў сыпучы пясок, рачком

пакараскаўся вышэй. Паваліўся на зямлю, прыціснуўся да яе вухам. Безліч шумаў зрынуліся на яго. Тут былі і свіст, і ціліканне, і стракаценне, і мяккае шастанне каласоў, і плёскат вады, і крыкі, і плач, і стогн... Але раптам трывожны гулкі ўдар звона — «Бом!» — уладарна заглушыў увесь гэты хаос гукаў і шумаў. Услед за ім пракалыхаліся і затрапяталі самыя маленькія званочкі — дзілі, дзілі, дзілі... Рэха іх доўга цякло і доўга раставала.

А Васільковы губы варушыліся ў рытме пачутага і шапталі:

— Яшчэ званіце, яшчэ.

Цяпер ён верыў, што звон сапраўды ішоў з-пад тоўшчы зямлі. Званілі тыя людзі, якія праваліліся разам з царквою, пасылаючы ўверх, на белы свет, свае боль, і трывогу, і малінавую радасць за тых, хто жыве на белым свеце...

А тым часам паступова, спакваля пакідаў зямлю дзень і гусцеў прыцемак. Хоць да вечара было яшчэ далекавата і па-дзённаму сінела неба, усё ж сонца грэла слабей, а зямля ў цяні памалу пачала аддаваць сваю прахалоду, якую запасла з начы. Пахаладзела трава, бо, відаць, праз яе сачылася зямная прахалода, гасячы трымценне паветра. Паспакайнела спалавелае жыта, застыла, як зацягнутае скарынкай цеста.

А ў вушах Васілька гудзеў звон, і разам са звонам чуліся яму чалавечыя галасы, адтуль, з-пад зямлі.

Ён ускочыў і закрычаў у бок жанчыны, якая здалёк назірала за ім:

— Цётка, бяжы хутчэй сюды. Там людзі-і! Адкапаць трэба!

Баба Настачка, седзячы на мяху з травой, баялася заснуць. Аднак яе хіліла на сон, вочы мружыліся, галава цяжэла, рукі рабіліся нячутнымі. І можа, таму, што баялася заснуць і намагалася адолець сон, яна засынала неадольна

і глыбока. Цела яе ўжо спала, толькі ў розуме білася насцярожанай жылкай турбота пра Васілька: як жа ён, гэты сардэчны чалавечак, застанецца без дагляду, калі яна засне. Потым баба правалілася ў цёплае забыццё, цёмнае бяздонне, лагоднае і спакойнае, дзе не было ніякага клопату і трывог. І зноў жа ў галаве ў апошні раз успыхнула і сатлела саломінкай думка, што вось так бы, як і засынала, добра было б і памерці...

Прачнуўшыся, бабка па сонцы вызначыла, што праспала добрую гадзіну. А ёй жа трэба было шмат чаго зрабіць да прыходу з поля сына і нявесткі. Яна хуценька ўзваліла мех з травою на спіну і паспяшалася двору і толькі цяпер успомніла, што з ёю ж дагэтуль быў Васілёк. Азірнулася, клікнула два разы і, не пачуўшы адказу, рашыла, што ўнучак дома. Відаць, прагаладаўся і збег дамоў, пакуль яна, старая варона, спала на мяху. Зайшоўшы на двор і паклаўшы мех каля карыта, бабка заспяшалася ў хату. Але і там Васілька не было. На лаўцы стаяў чыгунок з ачышчанай і залітай вадой бульбай — пара было печ распальваць.

— Васілёк! Васілёк! — клікала баба, выйшаўшы з хаты. Ніхто ёй не адклікнуўся, толькі ўзбоч пралапатала ўлезшая ў грады курыца, з перапуду ледзь не таўханула бабу ў грудзі.

— Васілёк!

Знясіленая ад трывогі, яна села на загавальню. Куды бегчы, дзе шукаць малога? Што з ім? І не ведала, што рабіць. Нарэшце даўмелася, што Васілёк мог пайсці на Беседзь, як ветрам падхапіла старую і пагнала туды.

— Хоць бы ты там не ўтапіўся, — захлынулася яна слязьмі. Пакуль дабегла да жыта, успела даволі моцна прытаміцца, боль і трывога прытупіліся. Баба Настачка раптам заўважыла, што вымахала такое добрае жыта, каласы буй-

ныя, і, значыцца, будуць людзі з хлебам. Супакойвала яе і цішыня над зямлёй, прахалода, якую яна раптам адчула ўсім целам. Па небе, з дробненькімі хмурынкамі, баба Настачка вызначыла, што заўтра будзе гарачы дзень з кароткім ціхім дожджыкам. «Няхай пройдзе, — узрадавалася, — сенакосу не пашкодзіць, а бульбу асвяжыць».

Нарэшце яна выйшла з жыта. Адсюль ужо добра былі відаць Беседзь і гара Гарадзішча. Прыбавіўшы ходу, яна хутка апынулася каля Беседзі. Пачала азірацца вакол, ці не засінее дзе Васількова кашулька. Падышла яшчэ бліжэй да гары, рассунула кустоўе — перад вачыма мільганула нешта сіняе. Старая радасна пляснула ў ладкі, — то яе Васілёк корпаўся ў пяску. Яна хацела крыкнуць яму, ды ад шчасця, што ўнучак жывы і здаровенькі, перахапіла дыханне. Схапілася за рагазаты дубок, ускараскалася вышэй і прысела побач з Васільком.

Хлопчык, заняты сваім, і не заўважыў бабкі. Прысеўшы на чупачкі, ён выграбаў з ямкі пясок і ссыпаў уніз.

— Унучак! — ціха паклікала Настачка.

Васілёк ад неспадзеўкі так і застыў з поўнымі прыгаршчамі. На спацелым, замурзаным зямлёю твары адначасова можна было прачытаць і віну за ўцёкі сюды, і радасць ад сустрэчы.

— Баба! — крыкнуў ён. — Лапату нясі. Тут жывыя людзі закапаны!

— Бог з табой, якія людзі!

— З царквою праваліліся і ў званы звоняць.

— Авохці мне, — ляпнула яна ў ладкі. — Вунь ты пра што...

А ўнук, улезшы ў ямку — цяпер яна была яму па грудзі — і выкінуўшы чарговыя прыгаршчы пяску, прысеў, крыкнуў:

— Людзі, чуеце мяне, я да вас іду!

Бабе таксама рупіла памагчы Васільку капаць, але яна ўспомніла, што дома яе чакае многа работы, занепакоілася, пачала прасіць Васілька ісці дамоў. Падала яму руку і памагла вылезці з ямкі.

Дахаты вярталіся, узяўшыся за рукі. Неба згусціла свой блакіт, здавалася, вось-вось ён закрапае сінім дожджыкам. Васілёк пазіраў на гэты блакіт і думаў нешта сваё, што не давала яму спакою.

— Баба, — загаварыў ён, — калі б з лапатамі ўсе-ўсе нашы прыйшлі, адкапалі б людзей?

— Адкапалі б, — сказала Настачка, каб заспакоіць унука. — Некалі так і зробяць.

Васілёк адчуў зноў, у каторы раз сёння, як жывая вада дабраты запаўняла яго душу, ацяпляла сэрца. Зразумеў: хораша яму таму, што побач ідзе яго любімая баба, што ён сёння чуў звон з-пад зямлі і рашыў, як падрасце, раскапае Гарадзішча, падорыць тым людзям волю, а сабе прыгожае дзіва — залатую цэркаўку.

Ён прыпыніўся, баба таксама прыпынілася, нагнулася да яго. Хлопчык абхапіў яе шчокі, сказаў:

— Я цябе вельмі шкадую. Як тата вярбу, што каля лазні, і буду берагчы цябе і нікому не аддам, хоць ты і старая.

— Добра, унучак, добра, — падняла яго баба на рукі і пагладзіла спіну сухой жорсткай рукой. — І я цябе люблю.

Шчасцем родства, любоўю да блізкіх была напоўнена і бабіна душа. Вось на руках той жывы атожылак, які прарос з яе плоці, сын яе сына, здаравенькі, душэўны і чысты, як крынічка, хлопчык. Ён працягне род яе, застанецца жыць і тады, калі яна будзе ўжо нішто, пыл, прах...

І баба Настачка ўспомніла старую вярбу, ад каранёў якой цягнуліся к жыццю радасныя гонкія парасткі.

## Пытанні і заданні

1. Вызначце тэму апавядання.

2. Якія ўзаемаадносіны склаліся паміж Васільком і бабай Настачкай? На чым трымалася гэта шчырая прыязнасць?

3. Для чаго ў твор уведзена паданне пра Гарадзішча і сярэбраную цэркаўку? Як праз гэты пазасюжэтны прыём раскрываецца характар Васілька?

4. Працягніце пералік асноўных рыс характару Васілька, аргументуючы сваю думку:

— даверлівы (ён зноў паверыў Антону, які заўсёды выдумляў, каб нешта сабе выгадаць: некалькі дзён таму ён бессаромна вымусіў малых аддаць яму палову сабраных суніц);

— дабрадушны (паслаўшы праклён свайму крыўдзіцелю, адразу ж пашкадаваў Антона і забраў свой праклён назад);

— спагадлівы... і г. д.

5. Які чалавек, на вашу думку, мог бы вырасці з Васілька?

6. Ці адчулі вы аўтарскія адносіны да бабкі Настачкі? У чым гэта праяўляецца? (Пры адказе звярніце ўвагу на партрэт гераіні.)

7. З якою мэтай аўтар уводзіць вобраз старой вярбы? Што гэты вобраз дапамагае нам зразумець?

8. Вызначце ідэю твора.

9. Падрыхтуйце інсцэніроўку па творы. (Выкарыстайце для інсцэніроўкі эпізод сустрэчы і размовы Васілька з Антонам. Падрыхтуйце дыялог і рэмаркі, прадумайце інтанацыю, жэсты, міміку.)

10. Падрыхтуйце паведамленне «Роля апісанняў у мастацкім творы».

*Якуб Колас*

## «ДЗЕРАВЕНШЧЫНА»

Як яно будзе далей, сказаць цяжка. Хутчэй за ўсё, што кепска: і сам Міхалка так думае, стоячы на каленках па некалькі разоў на дзень.

Ён ужо кінуў і жаліцца сабе самому на сваю долю і пакорна згінаў калені ў куточку. І гэты куточак стаўся яму нават блізкі, як бы родны. Ды яно і не дзіва: тое месца, дзе ронім мы першыя слёзы і пакідаем частку сябе саміх, становіцца дарагое для нас. А ў гэтым кутку Міхалка многа чаго перадумаў. І адзін толькі ён, гэты куток, знаў усе яго думкі, бо пагаварыць тут няма з кім.

Ох, гэты горад! На пакуту сюды ўзялі малога Міхалку. А горш за ўсё, дык гэта тое, што ніхто тут яго не шкадуе, ніхто за яго не закіне слова. А часамі выскачыць ён на двор, куды забяжыць знячэўку які сабака, можа, такі самы бяздомнік у горадзе, як і Міхалка. Каб хоць з сабакам адвесці душу. І толькі пачне Міхалка заводзіць знаёмства з ім, кінуўшы яму перад гэтым кусочак хлеба (а хлеба іначай як украдкам не возьмеш), як ужо братавая барабаніць рукою ў шыбу.

Міхалка ўжо ведае, што яму рабіць: ідзе ў хату і займае свой куточак, становячыся на калені. Сам Міхалка, калі хто выпадкам запытае, чаго ён стаіць на каленках, тлумачыць так:

— Я яшчэ — «дзеравеншчына», не знаю гарадскіх парадкаў і кепска трымаю сябе. От з мяне і выбіваюць «дзеравеншчыну».

— А ты любіш вёску? Паехаў бы туды?

Раней чым адказаць, Міхалка баязліва азірнецца і ціхенька скажа:

— Паехаў бы.

Праўда, Міхалка нядаўна прыехаў з вёскі. Але гэта толькі гаворка адна — «прыехаў». Проста забралі яго сюды — і ўсё, бо дома не было дзе падзецца. Бацька памёр, маці памерла, от і забралі яго сюды. Цяпер ужо нічагутка — прывык, але спачатку дык было надта кепска. Сядуць, бывала, за стол. На маленькім століку каля дзвярэй стаіць самавар: скавыча[1] ён на ўсе галасы або пішчыць, як тая свіння ў плоце, аж пара з яго верне. На стале стаіць масла; тут жа ў місцы ляжаць цэлыя кавалкі мяккай і белай булкі, і такая, на яе ліха, цікавая, што Міхалка не можа адарваць ад яе вачэй.

— Чаго ты ўтаропіўся[2], як воўк на парасё?

Міхалка спускае вочкі і бярэцца за гарачую шклянку і тут жа борздзенька адрывае ад яе апечаную руку. Шклянка са звонам куляецца на спадак. Чай, як бы яго чэрці таўханулі, разліваецца па стале і на порткі Міхалку. Міхалка ўсхопліваецца з крэсла і стаіць, расставіўшы рукі.

— Свінюк ты! — чуе ён сярдзіты голас брата.

— У карыце трэба карміць, — дадае братавая.

Згарэў бы ты лепей, гэты чай і гэта булка, якая ўжо цяпер і ў рот не лезе Міхалку.

А калі абыходзіцца без таго ліха, то, выпіўшы шклянку, Міхалка павінен быў падзякаваць. Тут зноў не заўсёды абыходзіцца шчасліва. Замест «благодарю» ляпне Міхалка ні к сялу ні к гораду — «дзякую».

— Што за «дзякую»?!

Міхалка чуе, што вушы яго чырванеюць. Яму неяк сорамна сказаць «благодарю», — здаецца, усе яго на смех падымуць.

Але ўсё гэта было раней. Цяпер ён навучыўся казаць «благодарю» і «благадарыць» і калі трэба і калі не трэба.

---

[1] Скавыча — нібы завывае, жаласна павісквае.

[2] Утаропіцца — уставіцца вачыма на каго-небудзь.

Ды зноў жа, з адным «благодарю» на свеце не пражывеш — яшчэ знойдзецца якое-небудзь ліха. А што гэтае ліха не зводзілася, можна было бачыць хоць бы і з таго, што Міхалка па колькі разоў у дзень стаяў на каленках. То скажаш не так, то ступіш не гэтак, і за ўсё пападала то вушам, то каленям. Дайшло да таго, што Міхалка наракаў на вушы і калені. Няхай бы былі сабе дзірачкі ў галаве, але наліха яшчэ гэтыя храсткі[1]? Або ногі? Ці не лепш было б, каб яны не згіналіся? Тут Міхалка прабаваў хадзіць, не згінаючы ногі. Выходзіць, што можна.

Найгорай было яму вясною і летам, калі сіняе неба ласкава звесіцца над зямлёю, як маці над калыскаю, дзе ляжыць яе любае дзіцятка. А гэтыя хмурынкі! Хто іх ведае, адкуль яны выпаўзаюць і куды ідуць так згодненька, такія мілыя ды прыветныя. От бы ўзяў ды сеў на іх і паплыў бы разам з імі, каб толькі далей быць адгэтуль. Сонейка так харашанька заглядае ў вокны. У садку шчабечуць птушкі. Верабейчыкі з вясёлым чырыканнем снуюць у паветры.

Міхалка доўга пазірае ў акно. Нарэшце ў яго не хапае сілы праціўіцца закліку вясны, і ён, азірнуўшыся, каб не затрымаў хто, ціха выходзіць на двор.

Прытуліўшыся дзе-небудзь каля вугла, доўга стаіць Міхалка. У гэтыя хвіліны ён нічога не думае. Ён толькі чуе, як прыемнае цяпло песціць яго маленькае цельца. І добра так і радасна на сэрцы. А што робіцца на душы, то гэтага і не скажаш. Толькі часамі замігацяцца родныя з'явы далёкай вёскі, дзе Міхалку так вольна жылося. І сэрца неяк ападзе, калі ўспомніць ён сваё тут жыццё. Там, на вуліцы, чуваць, як тупаюць па тратуарах ногі, як грукаюць капытамі па бруку коні, як шуміць і гудзе многагалосы горад.

---

[1] Храсткі — тут: вушы, ракавіны вушэй.

Доўга стаіць так Міхалка. Потым ні з таго ні з сяго захочацца прабегчыся, і ён, як куля, ірванецца на двор, ганяецца за верабейчыкамі, покі братавая не крыкне, каб ішоў забаўляць Лідачку.

Усе чары прападаюць у яго душы, і, уздыхнуўшы, нехаця пляцецца ён у хату. А тут яшчэ горай апануюць думкі, яшчэ мацней пацягне яго на двор, яшчэ з большаю сілаю, яшчэ ярчэй устануць перад вачыма дзіўныя малюнкі роднай вёскі.

Дом, дзе жыў Міхалка, стаяў на краі горада. Глухаватая вуліца, паабапал якой ляпіліся драўляныя домікі, скора выходзіла за горад, у поле. Міхалка не адзін раз выбягаў на гэтую вуліцу і нюхам вясковага чалавека ўгадваў, што недалёка тут павінна быць поле. Раз ён, выбегшы на вуліцу, адышоўся ад дому. Тут ён ужо не мог стрымацца і пабег да таго ўзгорка, што весела пазіраў жоўтым скатам сваіх пяскоў. Міхалка ўзляцеў на гэты ўзгорак.

Унізе рассцілаўся горад з блішчастымі вежамі цэркваў і касцёлаў. То там, то сям высока ў небе тырчэлі трубы фабрык і заводаў, распускаючы па ветры доўгія хвасты чорнага дыму. А з другога боку раскінулася поле, чарнеўся лес і вясёлыя пералескі, а там, яшчэ далей, ледзь-ледзь выступалі з сіняватай смугі стрэхі сялянскіх хат. І так моцна пацягнула Міхалку туды, што аж душа яго млела. І так ярка прыпомнілася яму свая вёска, што каб меў крылы, то ўзняўся б і паляцеў бы. Міхалка ўсё цікаваў у адзін бок. Там, здавалася яму, павінна быць дарога да роднай вёскі. Ах, як там добра ў вёсцы! От Міхалка стаіць на гэтым узгорку, а яна вось-вось, здаецца, тут, перад самымі яго вачыма.

І так ясна, як цяпер, не бачыў ён яе і тады, калі жыў там. Вось высокі касагор над самым Нёманам. Пад гэтым касагорам стаяць над вадою нахіленыя старыя вербы, там калісь так многа было ракаў. Там ляжыць зялёны луг, а

за лугам цягнецца высокі і заўсёды пануры лес. Гэтага лесу Міхалка калісь баяўся. Асабліва нешта страшнае і непрыветнае прыдаваў яму густы алешнік, што зялёным доўгім валам цягнуўся каля самага лесу. Цяпер жа гэты лес быў такі мілы і жаданы, што каб прымеў, то абняў бы яго і цалаваў. Міхалка так задумаўся, што не чуў, як да яго падышоў брат.

— Чаго ты тут, шыбельнік? — спытаў брат і моцна пацягнуў Міхалку за вуха.

Міхалка задрыжаў увесь, як злоўлены злачынец.

— Пайшоў дадому!

Хлопчык, прыклаўшы руку да вуха, якое быццам гарэла на агні, пабег дамоў, не смеючы зірнуць убок.

За самавольства забаранілі яму гуляць на двары. Але Міхалка не абразуміўся. Куды там! Ён задумаў такую рэч, што ўсе дзівіцца будуць. А покі што цішком ён рыхтаваўся споўніць тое, што задумаў. У самы глухі куток пад ложкам, куды нават венік служанкі Насты рэдка калі зазіраў, складаў Міхалка розныя прыпасы на дарогу, бо ён задумаў уцякаць адгэтуль. Тут ён назапасіў з восем кавалачкаў цукру, акрайчык хлеба з асушкам. Праўда, хлябок высахне, але Міхалка знойдзе ў дарозе крынічку і размочыць яго. Усе гэтыя прыпасы ляжалі на газеце, якую Міхалка цішком узяў са стала. Разам з гэтымі прыпасамі ляжаў мячык і чалавек з гумалястыкі, у якога трэба было толькі дзьмухануць, каб ён загукаў, як жывы. Усё гэта Міхалка адкраў ад Лідачкі. Мячык і чалавечка ён дасць сваім сябрам, бо хто ж ідзе з горада без гасцінца? Засталося толькі пашыць торбачку, каб забраць увесь скарб з-пад ложка. А там... Ад адной гэтай думкі лёгка рабілася на сэрцы.

А наўперад ён яшчэ па дарозе зойдзе ў тую вёску, дзе яго брат служыў летась. У гэтай вёсцы Міхалка згубіў многа грошай — капеек пятнаццаць медзякамі. А знайсці іх лёгка,

бо Міхалка, як цяпер, бачыць тое месца, дзе згубіў іх; не знайшоў жа іх тады затым, што хутка перабіраліся ў горад і не было калі пашукаць, як належыць быць.

Доўга не мог заснуць Міхалка ў суботу вечарам, перад Сёмухай: заўтра рана, досвіту, выберацца ён у дарогу. У тых думках, што цяпер мітусіліся ў галаве, цяжка было разабрацца... Э, ды што! Устане і пойдзе: пойдзе перш да таго ўзгорка, адкуль ужо лёгка патрапіць на дарогу... Скарэй бы толькі заснуць ды ўстаць заўтра раней. Міхалка плюшчыў вочы, але сон, як сумыслу, не ішоў да яго. І толькі, можа, пад поўнач заснуў Міхалка. Нягледзячы на гэта, устаў ён ранютка, асцярожна падняў галоўку, агледзеўся, прыслухаўся. Брат і братавая спалі; нават гэтая жаба, Лідачка, і тая не варушылася. Ціхенька адзеўшыся, Міхалка павольненька выцягнуў торбачку, у якую яшчэ звечара злажыў усе свае рэчы. Прыгатаваўшыся як мае быць, ён яшчэ раз азірнуўся і, трасучыся ўвесь, падкраўся да дзвярэй і ўзяўся за ключ. Павярнуў раз і абамлеў: ключ, на яго ліха, так загрымеў, што, напэўна, усе абудзіліся. Са страху Міхалка выпусціў з рук торбачку. Усё было ціха. Відаць, ніхто не чуў. Узяўшы торбачку, Міхалка ціха рыпнуў дзвярыма і выйшаў на двор.

Не ведаю, ці на дабро, ці на няшчасце Міхалкі, вароты на двары былі замкнёны, агароджа ж была такая высокая, дашчаная, што ўляпіцца было недзе. Колькі хвілін Міхалка хадзіў на двары, шукаючы пералаза. І не думаў ён ніколі, што гэтае здарэнне папсуе яму ўсю справу! Можа б, і пералез як, але, на бяду, трэба было якраз выйсці на двор яго брату! Міхалка думаў, што ўжо яму цяпер будзе канец — так моцна лупіў яго брат.

І што ты зробіш, калі не шанцуе? Міхалка, як і наўперад, жыве ў горадзе і толькі тым і цешыць сябе, што тады, напэўна, будзе яму палёгка, як выб’юць з яго «дзеравеншчыну».

## Пытанні і заданні

1. Якія пачуцці выклікала ў вас апавяданне?

2. Ці справядліва адносіліся брат і братавая да Міхалкі? Ці кепскім хлопчыкам быў Міхалка?

3. Якой бачыць родную вёску і прыроду Міхалка?

4. Што хацеў сказаць аўтар, паказваючы, як вабілі хлопчыка вёска, лес, луг, рэчка Нёман?

5. Пра што і пра каго думае Міхалка, збіраючыся ўцякаць з горада, што ён бярэ з сабой у дарогу?

6. Пафантазіруйце наконт далейшага развіцця падзей, калі б у хлопчыка атрымалася пакінуць горад і апынуцца ў такой жаданай для яго вёсцы. Апісваючы далейшыя падзеі, абавязкова ўлічвайце ўсё тое, пра што расказвалася раней. (Тут можна ўявіць сабе, што Міхалка збіўся з дарогі, заблудзіўся ў лесе, там яго застала ноч, ён чуе розныя крыкі звяроў і птушак, напалохаўся, стаіўся, неяк дачакаўся раніцы, потым, нарэшце, знайшоў дарогу або яго знайшлі, перапалоханага і разгубленага, і г. д. Пафантазіруйце!)

7. Сюжэт апавядальнага твора складаецца звычайна з такіх элементаў ці этапаў:

а) **экспазіцыя** (аўтар знаёміць чытача з часам, месцам дзеяння і героямі твора); б) **завязка** (пачатак дзеяння); в) **развіццё дзеяння;** г) **кульмінацыя** (момант найвышэйшага напружання ў развіцці дзеяння); д) **развязка** (чым заканчваецца дзеянне). Якія моманты, эпізоды ці падзеі вы б аднеслі да названых тут элементаў сюжэта? Параздважайце, маючы на ўвазе, што асобныя з гэтых элементаў могуць выяўляцца неабавязкова ў тым парадку, як мы іх пералічылі.

*Янка Маўр*

# ПАЛЕСКІЯ РАБІНЗОНЫ
(Скарочана)

Адважныя падарожнікі. — У моры. —
Крушэнне карабля. — Падарожжа ў вадзе. —
Невядомы бераг. — Падлік маёмасці.

— Кіруй туды, вунь у той лясок! Цікава паездзіць у чоўне па лесе.

Доўгі Мірон сядзеў на кукішках на дне выдзеўбанага чоўна —душагубкі. Калені яго датыркаліся да самага носа; рукамі ён трымаўся за бакі чоўна. Раптам ён падняў рукі, паказаў на лес і нават крыху прыўстаў. Човен захістаўся.

— Ды не хістай! Бачыш, што...

Віктар, які стаяў і кіраваў чоўнам, не паспеў скончыць і паваліўся на дно. Душагубка яшчэ больш захісталася, зачарпнула вады. Абодва хлопцы прыціснуліся да дна і не толькі рухацца, але і дыхаць перасталі. Нарэшце човен супакоіўся; на дне яго плюхалася вада.

— Ну вось, бачыш, што ты зрабіў! — з дакорам сказаў Віктар.— Навошта было ўставаць ды варушыцца? Вычэрпвай цяпер ваду!

— Дык ты ж сам вінаваты, — агрызнуўся Мірон. — Перад кім было фанабэрыцца, што спрытна спраўляешся з гэтай праклятай душагубкай?

— Ну і справіўся б, каб ты сядзеў ціха.

— Я ж і сядзеў, а вось ты забыўся, у якім чэрапе едзеш. Навошта стаяў ва ўвесь рост?

Пры гэтым Мірон прыпадняўся. Зноў захістаўся човен.

— Зноў устаеш?! — грозна крыкнуў Віктар. — Калі хочаш тапіцца, дык лезь у ваду сам адзін, а я яшчэ пачакаю.

Мірон крыху засаромеўся.

— Ну-ну, — адказаў ён лагодна. — Давай лепш вычарпаем ваду.

— А чым будзеш вычэрпваць? Чарпак узяў?

— А ты ўзяў?

— Ды хто ж ведаў, што гэтая калода будзе цячы.

— Цячы не пацякла, а зверху, бачыш, налілося.

Хлопцы нерухома сядзелі адзін супраць аднаго, нібы буслы ў гняздзе, і пазіралі то на дно лодкі, дзе было пальцы на чатыры вады, то адзін аднаму ў вочы.

Човен, які і без таго мала высоўваўся з вады, цяпер яшчэ больш апусціўся. І яшчэ больш небяспечным быў кожны рух.

А навакол разляглося неабсяжнае каламутнае мора. Далёка ззаду ледзь віднеўся бераг, ад якога яны ехалі, а наперадзе, яшчэ далей, паўставаў той лес, на які хацеў паглядзець Мірон. Да лесу гэтага было яшчэ далёка, але затое ехаць туды было цікавей. Улетку тут канчалася возера і пачыналася непраходнае балота, якое цяпер было заліта вадой. Гэтай вадзе не відаць было канца-краю, апрача той палоскі лесу на даляглядзе. І на ўсёй гэтай прасторы то там, то там вытыркаліся з вады верхавіны дрэў і кустоў — то паасобку, то групамі.

Надвор'е было ціхае, цёплае. Веснавое сонца грэла ўжо як след. Дрэвы зелянеліся. То была ўжо другая паводка на Палессі ў гэтым годзе. Першы раз адбылася яна з месяц назад, з крыгамі, замаразкамі. Пасля таго тыдні са два трымалася сапраўдная, цёплая вясна. Вада амаль сышла, але потым зноў пачаліся дажджы і снег. Ужо тыдзень, як скончылася і гэтая непагадзь. У іншых месцах прыступілі ўжо да ворыва, сяўбы, а ў гэтай нізіне ўсё яшчэ збіралася вада з далёкіх аколіц, асабліва з поўначы.

У такі час і трапілі сюды гэтыя два хлопцы. Яны былі аднагодкі і мелі абодва разам гадоў трыццаць пяць. Але выгляд, а таксама і характары іх былі зусім адметныя. Мірон быў худы, цыбаты дзяцюк, з блакітнымі вачыма, доўгім птушыным носам і доўгімі светлымі валасамі. Віктар, наадварот, — прысадзісты, карчасты, чарнявы, з круглым пляскатым тварам.

Мірон быў больш разважлівы, спакойны хлопец, а Віктар — жвавы, імклівы. Яны заўжды спрачаліся паміж сабою, але былі найлепшымі сябрамі і жыць не маглі адзін без аднаго.

Абодва вучыліся ў тэхнікуме ў адным з акруговых гарадоў Беларусі і былі самымі стараннымі ўдзельнікамі краязнаўчага гуртка. Можа, таму яны так і цікавіліся краязнаўствам, што нарадзіліся ў горадзе і ўвесь свой век пражылі ў ім.

З маленства яны былі суседзямі і таварышамі, таксама як і іхнія бацькі. Бацька Мірона працаваў у млыне, а Віктара — на шкляной гуце.

Прыроду, лес, вёску хлопцы ведалі толькі з тых экскурсій, якія рабілі, калі вучыліся ў сямігодцы. Далей як за дзесяць кіламетраў ад горада ім ніколі не даводзілася быць.

Вучыліся абодва добра, чыталі шмат кніжак, асабліва прыгодніцкіх — Жуля Верна, Майна Рыда, Купера і г. д. Цікавілі іх розныя далёкія краіны, дзікуны, індзейцы, якіх цяпер бадай ужо зусім няма. Захапляліся рознымі прыгодамі з іх жыцця, што адбываліся гадоў 60—80 назад. Марылі пра пальмы, джунглі, а не бачылі добрай пушчы, якая была за некалькі дзесяткаў кіламетраў ад іх. Уяўлялі сабе розныя паляванні на тыграў, сланоў, ільвоў, а вавёркі на волі не бачылі. Марылі пра мора, караблі, а не бачылі вялікага возера, якое ляжала за кіламетраў дваццаць ад іх.

У краязнаўчым гуртку яны даведаліся, што на Беларусі наогул, а ў іх раёне асабліва, ёсць шмат куткоў, не гор-

шых ад заморскіх. Ёсць пушчы, не менш цікавыя, чымся далёкія трапічныя лясы. Ёсць азёры і балоты, якія ўвесну робяцца морамі. Ёсць звяры, якія радзей сустракаюцца на свеце, чым сланы і тыгры.

Паступова выявілася, што Мірон цікавіўся больш батанікай, а Віктар — заалогіяй. Чытаючы кнігі, кожны з іх галоўную ўвагу звяртаў на сваю галіну навукі. У жывым кутку Віктар важдаўся з трусамі, мышамі, жабамі, а Мірон — з рознымі раслінамі. Паступова кожны з іх досыць сур'ёзна азнаёміўся са сваім любімым прадметам.

Калі прыйшла вясна і дзесяцідзённыя канікулы, хлопцам вельмі захацелася зрабіць вылазку за горад, куды-небудзь падалей, на некалькі дзён, пабачыць славутае палескае разводдзе. Такая вылазка ім здавалася цікавейшай, чым арганізаваная экскурсія ўлетку.

— Там усё ідзе па раскладзе, як заняткі ў класе, — казалі яны. — Загадзя ведаеш, дзе калі будзеш і што цябе там чакае. Не можаш пайсці, куды захочаш, спыніцца, дзе сам хочаш, рабіць, што табе падабаецца. Такія падарожнікі ў дарозе адчуваюць сябе як дома, не ведаюць незвычайных прыгодаў і небяспекі. Якое ж гэта падарожжа?!

Калі яны сказалі аб сваім плане некаторым з таварышаў, дык тыя паднялі іх на смех:

— Ну і выдумалі! Якая карысць ад такога падарожжа, які сэнс?

— Нічога вы не разумееце! — пакрыўдзіліся сябры і больш ужо ні з кім не распачыналі гаворкі на гэтую тэму. Але цвёрда пастанавілі выканаць свой намер чаго б гэта ні каштавала, каб даказаць усім, што незвычайнае падарожжа цікавей, чым звычайнае.

І вось нашы падарожнікі апынуліся ў чоўне сярод бязмежнага мора. І пакуль што былі задаволены.

— Давай вычарпаем ваду шапкамі, — прапанаваў Мірон.

— Ды нічога іншага не застаецца,

— згадзіўся Віктар.— Толькі баюся, што ты пачнеш варочацца, як мядзведзь, і перакуліш лодку.

— А я баюся, каб яна не перакулілася ад руху твайго языка, — спакойна сказаў Мірон і, зняўшы шапку, пачаў вычэрпваць ваду.

Зараз жа далучыўся Віктар, і вада хутка была вычарпана. Можна было ехаць далей.

— А да таго лесу, мусіць, далёка, — прамовіў Мірон.

— А што, можа, спалохаўся? Можа, назад хочаш ехаць? — упікнуў Віктар.

— Каб толькі ты не спалохаўся, — насмешліва адказаў Мірон.

— Ну, гэтага, брат, не дачакаешся! — свіснуў Віктар.— Першы раз па моры еду.

— Толькі карабель наш псуе падарожжа, — уздыхнуў Мірон.

— А ты сядзі спакойна, і ўсё будзе добра, — сказаў Віктар і ўзяўся за вясло.

— Ды навошта ты зноў становішся? — крыкнуў Мірон. — Дай лепш буду я, а ты адпачні.

— Паглядзім, — усміхнуўся Віктар і аддаў вясло.

Мірон асцярожна, але цвёрда прыладзіўся на каленях і пачаў веславаць.

— Ну, і якая ж розніца? — засмяяўся Віктар. — Ты на каленях стаіш нават вышэй, як я на нагах.

— Розніца ёсць, — сур'ёзна адказаў Мірон. — Цэнтр цяжару ніжэй, калі памятаеш фізіку.

— Наўрад ці сам ты ведаеш, дзе ў цябе цэнтр цяжару, — незадаволена буркнуў Віктар.

Асцярожна, мерна і моцна гроб Мірон, і човен пасоўваўся досыць шпарка. Вось наблізіліся першыя кусты, ча-

сам сухі чаротнік вытыркаўся з-пад вады: значыцца, скончылася возера і пачаўся бераг. Але праз некаторы час зноў выехалі ў другое, меншае возера.

— Бач, як яно тут — па некалькі азёраў ідзе, — заўважыў Віктар.

— Гэта яшчэ невядома. А можа, гэта толькі балота? Хто яго цяпер разбярэ? — сказаў Мірон.

Нейкі белаваты струмень, нібы рака, перасек ім дарогу і пачаў адносіць човен убок. Мірон упарта стаў з ім змагацца.

— Сцеражыся! — раптам крыкнуў Віктар.

На іх нёсся вялізны, рагаты корч. Сутычка была немінучая: праскочыць з такім нязграбным чоўнам было ўжо нельга.

— Кладзіся! — крыкнуў Мірон і сам прыціснуўся да дна. Потым працягнуў наперад вясло, упёрся ў корч і паступова пачаў паслабляць руку, каб зменшыць штуршок. Корч не стукнуўся аб човен, але затое яны сашчапіліся і далей паплылі ўжо абодва разам.

— Вось прынесла яго ліха на нашу галаву! — злаваў Віктар. — Як жа цяпер ад яго адчапіцца?

— Пачакай, не гарачыся толькі, адчэпімся, — спакойна сказаў Мірон і паступова, павольна вызваліў човен.

Мінулі азярцо, зноў пайшлі кусты. Часам яны здаваліся астравамі, а калі човен пад'язджаў бліжэй, то мог праехаць праз іх проста па вадзе. Трапляліся і больш вялікія дрэвы: бярэзінкі, алешыны, нават елкі.

Наперадзе, ужо недалёка, вызначаўся густы, сіні бор.

— А ён, здаецца, стаіць высока, на сухім месцы, — сказаў Віктар і ціхенька ўстаў, каб паглядзець. — Хочацца ногі выпрастаць, здранцвелі зусім.

— Ды пачакай ты, не ўставай, зараз прыедзем, — сказаў Мірон, але і сам не ўтрымаўся, прыпыніўся і пачаў прыглядацца.

— Здаецца, там нібы пясчаны ўзгорак відаць, — прамовіў ён, гледзячы з-пад рукі.

А човен тым часам наехаў на вір. Не паспелі хлопцы звярнуць на яго ўвагу, як ён панёс іх убок і стукнуўся аб альховае дрэва. Штуршок быў невялікі, і нічога б не здарылася, каб абодва хлопцы сядзелі на дне. А цяпер — Віктар адразу паляцеў у ваду, пад алешыну.

— У-ух! — крыкнуў ён не то ад жаху, не то ад неспадзеўкі, не то ад холаду. Мусіць, ад усяго разам.

А човен ад яго руху так захістаўся ды закруціўся, што Мірон ледзь уседзеў, ухапіўшыся рукамі за бакі яго. Але пры гэтым ён выпусціў з рук вясло. Струмень падхапіў бездапаможны човен і панёс яго далей, да другой алешыны. Падплываючы да яе, Мірон перахіліўся цераз борт і ўчапіўся рукамі за галіну. Тут ён адчуў, што човен нібы выслізгвае з-пад яго. Трымаючыся за галіну бадай што над вадой, Мірон стараўся падцягнуць да сябе човен нагамі, але скончылася гэтая справа тым, што галіна абламалася, хлопец паляцеў у ваду дагары нагамі, а човен, атрымаўшы апошні штуршок і паварочваючыся ў розныя бакі, жвава панёсся наперад. Пакуль Мірон зноў учапіўся за дрэва ды агледзеўся, човен быў ужо так далёка, што дагнаць яго не было ніякай магчымасці, тым больш чалавеку адзетаму і абутаму.

Усё гэта адбылося так хутка, што Віктар, які таксама выбіраўся з вады і ўзлазіў на дрэва, нават не заўважыў, што робіцца за яго спінай, тым больш што Мірон за ўвесь гэты час не падаў аніводнага гуку.

Азірнуўся Віктар — ні чоўна, ні Мірона няма! Што за дзіва такое?

— Міро-о-он! — гукнуў ён.

— Ну! — адгукнулася зусім блізка.

— Дзе ты?

— Тут!

Глянуў Віктар — і вачам сваім не верыць.

— А дзе ж човен?

— Не ведаю.

— Як жа так?

— Ды так. Паплыў.

— Што ж гэта такое? — у роспачы крыкнуў Віктар.

— Прыгода, — спакойна азваўся Мірон са свайго дрэва.

— Што ж ты нарабіў?

— А можа, гэта ты нарабіў?

— Ты ж у чоўне застаўся!

— Хацеў бы я паглядзець, як ты застаўся б, каб цябе так штурханулі, — адказаў Мірон.

Так спрачаліся яны, пакуль не прайшло першае ўражанне ад няшчасця. Ніхто нікога сур'ёзна не вінаваціў, ды і карысці ніякай ад гэтага не было б, але ж трэба было па прывычцы аднаму аднаго папікнуць. І толькі пасля таго сталі яны абмяркоўваць, як выйсці са становішча.

А становішча было такое, што ім нікуды нельга было падацца, апрача таго лесу, што віднеўся наперадзе за кіламетр ці трохі болей. Невядома, ці здолелі б хлопцы праплысці такую адлегласць у адзежы ў сцюдзёнай вадзе, каб гэта была рака ці возера. А на залітым вадою балоце яны мелі шмат «станцый» для адпачынку — дрэвы, кусты і проста неглыбокія мясціны.

Было каля поўдня. Неаглядная водная прастора іскрылася на сонцы. З захаду ледзь дыхаў цёплы ветрык. Вада ціхенька плюхалася каля дрэў. Уверсе са свістам праляцелі дзве качкі. Сонца прыемна саграваламокрае адзенне хлопцаў. Настрой у іх палепшыўся, асабліва ў Віктара. Ён нават пачаў жартаваць:

— Калі-небудзь, можа, будзем дзякаваць, што так здарылася. Тут табе і мора, і аварыя карабля, і таемны

востраў, а там сустрэнуцца дзікуны, бегемоты, кракадзілы, тыгры...

— Невялікае шчасце сустрэць тыгра з голымі рукамі, — сказаў Мірон.

— А ты хочаш, каб табе ўсё гатовае было? Тады лепш было сядзець дома.

Я і згадзіўся б цяпер лепш сядзець дома. Можа, каб апісаць усё гэта ў кніжцы, дык які-небудзь дурны хлопец і захацеў бы быць на нашым месцы. А я наперадзе не чакаю нічога добрага.

— Эх ты! — з пагардай сказаў Віктар. — Што будзе з цябе далей, калі ты ўжо цяпер раскіс?

Мірон усміхнуўся.

— Прадбачыць — гэта не значыць раскіснуць. Паглядзім яшчэ, хто будзе больш трывалы. Але час ужо ў дарогу. Эх, не хочацца зноў лезці ў сцюдзёную ваду!

— Пачакай, можа, варта яшчэ пашукаць нашага чоўна? Можа, ён зачапіўся дзе? — сказаў Віктар. — Маё дрэва вышэйшае, я з яго пагляджу.

— Дзе там! — безнадзейна махнуў рукой Мірон. — Гэтая гладкая калода нават не мае чым зачапіцца. Ды і вір круціць тут ва ўсе бакі.

— Так яно і ёсць! — сказаў Віктар, калі зірнуў зверху. — Вунь ён ужо выходзіць у возера. Нічога не зробіш, прыйдзецца плысці.

І хлопцы пусціліся ў далейшую дарогу.

Вельмі хутка яны пераканаліся, што плысці ў адзенні — гэта вялікая пакута. Мокрае адзенне і рухацца перашкаджала, і ўніз цягнула. Спачатку хлопцы маглі праплысці без адпачынку якую сотню метраў, а потым усё менш і менш. Справа ўскладнялася яшчэ тым, што «станцыі» размяшчаліся зусім не так, як хацелася б. Дрэвы траплялiся вельмі рэдка, і не заўсёды былі яны

па дарозе. Часта прыходзілася адпачываць проста ў вадзе, трымаючыся за верхавіны кустоў. А тады цела яшчэ больш дубянела ад холаду. Таму, калі сустракалася дрэва, на якое можна было ўзлезці, то хлопцы больш радаваліся магчымасці пагрэцца на сонцы, чым адпачынку. А кракадзілы і тыгры больш ужо не прыходзілі ў галаву — не да таго было.

Метраў за трыста ад берага хлопцы адчулі пад нагамі зямлю. Калі сталі, то вада даходзіла ім да грудзей. Радасць была надзвычайная. Але зноў бяда: дно аказалася такое дрыгвяное, што ісці па ім не было ніякай магчымасці.

— Ведаеш што? — сказаў тады Віктар. — Давай скарыстаем закон Архімеда.

— Якім чынам? — здзівіўся Мірон ад нечаканасці.

— Калі мы апусцімся ў ваду па шыю, то зробімся лягчэйшымі на столькі, колькі важыць выціснутая намі вада.

— Так.

— Значыцца, мы не будзем загразаць у балоце і пойдзем сабе ўпрысядку, як па шасэ. Вось паспрабуй.

Апусціліся ў ваду — сапраўды ногі не загразаюць. Але як толькі пасунуліся наперад — пачалі загразаць нават горш, чым раней.

— Вось табе і Архімед! — з прыкрасцю сказаў Віктар.

— Не Архімед вінаваты, а мы самі, — разважліва прамовіў Мірон. — Мы не ўлічылі, што, рухаючыся, павінны пераадольваць супраціўленне вады, а для гэтага вымушаны моцна ўпірацца ў дно.

Такім чынам, хлопцам прыйшлося плысці нават па неглыбокім месцы. Толькі што можна было часцей адпачываць, стоячы на купінках, ды грэцца на сонцы.

Нарэшце яны наблізіліся да берага на такую адлегласць, што рукі пачалі даставаць зямлю. Але стаць усё роўна было немагчыма — зараз жа ногі правальваліся ў багну.

— Што ж цяпер рабіць? — разважаў Віктар, калі прыпыніўся апошні раз на кусце. — Ні плысці, ні ісці нельга.

— Значыцца, трэба паўзці на руках, — сказаў Мірон, выпрастаўся нерухома на вадзе і лёгка паплыў, перабіраючы рукамі па зямлі. За ім пусціўся Віктар.

— Ну як? Цяпер Архімед дапамагае? — спытаў Мірон.

Каб выправіць сваю папярэднюю памылку і паказаць, што ён не горш за Мірона разумее гэтае пытанне, Віктар паспяшаўся даць тлумачэнне:

— Цяпер у нас супраціўленне вады зусім невялікае і нам не трэба моцна ўпірацца рукамі.

Усё ішло добра, пакуль цела трымалася ў вадзе. А калі яны падплылі да берага метраў на пяцьдзеят ды «селі на мель», тады ўжо ніякім спосабам нельга было рухацца далей. Немагчыма было ні абаперціся рукамі, ні стаць на ногі — ад кожнага руху хлопцы яшчэ больш загразалі ў балоце. Хоць ты назад вяртайся!

Яны чапляліся за кожную ламачыну, за леташні чаротнік, каб толькі знайсці сабе апору. Паступова яны набралі ў рукі па цэлай вязанцы сухога чаротніку і галля, а затым Віктар выступіў з канкрэтнай прапановай:

— Калі мы не можам паўзці, абапіраючыся на рукі, то паспрабуем паўзці, абапіраючыся на вязанкі, вось так...

Моцна трымаючы дзвюма рукамі вязанку, ён закінуў яе наперад, а потым падцягнуўся да яе ўсім целам. Першы крок быў зроблены. А за ім пайшлі далейшыя крокі, цяжкія, марудныя, але кожны з іх крыху набліжаў жаданую сушу.

Выбраліся на бераг ледзь жывыя, аблепленыя тванню, дрыжачыя ад холаду. На шчасце, бераг выдаўся вельмі ўтульны. Досыць высокі, сухі, ён глядзеў на поўдзень і добра награваўся праменнямі сонца. Пад ахоўвай векавых хвой тут не адчувалася ні малейшага ветрыку; ад нагрэтай зямлі патыхала цеплынёй, як у добры летні дзень. Асаблі-

ва вабілі да сябе пляміны чыстага белага пяску. На яго і паваліліся нашы падарожнікі.

— А тут было б зусім нядрэнна, калі б... — пачаў Віктар млявым голасам.

— Калі б не гэтае «калі б», было б сапраўды добра, — згадзіўся Мірон. — Але калі мы засохнем у такім стане, то будзе яшчэ горш — мы зробімся муміямі.

— Для цябе гэта асабліва небяспечна, бо ты тады зломішся, — засмяяўся Віктар.

— Ды і табе не лепш будзе, — адказаў Мірон. — Трэба змыць гэтую гразь.

Але так не хацелася ўставаць, распранацца. Цішыня, стома, цеплыня хілілі да сну. Праз некалькі хвілін Мірон зноў сказаў:

— Трэба памыць і высушыць адзенне, пакуль сонца грэе.

— Трэба, — пацвердзіў Віктар.

І абодва засталіся ляжаць нерухома. Праз некаторы час Віктар сказаў:

— Нічога не зробіш, трэба ўставаць.

— Трэба,— пацвердзіў Мірон.

І зноў абодва засталіся ляжаць. Зноў прайшло некалькі часу. Тады Мірон рашуча сказаў:

— Так нічога не выйдзе. Давай па камандзе: р-раз!

— Два! — падхапіў Віктар.

А «тры» не сказаў ні той, ні другі — так хацелася яшчэ хвіліначку паляжаць. Многа яшчэ прайшло такіх хвіліначак, пакуль нарэшце, бадай, абодва разам крыкнулі «тры», усхапіліся на ногі і пачалі распранацца.

Адзежы ўсёй разам было: дзве пары бялізны, двое штаноў, дзве верхнія кашулі, пара ботаў (Міронавы), пара чаравікаў (Віктаравы), скураная куртка (Віктарава), суконная світка (Міронава), пара рваных шкарпэтак (Віктаравы), пара ануч (Міронавы) і дзве шапкі.

Пэратрэслі кішэні і падлічылі ўсю сваю маёмасць наогул.

Віктар перш за ўсё ўхапіўся за свой табак. Зверху махорка зрабілася на кашу, а ад паперы нічога не засталося.

— Эх, шкада дабра! — уздыхнуў ён і асцярожна пачаў выцягваць сваё багацце і раскладаць яго на зямлі. — Дзе яго цяпер возьмеш?

— І добра! — сказаў Мірон. — Прынамсі, курыць адвыкнеш.

— Ну не, брат! Я лепш есці адвыкну.

— Цяпер для мяне гэта было б вельмі дарэчы, — спакойна прамовіў Мірон і выцягнуў з кішэні мокрую скарынку хлеба.

— Хлеб?! — падскочыў Віктар.

— Ціха, ціха! Ты ж толькі што казаў, што можаш не есці, абы махорка была. Выбірай — або хлеб, або махорка.

— Тады ліха з табой, не трэба, — пакрыўдзіўся Віктар.

Мірон таксама старанна палажыў сушыцца свой хлеб і нават сабраў усе крошкі.

Калі вытраслі ўсе свае кішэні, то ў абодвух насы апусціліся яшчэ ніжэй. Агульная маёмасць была: махорка, скарынка хлеба, аловак, адна на-савая хустачка, восем рублёў семдзесят чатыры капейкі грошай і чатыры мокрыя запалкі ў расплясканым мокрым карабку.

— Нават запалак не маеш! — упікнуў Мірон. — Адзін выпадак трапіўся ў гісторыі чалавецтва, калі курэц мог быць карысным для грамадства, ды і то...

— Запалак я меў досыць, але яны з усімі іншымі рэчамі былі ў торбе, якую ты пусціў па вадзе, — агрызнуўся Віктар. — А вось у цябе нават ножыка няма.

— Дык і ён жа застаўся ў маёй торбе, — панура адказаў Мірон.

Але спрачацца не было часу. Яны знайшлі клін чыстай вады, выпаласкалі ўсё сваё адзенне і ў чатыры рукі выкру-

цілі так, што ў ім, здаецца, не толькі вады, але і жывой мясціны не павінна было застацца. Развесілі на сонцы, а самі селі ў пяску пад карэннямі вялікай хвоі. Скардзіцца на холад яшчэ нельга было, але сонца няўхільна апускалася, а адзежа сохла марудна. Беражна расклалі на сонцы і ўсю іншую маёмасць, асабліва запалкі.

— А табе не даводзілася ўжываць высушаныя запалкі? — пытаўся Мірон. — Ці гараць яны?

— Не даводзілася.

— Вось бачыш: такая простая рэч, а ты не ведаеш.

— А ты?

— Дык я ж не куру.

— Гэта ж не толькі для курэння патрэбна. Эх ты! — паківаў галавой Віктар. — Разважаць толькі любіш.

Віктар увесь час скоса пазіраў на хлеб. Не цярпелася і Мірону. Узяў ён вільготны кавалак, разламаў напалам, працягнуў Віктару. З'елі гэты кавалак і яшчэ больш захацелі есці.

— Каб ведаў, лепш бы зусім не еў, — бурчаў Віктар.

— Прывыкай, браток, не тое яшчэ будзе, — суцешыў Мірон.

— Хоць бы закурыць, — прамовіў Віктар, гледзячы на сваю махорку.

— Добра і так, — сказаў Мірон.

Дагэтуль яны неяк не мелі часу падумаць пра свой далейшы лёс: кожную хвіліну перад імі стаяла бліжэйшая непасрэдная справа. Цяпер жа, калі сядзелі галышом пад дрэвам і чакалі, пакуль высахне адзежа, яны маглі больш падумаць пра заўтрашні дзень.

— А што, калі нам некалькі дзён давядзецца валэндацца тут, пакуль выберамся? — разважаў Віктар.

— О, гэта было б вялікім шчасцем! — прамовіў Мірон.

— Дзякую за гэткае шчасце! — чмыхнуў Віктар. — А есці што будзеш? Можа, яшчэ з голаду зойдзешся.

— Вось таму я і лічу за шчасце пабадзяцца некалькі дзён, а не тыдняў ці месяцаў, — панура сказаў Мірон.

— Можа, скажаш яшчэ — стагоддзяў, — усміхнуўся Віктар.

— І гэта можа быць, — сур'ёзна адказаў Мірон. — Нашы косці могуць знайсці і праз некалькі стагоддзяў!

— Эх ты, нуда хадзячая! — скрывіўся Віктар. — Табе на печы б сядзець, а не пускацца ў падарожжа. Чуў я шмат разоў, як людзі блудзілі па лясах, але не чуў аніводнага разу, каб у нашых лясах гэтак хто-небудзь загінуў. Гэта табе не бразільскія лясы, не афрыканскія пушчы.

— Чаго ты пнешся? Магу цябе запэўніць, што я таксама не вельмі прагну тут загінуць, — апраўдваўся Мірон.

— Ну, дык няма чаго рыхтавацца да смерці! — адрэзаў Віктар.

Хоць сонца яшчэ свяціла, але ўжо не грэла. Доўгія цені пастулова пакрывалі светлыя мясціны. Хлопцы адчулі холад.

— Нічога не зробіш, прыйдзецца надзяваць сырую адзежу, — уздыхнуў Мірон.

— Дармо! Дасохне на целе, — бадзёрыўся Віктар.

Калі яны адзеліся, Віктар неяк нерашуча сказаў:

— Можа, пойдзем далей?

— Куды ты цяпер пойдзеш? — адказаў Мірон. — Нават па знаёмай дарозе рызыкоўна пускацца ў такі час. А гэтак мы напэўна праблытаемся ўсю ноч дарэмна. Наўрад ці блізка ў гэтых месцах ёсць паселішча. Якім бы ні было чынам, а прыйдзецца тут начаваць.

За ўвесь сённяшні дзень гэта было адзінае пытанне, па якім не адбылося спрэчак паміж таварышамі. Пачалі рыхтавацца да начлегу. Зрабілі сабе логава ў сухім пяску між карэнняў, падгарнулі сухога лісця і шыльніку.

Нарэшце надышоў самы вялікі, урачысты і адказны момант — здабыванне агню. Сэрцы ў хлопцаў застукалі мацней, рукі дрыжалі. Мусіць, з такім самым пачуццём тысячагоддзі назад у якім-небудзь першабытным храме людзі прыступалі да здабывання свяшчэннага агню.

— Ці высахлі яны?

Памацалі з усіх бакоў — здаецца, высахлі. Чыркнуў Віктар раз, другі — нічога... Толькі белы след застаўся на карабку.

— Мусіць, не досыць высахлі, — сумна сказаў Мірон. — Болей псаваць не варта.

— Мая кашуля ўжо высахла, я палажу іх пад паху, — сказаў Віктар.

А пакуль што прытуліліся ў сваім логаве без агню.

## II

Першая ноч. — Начная дужанка. —
Заяц, які дзюбаецца. — Апошнія запалкі. — Дадому.

Сонца ўжо зайшло, але яшчэ цэлую гадзіну трымаўся шэры змрок. Над возерам са свістам праляталі качкі, спяшаліся на начлег. Уверсе пачуўся жураўліны крык. Вось ён мацнее, робіцца больш выразным: відаць, жураўлі спускаюцца на адпачынак.

— Вось добра было б, каб які-небудзь журавель ці гусь сеў нам на галаву! — прамовіў Віктар.

— Што б ты з ім рабіў без агню? — уздыхнуў Мірон.

— З'еў бы сырога.

Мірон перавярнуўся на спіну, зірнуў на зоркі. Яны так прыгожа зіхацелі! Ласкава шапталіся верхавіны дрэў. Мусіць, дома цешацца цяпер добрым веснавым надвор'ем, а яны...

— Вось да чаго даводзіць свавольства! — нібы сам да сябе прамовіў Мірон. — Каб мы папрасілі човен у гаспада-

ра, дык цяпер людзі ведалі б, дзе мы, і прыехалі б па нас. А так нават калі і знойдуць дзе човен, то не будуць ведаць, якім чынам ён там апынуўся. Паслухаўся цябе...

— Ну-ну, няма чаго наракаць, — незадаволена забурчаў Віктар. — Ніхто цябе не прымушаў. Калі ты такая цаца, дык не трэба было згаджацца. А ісці за паўкіламетра шукаць гаспадара і ў цябе самога не было ахвоты. З'есці збіраліся мы гэтую душагубку, ці што? Каб не такі выпадак, вярнулі б на месца — і ўсё.

Мірон змоўк. Усё роўна справы не паправіш. А спадзявацца на дапамогу няма чаго. Ніхто іх тут не ведае. Калі і бачыў хто, што паплылі недзе нейкія два хлопцы, то нікому не прыйдзе ў галаву пацікавіцца, дзе яны дзеліся. Прыйдзецца самім шукаць дарогі.

Паветра рабілася ўсё больш сырым і халодным. Добра яшчэ, што ветру не было. Крыху дапамагала таксама тое, што, шчыльна прытуліўшыся, яны маглі грэць адзін аднаго.

Час цягнуўся марудна. Голад і холад не давалі заснуць. Хлопцы вымушаны былі варочацца з боку на бок.

Задрамалі, але хутка так змерзлі, што пачалі ляскаць зубамі. Было, мусіць, пасля поўначы. Віктар не вытрымаў і ўскочыў.

— Гэй, уставай! — штурхануў ён Мірона.

— А? Чаго?..

— Выклікаю цябе на спаборніцтва!

— А? Што?..

— Уставай дужацца!

— Што? Чаго? — мармытаў Мірон. — Не лезь!

Але Віктар ухапіў Мірона за ногі і павалок па зямлі. Мірон не толькі ачухаўся, але раззлаваўся.

— Ты чаго лезеш? — закрычаў ён. — Чаго спаць не даеш? Я цябе зараз...

— Ціха, ціха! — сказаў Віктар. — Я цябе не біцца выклікаю, а дужацца. Дужацца, каб сагрэцца. Разумееш?

— А!..

І сярод начной цішы пачалася дужанка... Віктару хутка ўдалося паваліць Мірона. Той пакрыўдзіўся:

— Пачакай! Пачакай! Ты ж не даў мне добра ўзяцца, адразу накінуўся. Давай яшчэ раз, вось так. Пагледзімо, як цяпер...

І дужанка зноў пачалася, ды яшчэ як заўзята!..

Змарыліся, паляглі. Паспалі крыху і зноў пачалі варушыцца. Раптам недзе побач пачуўся дзікі, прарэзлівы крык. Крык жудасны і разам з тым нейкі жаласны, нібы хто душыць малое дзіцяня...

Жах ахапіў хлопцаў. Мімаволі яны шчыльней зашыліся між каранёў.

Крык не спыняўся, і нават непадалёк, у кустах, чулася нейкая тузаніна.

Тут ускочыў Віктар і кінуўся ў кусты.

— Мірон! Сюды хутчэй! — зараз жа пачуўся яго крык.

Спачатку Мірон зазлаваў на Віктара, чаму гэта ён кінуўся ў бяду, але ў той жа момант сам апынуўся каля Віктара. Той нешта трымаў, і гэтае нешта білася і вырывалася.

— Трымай! Хутчэй! — зноў крыкнуў Віктар.

Мірон учапіўся рукою за поўсць нейкага звера.

— Што гэта за звер такі? — здзівіўся ён.

— Трымай, трымай мацней! Заяц! — засопшыся, казаў Віктар.

Мірон учапіўся абедзвюма рукамі за зайца, але зараз жа адну руку адхапіў, бо нехта моцна ў яе дзюбануў.

— Ай, ай, заяц дзюбаецца! — крыкнуў ён з жахам.

— Трымай мацней! А то ўцячэ! — тузаўся тым часам Віктар.

Мірон зноў ухапіўся дзвюма рукамі.

— Што гэта робіцца? — крыкнуў ён. — Ніколі не чуў, каб заяц дзюбаўся!

— Я ж пугача трымаю! Гэта ён. Трымай зайца, а я гэтаму лупатаму зараз галаву раструшчу.

І ён стукнуў птушку галавой аб дрэва. Потым гэтак жа забілі і зайца.

— Адкуль ты ведаў, што там дзеецца? — запытаўся Мірон, калі яны са здабычай вярнуліся на сваё месца.

— Жаласны піск паказваў, што гэта нейкі невялікі звярок трапіў у бяду. Тузаніна ў кустах сведчыла, што і вораг яго не надта моцны, калі яны так доўга тузаюцца. Потым пачулася нібы плясканне крылаў, і тады мне прыйшла ў галаву думка, што гэта, мусіць, якая сава напала на зайца, як гэта часта пішацца ў кнігах. Але ж і запусціла кіпцюры ў спіну! Сама хацела вырвацца, ды не магла, таму і ўдалося схапіць. А цяпер паспрабуем запалкі, можа, ужо будуць гарэць.

Тыцнуўся Віктар туды-сюды, а запалак няма.

— Згубіў у час тузаніны, — прамовіў ён у роспачы. Хацеў быў накінуцца на яго Мірон, але раздумаў.

— Знойдзеш заўтра,— сказаў ён лагодна. — Ды, мусіць, і страта невялікая, бо, відаць, усё роўна з іх толку не было б.

— А есці хочацца... — неяк жаласна сказаў Віктар.

— Ты ж казаў, што мог бы есці сырое. Вось і еш.

— Ну, ну! Лёгка казаць. Але ўсё ж такі, што мы будзем рабіць заўтра?

— Заўтра і будзем меркаваць,— сказаў Мірон і лёг у сваё логава.— А цяпер будзем спаць. Вось палажы сабе з другога боку зайца — хай грэе, а я палажу пугача.

Нарэшце дзённыя і начныя турботы змарылі хлопцаў, і яны заснулі так моцна, што, мусіць, цяпер іх не разбудзіў бы ні гром, ні мароз. А калі яшчэ паднялося сонца ды пры-

грэла іх, то яны праспалі аж да поўдня. Прачнуліся, селі, азіраюцца.

— Учора гэтай парой як пад'еў... — пачаў быў Віктар.

— Давай нашы пашукаем запалкі, — перапыніў яго Мірон. — Тады і пад'ясі.

Расплюснуты карабок з дзвюма запалкамі знайшлі хутка. З хваляваннем чыркнулі — запалка засіпела, і больш нічога. А другая нават і не засіпела...

— Ну і ліха з імі! — раззлаваўся Віктар і ўскінуў на спіну зайца. — Хадзем лепш дахаты.

— А што рабіць з гэтай дурной савой?

— Вядома, браць. Гэта ж добры ўлоў. Зробім чучала і паставім у нашым прыродазнаўчым музеі з надпісам: «Злоўлены ў Палескай пушчы героямі-падарожнікамі і даследчыкамі Міронам Бажком і Віктарам Калягай уласнымі рукамі, без ніякай зброі». Нават і зайца я згодзен ахвяраваць для навукі і славы.

І яны пайшлі ўздоўж возера ў той бок, дзе павінен быў знаходзіцца іх дом.

## III

«Па-а марам!» — Усё направа ды направа. —
Зайцаў абед. — Зноў на тым самым месцы.

Шпарка ішлі яны наперад па сухім бары. Злева час ад часу выблісквала возера. Бярозы, алешыны, вербалоз з маленькімі светла-жоўценькімі лісточкамі атачалі яго, нібы мярэжкі. Елкі і сосны на гэтым фоне здаваліся зусім чорнымі. Вясёлае веснавое сонейка шнырала паміж дрэў і цешыла і расліну, і птушку, і ваду, і нашых хлопцаў.

Прырода, вясна і маладосць напоўнілі іх жыццярадаснасцю. Нават на голад забыліся.

— Па-а марам, марам, марам, мара-ам! — зацягнуў Віктар.

— Сёння тут, а заўтра там! — падхапіў Мірон.

А ў адказ ім загуло ў лесе: «А-а-ам!»

— Ведаеш што? — звярнуўся Віктар да Мірона. — Я ўжо шкадую, што мы накіраваліся дадому. Я б ахвотна згадзіўся пажыць тут некалькі дзён. Тут табе і мора, і першабытны лес, і звяроў можна рукамі лавіць.

— Ды і я нічога супраць не меў бы, — усміхнуўся Мірон,— але есці няма чаго.

— А гэта што? — пакруціў Віктар зайца над галавой.

— А якім чынам яго засмажыш?

— Здабудзем агонь, як гэта робяць дзікуны, — і ўся табе музыка.

— А хлеба, солі дзе ўзяць?

— Булкі, чаю, каўбасы! — перадражніў Віктар. — Эх ты! А як жа эскімосы ды папуасы жывуць увесь век без гэтага? А ты і некалькі дзён баішся пражыць.

— Пачакай, яшчэ, можа, давядзецца і супраць нашай волі пажыць тут, — прамовіў Мірон, калі глянуў наперад.

Там мясцовасць паніжалася, пераходзіла ў балота, а за ім далёка зноў блішчала вада.

— Бачыш, і там вада. Значыцца, трэба зварочваць.

Павярнулі направа. Цяпер пайшла ўжо нізіна; пад нагамі чвякала і пырскала вада. Густы ельнік яшчэ болей перашкаджаў ісці. Яны стараліся скарыстаць кожную магчымасць, каб пасунуцца ў свой бок, налева, але кожны раз павінны былі адступацца назад.

Знайшлі былі больш-менш сухую невысокую граду, якая цягнулася на поўдзень, але хутка выявілася, што гэта быў толькі клін, які ўпіраўся ў возера ці балота, — хто яго цяпер разбярэ! Прыйшлося вяртацца назад.

Гэтак ішлі яны гадзіны са тры. Настрой у абодвух даўно ўжо сапсаваўся. Не толькі ў Віктара ў чаравіках, але

і ў Мірона ў ботах хлюпала вада. Змарыліся хлопцы страшэнна, а голад пачаў так дапякаць, што і вясна, і ўвесь свет зрабіліся нямілымі.

— Гэтак, чаго добрага, і другую ноч давядзецца начаваць тут! — у роспачы сказаў Віктар.

— Ты ж толькі што казаў, што хацеў бы пажыць тут некалькі дзён, — упікнуў Мірон.

— Ану цябе! — махнуў рукой Віктар. Потым ён схіліўся і пачаў скубці ды есці нейкую траву. Прыгледзеўся Мірон і ўбачыў светленькія далікатныя круглыя лісточкі так званай «заечай капусты».

— Значыцца, будзем абедаць? — сказаў ён. Палажылі сваю здабычу і пачалі «пасвіцца». Доўга яны жывіліся, змарыліся яшчэ болей.

Нарэшце Мірон спыніўся і сказаў:

— Годзе ўжо, а то яшчэ захварэць можна.

Пасля «абеду» захацелася піць. Вада ў возеры была мутная. Трэба было шукаць лужыны, дзе яна адстаялася. Гэтая вада і была іх адзінай ежай за апошнія суткі.

Было гадзіны тры-чатыры пасля поўдня.

— Ідзём цяпер на захад, можа, там выберамся, — сказаў Мірон.

Пайшлі на захад. Мясцовасць была некаторы час даволі высокая. Пайшоў прыгожы сухі бор. Але хутка зноў уткнуліся ў балота. Прыйшлося паварочваць направа.

Віктар раззлаваўся:

— Гэтак мы абыдзем навокал і зноў прыйдзем на старое месца. Скідай штаны! Трэба чаго б ні каштавала вырвацца адсюль. Тым болей што з гэтага боку возера няма, а толькі балота.

Яны адважна рынуліся ў багавінне. Трэба аддаць справядлівасць нашым хлопцам: паказалі яны сябе тут сапраўднымі героямі. Праціскаліся, караскаліся, скакалі з купі-

ны на купіну, загразалі, выцягвалі адзін аднаго, пакуль... зноў не ўбачылі возера!

— Значыцца... мы на востраве?! — амаль шэптам сказаў Віктар.

— Невядома яшчэ, — запярэчыў Мірон. — Па-першае, мы не ведаем чацвёртага боку, а па-другое, бачыш, з вады вытыркаюцца кусты і нават дрэвы. Значыцца, гэта толькі паводка. Пойдзем хутчэй назад, каб паспець да вечара агледзець апошні бок.

Непрыемная была справа наогул, але цяпер больш за ўсё было крыўдна, што дарэмнымі аказаліся ўсе іх гераічныя намаганні. Хлопцы прасунуліся досыць далёка, і цяпер столькі ж трэба было ісці назад.

Выбраўшыся на сухое месца, яны зараз жа, нават не памыўшыся, накіраваліся на поўнач. Тут менш было клопату: адразу пераканаліся, што выйсці нельга. З гэтага боку яшчэ загіналася і возера, а між ім і берагам залягала на два-тры кіламетры балота.

Калі надышоў вечар, хлопцы стаялі каля таго самага дрэва, якое дало ім першы прытулак...

— Ну, што скажаш на ўсё гэта? — звярнуўся Віктар да Мірона.

— Скажу, што наша становішча ў тысячу разоў лепшае, чым у тых, хто трапіў на пустынны і бязлюдны востраў сярод акіяна. А мы не раз зайзд-росцілі ім, калі чыталі пра гэта ў кнігах.

— Дзякую табе за такую дабрату.

— Хіба няпраўда? Нам прыйдзецца толькі пасядзець тут тыдзень ці два, пакуль спадзе вада. А ў тых людзей такой надзеі не было.

— Добра казаць — тыдзень ці два. А як пражыць іх?

— А гэта ўжо будзе залежаць ад нас саміх.

— Хіба хто выпадкова заедзе сюды?

— Лепш на гэта не спадзявацца, бо з кожным днём возера будзе адсоўвацца ад нас і застанецца балота, праз якое ніхто не палезе.

— Але ж з голаду дайсці можна за гэты час! Я ўжо не магу больш цярпець.

— Ну, калі прыйдзецца паміраць з голаду, то можна не толькі сырога зайца, але і пугача з'есці. Ад мяса, хоць і сырога, людзі не паміраюць.

Спакойныя разважанні Мірона трохі супакоілі і Віктара. Прынамсі, цяпер яны ведаюць, што іх чакае і што ім трэба рабіць.

— Вось тваё жаданне і збылося, — усміхнуўся Мірон. — Можаш цяпер і агонь здабываць, і жыць тут, як дзікун.

— Яно так, — паскроб патыліцу Віктар, — але на справе гэта зусім не так добра, як здавалася раней.

Сонца спускалася за лес. Апошнія праменні яго слізганулі па воднай прасторы, а затым накіраваліся ўгору. Загарэліся верхавіны дрэў, нібы сонца цяпер асвятляла іх больш, як удзень. Зайгралі на небе рознакаляровыя воблачкі, якіх, здаецца, да гэтага часу і не было. Ад вады дыхнуў халадок. Цішыня была поўная.

Пачуццё адзіноты ахапіла хлопцаў. Чаго яны сюды забраліся, далёка ад людзей, ад сваіх блізкіх? Што ім тут рабіць? А калі і як выберуцца — яшчэ невядома. Нездарма з іх смяяліся таварышы, калі пачулі аб іх намеры. Такія думкі ўпарта лезлі ў галаву і Віктару і Мірону, але гонар не дазваляў прызнацца ў гэтым не толькі перад таварышам, але і перад самім сабою. Голад, які яны сцішалі толькі вадой, з кожнай хвілінай мучыў іх усё больш і больш. Па меры таго як садзілася сонца, узмацняўся і холад.

— Давай рабіць бярлогу! — крыкнуў Віктар, страсянуўшы плячыма, нібы адганяючы ад сябе і холад, і голад, і сумныя думкі.

У пясчаную ямку, дзе начавалі мінулую ноч, яны звалаклі ўсё сухое, што маглі знайсці вакол сябе, і ў дадатак яшчэ наламалі кучу яловых лапак. Атрымалася бярлога, ад якой не адмовіўся б і сам мядзведзь.

Хлопцы залезлі ў яе, некаторы час прыладжваліся і круціліся, як квактуха ў гняздзе, затым сцішыліся. Але, нягледзячы на стомленасць, адра-зу заснуць не маглі. Становішча, у якім яны так нечакана апынуліся, было вельмі непрыемнае. Ці паспеюць яны вярнуцца да пачатку заняткаў у тэхнікуме? Колькі дзён трэба на тое, каб вада сышла? Як пражыць гэтыя дні? Колькі трывогі будзе дома, калі яны спозняцца!.. Адным словам, было над чым задумацца.

## IV

Вось табе і няхітрая навука! — Прыйшлося пакаштаваць сырога зайца. — Дынамамашына. — Агонь! — Крыўда Віктара.— Навуковая дыскусія.

— Толькі пачатак цяжкі, — казаў раніцою Мірон, устаючы, — а вось другая ноч была зусім нядрэнная. Можа, і да голаду прывыкнуць можна будзе. Прынамсі, цяпер я не адчуваю яго.

Не адчуваў голаду пакуль што і Віктар, толькі ў роце было неяк нядобра.

Паўстала пытанне, што спачатку рабіць: ці «хату» будаваць, ці агонь здабываць? Спрачацца не прыйшлося — аднагалосна прызналі, што агонь важней. Але як прыступіцца да гэтай справы?

— Неяк церці ды круціць трэба сухія трэскі, — прамовіў Віктар. — А як яно робіцца — ты ведаеш?

— Ну, гэта навука няхітрая, — адказаў Мірон.

Узялі два сухія кавалкі і пачалі церці адзін аб адзін. Церлі доўга, цярпліва, некалькі разоў мяняліся. Але агню не было. Праўда, кавалкі так нагрэліся, што дакрануцца да іх нельга было. Але да агню было яшчэ далёка.

— Пачакай! — крыкнуў Віктар. — Трэба ж падрыхтаваць сухой губы і іншай трухі. Само дрэва полымем не загарыцца.

— Ведаю я гэта, — адказаў Мірон, — але пакуль што няма ад чаго губу запальваць. Гэтыя трэскі толькі награюцца — і ўсё. Як жа яны запальваюц-ца? Няўжо не памятаеш? Ты, мусіць, не раз чытаў.

— А ты не чытаў? Чаму ж ты не ведаеш?

— Ды неяк не звяртаў увагі на падрабязнасці. Пішуць, што труць і круцяць, а як — не цікавіўся.

— Каб ведаць, што яно спатрэбіцца... — уздыхнуў Віктар.

— Не ўмеем мы ўважліва чытаць кнігі, — з роздумам сказаў Мірон, — столькі разоў чытаў, а як — не заўважыў.

— Лепш тады выбіць агонь крэменем, — прапанаваў Віктар...

— Вядома, лепш, каб яго знайсці, — згадзіўся Мірон.

Але дзе там было знайсці крэмень сярод балота! Думка аб тым, што агню здабыць не ўдасца, зусім збянтэжыла хлопцаў. На момант яны адчулі, што ім нічога не хочацца рабіць, што іх нішто не цікавіць і што сонца ўжо не грэе. Але праз хвіліну Віктар крыкнуў:

— Падрыхтуй ты чаго-небудзь сухога на распал, а я буду церці хоць цэлы дзень. Галоўнае — не спыняцца.

Сцяўшы зубы, ён зноў пачаў церці — моцна, упарта, доўга. Кроплі поту падалі на дрэва і бадай што сіпелі ад гарачыні, а дыму не было. Нарэшце абодва кавалкі пакрышыліся ў руках. Віктар злосна кінуў іх і пачаў выціраць лоб.

— А можа, і загарэлася б, каб дрэва было цвярдзейшае, — нерашуча прамовіў Мірон.

Віктар толькі рукой махнуў:

— Дзе там! Каб туды ішло, то была б хоць якая-небудзь іскра ці дымок. А тут толькі гарачыня — і больш нічога.

— Але ў кнігах пішуць...

— Хай бы той сам паспрабаваў, хто піша, — сказаў Віктар, цяжка дыхаючы.

Ён стаяў, апусціўшы рукі, нібы толькі што вылез з вады. Мірон ніколі не бачыў у свайго прыяцеля такога выразу твару, як цяпер: гэта быў не жыццярадасны юнак, а сталы мужчына з суровым тварам і складкамі на лбе. Віктар нешта абдумваў. Затым цвёрдымі крокамі падышоў да зайца, падняў яго і пачаў разглядаць, адхіляючы пальцамі ў некаторых месцах поўсць.

— Што ты хочаш рабіць? — з жахам спытаў Мірон, здагадваючыся, у чым справа.

— Тое, што зрабіў бы на нашым месцы кожны разумны чалавек, — спакойна адказаў Віктар і, набраўшыся духу, нібы збіраўся кінуцца галавой у палонку, запусціў зубы ў спіну зайца...

Трэба адзначыць, што ў адным выпадку «геройства» Віктара было не ў тым, што ён з голаду адважыўся пакаштаваць сырога мяса, а ў тым, што ён аднымі толькі зубамі, праз поўсць і скуру, дабраўся да гэтага мяса. Гэта была вельмі цяжкая, складаная і непрыемная аперацыя...

— Ну, як? — затаіўшы дыханне, запытаўся Мірон, калі Віктар нарэшце адкусіў і праглынуў кавалак.

— Пакаштуй, — адказаў Віктар і працягнуў яму зайца.

Мірон нерашуча ўзяў, пакруціў яго, нацэліўся быў укусіць, але адклаў.

— Не,— прашаптаў ён, — не магу. Пакуль яшчэ не паміраю — пачакаю.

Віктар усміхнуўся.

— Не скажу і я, каб смачна было. І кусаць другі раз таксама пачакаю. Думаю, пакуль што і гэты кавалак што-небудзь дасць для арганізма. Але ўсё ж такі лічу за лепшае з'есці сырога мяса, чымся паміраць. Ну, смялей!

— Пачакай крыху, паспею,— прамовіў Мірон і зноў палажыў зайца на зямлю.

— Не надта паспееш, — сур'ёзна сказаў Віктар. — Калі доўга будзеш чакаць, то мяса і сапсавацца можа.

— Хоць трошкі пачакаем, — адмаўляўся Мірон, — а пакуль паспрабуем яшчэ іншым спосабам. Я там бачыў добрую палку.

Ён прынёс сухую гладкую альховую палку і падаў Віктару.

— Пастарайся завастрыць яе, а я пайду пашукаю яшчэ што-небудзь.

Віктар, не доўга думаючы, пусціў у ход свае зубы.

— Што ты робіш?! — крыкнуў Мірон і выхапіў палку. — Ты ж замочыш яе! Ты як-небудзь інакш.

Тады Віктар пачаў вастрыць яе аб дрэва, потым уціснуў канец у шчыліну ў дрэве і пачаў круціць. А Мірон пайшоў у лес.

Праз некаторы час ён закрычаў:

— Віктар! Сюды! Хутчэй!

Віктар пабег. Мірон стаяў каля зрэзанага пня і трымаў у руках некалькі шырокіх трэсак.

— Хіба ты не мог без мяне прынесці гэтыя трэскі? — сказаў Віктар.

— Не тое. Зірні, вунь некалькі зрэзаных пнёў.

— Ну дык што ж?

— Значыцца, тут людзі бываюць. Значыцца, мы не на бязлюдным востраве. Значыцца, і выхад павінен быць.

— Гэта, браце, невялікая радасць. Напэўна, гэта магло быць толькі ўзімку, праз возера. А сядзець тут да зімы...

— І то праўда, я забыўся, — збянтэжана адказаў Мірон.

Пачалі наладжваць новую прыладу.

— У дошчачцы трэба выкалупаць ямку, — тлумачыў Мірон. — Уставім туды востры канец палкі, вось так. Я каменем буду паступова прыцiскаць зверху, а ты круці палку то ў адзін, то ў другі бок.

Лёгка было сказаць — «выкалупаць ямку». А калі дайшло да справы, то гэтае «калупанне» без прылады аказалася вельмі нялёгкай і маруднай справай. Колькі трэсачак пераламалі! Ды яшчэ трэба было сачыць, каб яны былі зусім сухія, бо інакш ямка зрабілася б вільготнай.

Нарэшце падрыхтоўчыя работы былі скончаны.

Віктар узяў палку між далонямі і пачаў круціць. Але «машына» спынялася кожную хвіліну: то рукі саслізнуць, то камень, то Мірон занадта прыцісне. Нарэшце Віктару далоні пачалі балець.

— Ды яно нават і не награецца, — з прыкрасцю сказаў ён. — І якім гэта чынам дзікуны робяць? Мы прызвычаіліся з пагардай зваць іх дзікунамі, а самі — дурнейшыя ад іх. Тут патрэбна спецыяльная машына, каб круціць.

Мірон стаяў, апусціўшы галаву, і напружана думаў. Нарэшце ён крыкнуў:

— Успомніў! Успомніў! Трэба зрабіць лук, абкруціць адзін раз палку напятай струной і пілiць, як на скрыпцы. Яна тады і будзе круціцца як след. Калісьці я нават і малюнак такі бачыў у адной кніжцы.

— Пачакай яшчэ скакаць,— недаверліва сказаў Віктар. — Мы ўжо рабілі па кніжцы.

— Тое, ды не тое, — упэўнена адказаў Мірон.

Знайсці і зламаць патрэбную галіну было няцяжка. Але што на яе напяць? Азірнуліся навакол, зірнулі на сябе.

— Давай шнурок ад сваіх чаравікаў! — крыкнуў Мірон.

Прыладзіліся. Падрыхтавалі губу, драбнюсенькія трэсачкі. Пачалі шморгаць лукам. Справа пайшла іначай. Нават Віктар пачаў спадзявацца.

— Дынамамашына, ды і годзе! — засмяяўся ён.

Сучок круціўся, ямка паглыблялася.

— Поўны ход! Без перапынку! — камандаваў Мірон.

Віктар і без гэтага стараўся ваўсю. Але праз некалькі мінут лук як тарганецца ды як скокне ўбок!.. Ледзь Віктару вока не выбіў: гэта шнурок перапіліўся і парваўся.

— Вось няшчасце! — усклікнуў Віктар. — Чаму ж ты два шнуркі разам не скруціў?

— А чаму ж ты сам не сцяміў?

— Усё сам ды сам, а твая галава навошта?

— Няўжо ты забыўся, што гэты спосаб і шнуркі я прыдумаў, а не ты?

Тут Віктар убачыў, што даў маху. Але ж не ўступаць жа з-за гэтага! І ён, рыхтуючы шнуркі, усё ж такі бурчаў, абы толькі не маўчаць, абы толькі мець апошняе слова:

— Рана хваліцца новым спосабам — невядома яшчэ, што з яго выйдзе. А шнуркі знайсці на чужых нагах кожны здолее. Я і сам здагадаўся б, каб падумаў...

— ...месяцы са два, — у тон яму прадоўжыў Мірон.

Віктар паглядзеў на яго і... шчыра зарагатаў.

Разарваны шнурок звязалі і скруцілі з цэлым. Але зноў бяда: вузялок перашкаджаў прыладзе рухацца!

Тады хлопцы накруцілі вакол шнуркоў тонкіх карэньчыкаў. Пасля таго ўся вяроўка зрабілася таўсцейшай, вузялок схаваўся і ў дадатак яшчэ наогул магутнасць машыны павялічылася ў шмат разоў.

Зноў пачалі шморгаць лукам. Цяпер ужо цягаў Мірон, а Віктар прыціскаў палку каменем. І калі ўжо здавалася, што вось-вось пакажацца дымок, камень саслізнуўся і машына павалілася набок.

На гэты раз ужо Мірон не вытрымаў:

— Выходзіць, на які ўчастак цябе ні паставіць, заўсёды там будзе аварыя.

— Ды хіба ж я хацеў? — пакорна апраўдваўся Віктар.

Мірон і сам ведаў, што Віктар не вінаваты, таму нічога болей не сказаў.

Зноў пусцілі машыну. І вось нарэшце паказаўся дымок!..

— Ура! Давай, давай яшчэ! — закрычалі хлопцы, як вар'яты.

Дымок павялічваўся, апілкі зачарнеліся і... бліснула іскра!

— Падгарні падпал! Дзьмухай! Дзьмухай!..

Праз хвіліну хлопцы сядзелі ля агню. На тварах іх свяцілася такое шчасце, якога яны ніколі не адчувалі яшчэ ў сваім жыцці. Надыходзіў вячэрні змрок, і ад гэтага яшчэ ўтульней было каля агню.

— Нездарма першабытныя людзі пакланяліся агню, — разважаў Мірон, — нездарма і рэлігіі вядуць пачатак адсюль. Мне самому хочацца маліцца на яго. Усе мы так прызвычаіліся да агню, нам так лёгка здабываць яго, што нам здаецца, нібы гэтак заўсёды было і іначай быць не можа. Толькі ў такім становішчы, як мы, можна добра адчуць, што такое агонь, можна ўявіць, як жылі тыя людзі, што не ведалі яго.

Ён пяшчотна падкладаў трэскі і сачыў, як языкі полымя лізалі іх. Змрок згушчаўся. А разам з гэтым ярчэла святло ад агню.

І Віктар сядзеў нерухома, не зводзячы вачэй з агню. Яны нават на некаторы час забыліся на ежу.

Нарэшце Віктар ускочыў і крыкнуў:

— Навошта ж я тады сырое мяса еў? Ты выкруціўся ад гэтага, а я дарэмна пакутаваў. Не, брат, так нядобра. Ты таксама павінен пакаштаваць.

Ён ухапіў зайца і пачаў соваць яго Мірону ў рот. Пачалася вясёлая тузаніна.

— Пачакай! — крыкнуў Мірон, засопшыся. — Ты ж цяпер маеш перавагу. Табе гэта нічога не пашкодзіла, а між тым ты можаш цяпер хваліцца, што ўсё перажыў на сваім вяку, нават сырое мяса еў.

— А што ты думаеш? Яно і сапраўды так, — згадзіўся Віктар. — Ну, давай гатаваць вячэру.

Але зараз жа выявілася, што справа зусім не такая простая: не было нажа! А без яго аніяк нельга было даступіцца да зайца.

— Вось дык задача! — засмуціўся Віктар. — Хоць ты яго цалкам кідай у агонь.

Ён круціў зайца і так і гэтак, пераламаў яму ногі, але больш нічога, вядома, зрабіць не мог.

— Выходзіць, што зноў трэба зубы ў ход пускаць, — сказаў ён. — Але на гэты раз прыйдзецца ўжо табе.

— Пачакай, — адмахнуўся Мірон, — трэба што-небудзь прыдумаць. Можа, які востры камень знойдзецца? Я пашукаю.

Але было цёмна, і можна было шукаць толькі каля сябе.

— Цяпер і я табе магу лекцыю прачытаць, — важна сказаў Віктар. — Вострага каменя ты тут не знойдзеш, бо ўсе камені нанесены сюды ледавікамі і талай вадой з далёкай Поўначы. Па дарозе яны або перацерліся ў пясок, або адшліфаваліся ў круглыя галачкі. Нават больш-менш вялікіх каменняў тут не знойдзеш: яны засталіся далей на поўнач, напрыклад у Полаччыне.

— Ведаю я гэта,— адказаў Мірон, але ўсё ж поўзаў на каленях і капаўся ў пяску. — Не можа быць, каб ніводнага, нават невялікага каменьчыка не было. А калі ён будзе круглы, дык яго можна разбіць на кавалкі.

Віктар аж засаромеўся: яму ў гэты момант зусім не прыйшла на думку такая простая рэч, што камень можна пабіць. Віктар тады і сам узяўся шукаць.

Доўга прыйшлося ім папоўзаць, пакуль знайшлі невялікі гладкі, крыху сплюшчаны камень. А калі захацелі пакрышыць, дык не было чым і аб што!

— Вось табе і на! — сказаў збянтэжаны Мірон. — Трэба, значыцца, шукаць другі.

Але знайсці другі камень цяпер не было надзеі. Віктар усміхнуўся:

— Не выкруцішся, брат, — грызі зайца!

— А вось паглядзім! — упарта сказаў Мірон, адшпіліў рэмень і ўзяўся за жалезную спражку. — Гэтая штука выратуе. Асабліва калі яе яшчэ пава-стрыць аб камень.

— Вось хітры, чорт! — прамовіў Віктар. Мірон пачаў вастрыць сваю прыладу аб камень, але ён быў зусім гладкі, і жалеза коўзалася без жаданых вынікаў. Тады Віктар падбег да балота, зачарпнуў у жменю вады, змяшаў з пяском і прынёс Мірону.

— Вось табе рацыяналізацыя, — сказаў ён.

«Рацыяналізацыя» трошкі дапамагла. Хоць навастрыць спражку, як нож, і нельга было, але канты зняць удалося. Тады выявілася новая бяда: гладкі, закруглены край спражкі так ёмка слізгаў па скуры, што не пакідаў знаку.

— Зноў не тое! — з прыкрасцю вымавіў Віктар.

— Тады зробім, каб было тое, — спакойна адказаў Мірон.

— Якім чынам?

— Пастукаем аб камень, зробім насечкі, каб не слізгала. Так сказаць, па прынцыпу пілы.

— Па прынцыпу пілы-ы! — з жартаўлівай павагай паўтарыў Віктар. — Гэта я разумею.

Спражка пачала драпаць скуру і пакідаць сякі-такі след. Але тут выявіўся новы недахоп: «лязо» было надта

кароткім і больш прыходзілася пароць рогам, чым рэзаць ці піліць рабром. А рог акурат быў зусім тупы, прыйшлося цяпер завастраць яго.

Адным словам, кожны раз выяўлялася, што трэба і можна яшчэ і яшчэ палепшыць прыладу. Нарэшце Віктар сказаў:

— Чаму было нам адразу так не зрабіць? А то цэлую гадзіну ўсё патрошкі выдумваем.

— Відаць, адразу з галавы, без практыкі, не надта выдумаеш, — адказаў Мірон. — Я думаю, мы за гэтую гадзіну прайшлі шлях, які першабытны чалавек праходзіў гады, стагоддзі...

— ...тысячагоддзі! — жартаўліва падказаў Віктар.

— І тысячагоддзі! — сур'ёзна сказаў Мірон. — Першабытны чалавек еў сырога зайца гэтак жа, як і ты. А колькі часу прайшло, пакуль ён здабыў агонь? Першабытны чалавек не меў ніякай прылады, як і мы. А колькі часу прайшло, пакуль ён надумаўся скарыстаць камень? А колькі часу прайшло ад каменя да жалеза?..

— Пачакай, пачакай, — перапыніў Віктар. — Тут ужо ты няправільна разважаеш: жалеза ты не выдумаў, а гатовае ўзяў.

— Ну, добра, — згадзіўся Мірон. — Але апрацоўку і прыстасаванне яго першабытны чалавек прыдумаў, напэўна, не за гадзіну. Вось разам і набяруцца не толькі тысячы год, а нават мільёны. А ў нас з табою і дня не прайшло.

— Няма чаго задавацца, — зняважліва адказаў Віктар. — Твае вынаходствы не твая заслуга, а ўсіх папярэдніх пакаленняў, у тым ліку і першабытных людзей. Твайго тут і макавінкі не знойдзецца. А каб не было нікога да нас, то мы з табою таксама выдумлялі б мільёны гадоў.

Гэтыя размовы мелі тую карысць, што на некаторы час адцягнулі думкі хлопцаў ад голаду. Затым прылада была пушчана ў ход. Які гэта быў «ход», лепш ужо не гаварыць...

У кожным разе, роля прылады зусім не адпавядала той навуковай дыскусіі, якая вялася вакол яе. Аднак з дапамогай трэсак, сучкоў, пальцаў абодвух хлопцаў яна выканала сваю задачу: атрымалася некалькі бясформенных кавалкаў мяса, якія Мірон і закапаў у жар.

— А можа, лепш над агнём? — сказаў Віктар. — Я чытаў, што гэтак робяць.

— А я чытаў, што ў попел кладуць, — адказаў Мірон. — Другі раз паспрабуем над агнём. Паспеем яшчэ вывучыць розныя спосабы.

Калі мяса пачало скварыцца і сіпець, пакуты хлопцаў яшчэ больш павялічыліся.

— Цягні, досыць будзе! — крычаў Віктар кожную хвіліну.

Нарэшце выцягнулі.

Што за смажаніна выйшла, які смак мела, — невядома, бо з’едзена яна была ў адзін міг. І толькі пасля гэтага пайшлі розныя заўвагі:

— А здаецца, мы яго недатрымалі.

— Шкада, што солі няма. Была б зусім іншая рэч.

— Эх, каб хоць малюсенькую лустачку хлеба!

Затое тыя кавалкі мяса, што засталіся на заўтра, былі дасмажаны добра. Палажылі іх на трэсках пад дрэвам і пачалі рыхтавацца да сну. Настрой хлопцаў быў ужо зусім іншым.

— Закурыць бы цяпер,— сказаў Віктар і пайшоў шукаць сваю махорку. Але ў цемры не знайшоў. Узяў тады галіну з агнём — і ўбачыў, што ўся махорка параскіданая і патаптаная.

— Гэта ты зрабіў?! — крыкнуў ён на Мірона.

— Навошта яна мне здалася? — паціснуў плячыма Мірон.— Мусіць, і твая праца тут ёсць. Памятаеш, як мы тады дужаліся...

Пачаў быў Віктар збіраць драбінкі, потым раззлаваўся і плюнуў.

— Вось і добра, — заўважыў Мірон. — Калі-небудзь падзякуеш, што так здарылася.

Назапасілі нанач галля.

— Каб нам не звесці агню, — трывожыўся Мірон. — Можа, па чарзе пільнаваць.

— Ну, не. Ад добрага вогнішча заўсёды застаецца пад попелам жар да раніцы.

Спаць класціся не спяшаліся. Абодва адчувалі сябе так спакойна і ўтульна, нібы яны былі ў самым звычайным становішчы.

— Толькі два дні мінула, — разважаў Мірон, — а мне здаецца, нібы некалькі тыдняў мы тут жывём. Але што мы будзем есці, калі прыйдзецца тут чакаць тыдзень ці два?

— Звяроў будзем лавіць, рыбу, птушак, — весела адказаў Віктар. — Цяпер, калі ёсць агонь, я ўжо нічога не баюся.

— Яно так, але як будзеш лавіць? — задуменна пытаўся Мірон.

— А як жа розныя дзікуны жывуць? — храбрыўся Віктар.

Праз гадзіну хлопцы смачна спалі, адчуваючы пяшчотную цеплыню ад свайго ў поце здабытага агню.

## Пытанні і заданні

1. Вы пазнаёміліся з раздзеламі аповесці Янкі Маўра «Палескія рабінзоны». Ці спадабаліся яны вам?

2. Раскажыце, як мары хлопчыкаў пра незвычайныя падарожжы сутыкнуліся з рэальнасцю. Што дапамагло героям выжыць?

3. Параўнайце паводзіны Віктара і Мірона на востраве. Хто з герояў глядзіць на падзеі больш аптымістычна?

4. Знайдзіце ў тэксце эпізоды, якія гавораць пра знаходлівасць герояў.

5. Звярніце ўвагу на дыялогі. Якую ролю яны выконваюць у творы? Як выяўляюцца ў іх адносіны герояў да жыцця, да падзей, да іншых людзей?

6. Знайдзіце апісанні знешнасці герояў (партрэты) і вызначце, як раскрываюцца ў іх характары герояў.

7. Падрыхтуйце характарыстыку аднаго з персанажаў. Падмацуйце яе цытатамі.

8. Як аўтар адносіцца да сваіх герояў? Абгрунтуйце сваю думку радкамі з тэксту.

9. Назавіце асноўныя спосабы і прыёмы, якія выкарыстаў аўтар для характарыстыкі персанажаў.

10. Знайдзіце ў тэксце апісанні прыроды. Якую ролю яны адыгрываюць у кожным канкрэтным выпадку?

11. Калі вас зацікавіў лёс герояў, прачытайце твор Янкі Маўра «Палескія рабінзоны» поўнасцю.

12. Уявіце, што збіраюцца ставіць спектакль па творы Янкі Маўра «Палескія рабінзоны». Паспрабуйце сябе ў ролі сцэнарыста (падрыхтуйце сцэнарый); мастака (вызначце выгляд дэкарацый і касцюмы акцёраў); акцёра (прадумайце, як увасобіць на сцэне характар героя, выкарыстоўваючы свае індывідуальныя асаблівасці — эмоцыі, голас, жэсты, міміку); рэжысёра (прадумайце мізансцэны — размяшчэнне акцёраў у той альбо іншы момант спектакля, парады кожнаму акцёру паасобку і з усімі разам на рэпетыцыях).

## Літаратурны дыктант-віктарына па творчасці Янкі Маўра

**Варыянт 1**

1. Сапраўднае прозвішча Янкі Маўра ....

2. Пісьменнік абраў сабе такі псеўданім, таму што ... .

3. Янка Маўр быў пачынальнікам у беларускай літаратуры ... жанру.

4. У 1930 годзе была напісана яго аповесць ... .

5. Галоўнымі героямі аповесці былі ... .

6. Хлопцы вучыліся ў ... .

7. Ім абодвум было па ... .

8. Падзеі аповесці «Палескія рабінзоны» адбываліся на ... .

9. Выжыць на востраве хлопцам дапамаглі веды, набытыя ў ... гуртку.

10. Мірон і Віктар убачылі на востраве незвычайныя расліны: ...

11. Падарожжа хлопцаў доўжылася...

12. На востраве хлопцы ўбачылі розных звяроў: ... .

13. Вялікае ўражанне зрабіла на хлопцаў забойства ... .

14. Мірон цікавіўся ў школе... .

15. Віктар аддаваў перавагу ....

16. Хлопцам прыйшлося правесці на востраве амаль... .

**Варыянт 2**

1. Іван Міхайловіч Фёдараў абраў сабе псеўданім ... .

2. Яго першы твор быў надрукаваны ў ... годзе.

3. Пра старадаўнія часы, Чалавека-Пераможцу распавядае твор Янкі Маўра ... .

4. Янка Маўр пазнаёміў сваіх чытачоў з экзатычнымі краінамі: ... .

5. «Краінай райскай птушкі» назваў пісьменнік ... .

6. Пісьменнік, які ніколі не быў у іншаземных краінах, браў інфармацыю для сваіх твораў з ... .

7. Непаўторнай прыгажосці Беларусі прысвечана аповесць Янкі Маўра ... .

8. Мірон і Віктар вучыліся ... .

9. На востраве хлопцы сустрэліся з незвычайнымі для Беларусі раслінамі ... .

10. Падарожжа хлопцаў доўжылася ... .

11. Выжыць на востраве Мірону і Віктару дапамагло веданне школьных прадметаў ... .

12. Хлопцам на востраве давялося змагацца з ... .

13. Аповесць «Палескія рабінзоны» была напісана ... .

14. Аўтар назваў Мірона і Віктара «палескімі рабінзонамі», таму што ... .

***Алена Васілевіч***

## ГОРКІ ЛІПАВЫ МЁД

Мне трэба паслаць дадому святочную тэлеграму, і я іду на пошту. Іду ў чужым горадзе насустрач узбуджанаму стракатаму натоўпу, непрыкметна для сябе самога паддаючыся ўладзе неадольнага жадання: па тварах стараюся здагадацца, куды, напрыклад, спяшаецца высокі мужчына ў легкаватай для зімы сінтэтычнай куртцы, з пакункамі ў абедзвюх руках; або які клопат выправіў на гэту тлумную вуліцу вашчаную бабульку ў дапатопным капялюшыку, з паточанай моллю муфтачкай, з тварам, на якім даўно ўжо адмерлі ўсе жывыя страсці; або вось гэтыя двое, што, здаецца, нават фізічна праменяць вакол сябе токі шчасця. Яна — само мімалётнае ззянне, зіхаценне і завідны бляск маладых вачэй, валасоў, зубоў і нават нейкага нязвычна светлага пушыстага футра. І ён — над усім натоўпам — гэтакі ж дасканалы, спартыўны, непераможны. Як сам малады бог.

...Цёмнае бяззорнае неба, не спяшаючыся, вытрасае апошні рукаў старога года і бясконца цярушыць і цярушыць, пасыпае зямлю белай крупчаткай. Паветра пахне лесам, смалой, нядаўна ссечаным ельнікам, і ў гэтай свежасці, напоенай лясным здароўем, здаецца, лунае абяцанне нейкіх бясконца светлых і маладых спадзяванняў і надзей. Непры-

кметна для сябе самога я збочваю на гукі музыкі ў Гарадскім садзе, дзе цяпер заліты каток. Каток амаль бязлюдны і ахутаны паўзмрокам. Выкрасаюць толькі іскры з-пад канькоў трое ці чацвёра хлапчукоў, ды вучыць трымацца на «снягурках» сваю дачушку маладая маці.

І больш на катку — ні душы.

Я доўга стаю, не кранаючыся з месца, і гляджу, гляджу, як у чароўным танцы кружацца і мякка сцелюцца долу сняжынкі, гляджу на хлапчукоў і ўспамінаю свайго сына (чым ён заняты ў гэты час дома?), чамусьці з міжвольным сумам думаю пра маладую жанчыну з дачушкай: чаму яны, у гэту пару, не радуюцца святочнай ялінцы, а тут — і толькі ўдваіх...

Я гляджу на аранжавыя электрычныя ліхтарыкі на слупах вакол катка, і мне раптам прыходзіць на думку, што гэтыя ліхтарыкі падобны на даўнія-даўнія сцюдзёныя мандарыны, якія некалі елі мы з Лідачкаю. Таксама на катку.

Бог ты мой, колькі гадоў прайшло, колькі вады сплыло з часоў таго катка!

* * *

Мы жылі тады на Камсамольскім бульвары. Бульвар быў абсаджаны магутнымі каштанамі і абнесены нізкай чыгуннай загароджай старадаўняга ліцця. Па вёснах, калі каштаны зацвіталі, у іх далікатных фарфоравых кандэлябрах успыхвала безліч свечак. І тады над Камсамольскім бульварам стаялі белыя ночы. Нас, падлеткаў, у тыя ночы нельга было даклікацца дадому.

Я мог бы нават і цяпер прысягнуць: другога такога бульвара і такіх каштанаў не меў ніводзін горад у свеце. Нават Кіеў. Нават Парыж...

На Камсамольскім бульвары ўзвышаўся помнік чатырнаццаці партызанам, закатаваным у дваццатым годзе бела-

палякамі. I я сам, і кожны з маіх сяброў-аднагодкаў ведалі іх пайменна, як ведалі адзін аднаго. У нашым горадзе не было больш ніякіх помнікаў. Гэты быў адзіны. І мы шанавалі яго і ганарыліся славай і мужнасцю тых, што ляжалі тут, пад сціплай цэментовай пірамідкай. Зверху пірамідкі іскрылася чырвоная пяцікутная зорка з бляхі.

Даглядаць помнік — фарбаваць зорку, каб не патухала, і несамавітую драўляную агароджу, каб трывала пад дажджамі і халепай, саджаць кветкі вясною — такі быў няпісаны закон для нас, дзяцей і падлеткаў Камсамольскага бульвара. І мы — кожны — хутчэй бы далі адсекчы сабе руку, чым парушылі гэты закон. Ён быў святы.

І школа, у якой я вучыўся, таксама знаходзілася на Камсамольскім бульвары. У тыя гады наша школа звалася Узорнай. Узорных школ у раёне было ўсяго толькі дзве. Наша была Першая Узорная. І таму нельга было прыдумаць лепшае для яе месца, чым Камсамольскі бульвар... Па суседству з нашай школай, за драўляным плотам, цягнуўся вялізны пляц, на якім штодня гарцаваў і сек лазу эскадрон данскіх казакоў. (У нашым горадзе размяшчалася кавалерыйская часць.) Мы, хлапчукі, на пераменках не злазілі з высачэннага плота... Чырвоныя лампасы, неймаверны палёт каня, калі ён бярэ перашкоду, і, як маланка, занесеная над галавой конніка шабля!

Усе мы тады выхоўваліся па літаратурных і яшчэ жывых прыкладах герояў Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. І ўсе мы без выключэння, падлеткі, марылі быць толькі такімі ж дужымі і адважнымі, як нашы суседзі данскія казакі! Мы сваю будучыню тады ўяўлялі не інакш, як вось у гэтакім толькі пераможным алюры па жыцці.

...Быў слаўны наш горад яшчэ і Летнім садам. Другім па хараству пасля Летняга саду ў Ленінградзе... Каму належала аўтарства такога непахіснага сцвярджэння, ніхто пэў-

на не сказаў бы. Аднак ніводзін наш гараджанін не сумняваўся: ленінградскі Летні сад на першым месцы, наш — на другім. У цэлай краіне!

(А бачылі той Летні ў Ленінградзе мо якіх некалькі чалавек з нашага горада.)

З вясны і да восені ў Летнім садзе суботнімі і нядзельнымі вечарамі ў блакітнай фанернай ракавіне іграў духавы вайсковы аркестр і прадаваліся білеты на дашчаную танцпляцоўку: на танцы сходзілася моладзь з усяго горада. У Летнім садзе прызначаліся і спатканні ўсіх закаханых.

Зімою там залівалі каток, і катком, вядома, валодалі ўжо мы, падлеткі.

Я тую зіму хадзіў на каток з Лідачкаю.

* * *

Мне ішоў чатырнаццаты год, калі раптоўна, у ад’ездзе ад дому, памёр ад разрыву сэрца (так некалі казалі пра сённяшні інфаркт) мой бацька-каморнік. Мы з мамаю засталіся толькі ўдваіх, засталіся без апоры і амаль без сродкаў да жыцця. Мама кідалася туды, кідалася сюды, але грошай, якія яна зарабляла ў сваім «швейпроме», па часе трыццатых гадоў хапала нам ледзь толькі на хлеб. Праўда, і хлеба ўволю не было, бо і хлеб давалі па картках.

У мае мамы было праклятае буржуазнае мінулае: мой дзед, а мамін бацька, да рэвалюцыі быў уладальнікам магазіна лялек. За гэта цяпер мама і несла пакаранне: яе нікуды не хацелі браць на работу. Яна мела музычную адукацыю і добра валодала французскай мовай. Але каму была патрэбна французская мова ў нашым раённым гарадку? (У той час усе школы вывучалі толькі нямецкую мову.) Або ў каго былі тыя лішнія грошы, каб наймаць яшчэ настаўніцу вучыць дзяцей музыцы? Якая музыка! Пра яе тады і вухам ніхто не

вёў. З мяшчанствам і дробнабуржуазнымі перажыткамі вялася вайна. Ці даўно пакінулі выключаць з камсамола дзяўчат за шаўковыя панчохі, а хлопцаў за гальштукі!

Не, з уменнем і ведамі мае мамы ўзнімаць пралетарскую культуру не было чаго нават і думаць. А думаць неабходна было. І перш за ўсё, як нам выбрацца з нястачы...

І мама прыдумала: узяць у нашы два невялікія пакойчыкі з кухняй кватарантак-дзяўчат. Памятаю, мама была вельмі рада тым сваім камерцыйным крокам: дзяўчаты, здаецца, ёй так нічога і не плацілі, але іх бацькі (барадатыя вясковыя мужчыны), дамаўляючыся аб плаце, браліся забяспечыць нас на ўсю зіму апалам. А з гэтым у нас і зусім было пагана. Горш нават, чым з хлебам. Бо дзе магла мама, непрактычная гарадская жанчына, узяць тых дроў ці таго торфу. І за што — узяць?

І праўда, тая зіма, калі ў нас жылі Даша з Лідачкаю, запомнілася мне як самая цёплая і самая ўтульная ў маім жыцці зіма.

* * *

Большага непадабенства знайсці было немагчыма — чым Даша і Лідачка!

Даша ў першы ж дзень, як толькі пасялілася ў нас, камандавала мною ўжо як хацела: то збегай прынясі вядро вады, то падай анучу, то перасунь з месца на месца канапу і стол... Яна збіралася мыць падлогу і мелася ў першы ж дзень паставіць дагары нагамі ўсю нашу кватэру. І калі я, па сваёй звычайнай няўклюднасці, не паспяваў вокамгненна выконваць яе загады, Даша тут жа хвастала мяне вузенькім паяском ад свае цеснаватае і караткаватае ёй сукенкі і весела, нібыта ў званок званіла, залівалася смехам. Я гойсаў з хаты на двор, з двара ў хату і таксама рагатаў без дай рады.

А Лідачка — худзенькае, кволае дзяўчо з вялікімі, нібыта чымсьці ці то здзіўленымі, ці то спалоханымі вачыма на

хваравітым бледным тварыку, — Лідачка не ведала, з якога боку да чаго прыступіцца, і толькі моўчкі, дзікавата пазірала на ўвесь гэты вэрхал у чужой кватэры.

— Ану, вымятайцеся і лепш не замінайце! — выгнала нас з Лідачкаю на двор, на халадэчу, Даша. І знайшла, вядома, нам работу — вытрасаць палавікі.

Лідачка была на цэлую галаву ніжэй за мяне, хоць між нашым узростам і стаяла чатыры гады розніцы, хоць яна і вучылася ўжо на трэцім курсе педтэхнікума. Рукі ў яе былі такія тоненькія і слабыя, што варта было мне добра страсянуць палавік, і ён тут жа вырываўся з гэтых яе рук-цявінак. Наровячы злавіць палавік, Лідачка бязгучна смяялася і няўлоўна зграбным рухам галавы адкідвала русую касу цераз плячо.

— Лепш я сам... — дзіўна, але я не ведаў як лепш да яе звяртацца: на «вы» ці на «ты», як з Дашаю. З Дашаю з першага кроку ў нас усё было ясна. А тут...

— Не, я таксама... А то мне холадна.

І сапраўды на дварэ было холадна, і, паспяшаўшы хутчэй скончыць вытрасанне, мы з Лідачкай пабеглі ў кватэру. Яна паперадзе — адчыняць дзверы. А я з абярэмкам палавікоў — следам.

— Куды? Куды? — лямантам і выкручанай мокрай анучай спыніла нас у парозе Даша.

І мы з Лідачкай, трасучыся ад смеху, стаялі ў сцюдзёным калідоры пад дзвярыма да таго часу, пакуль чырвоная і задыханая Даша, змахваючы прыліпшую да потнага лба цёмную хвалю валасоў, не адчыніла нам дзверы.

— Стойце! А то вы нацягнеце мне бруду!..

І мы яшчэ, стрымліваючы смех, стаялі ў расчыненых дзвярах, на парозе, пакуль Даша слала па чыстай вільготнай падлозе палавікі.

Мама вярнулася з работы з другое змены і не пазнала нашай кватэры: усё кругом блішчала, мэбля была пера-

стаўлена, а самае галоўнае — палілася і зырка палыхала гарачынёй у хатні падвячорак наша грубка-галандка.

Так пасяліліся ў нас Даша з Лідачкаю, і мы з мамаю вельмі хутка забылі, што яны нашы кватаранткі, а мы іх гаспадары. Усім нам цяпер здавалася, што галоўная гаспадыня ў нашай кватэры зусім не мама, а Даша.

А Лідачка? Яна не мянялася. Яна па-ранейшаму заставалася толькі Лідачкаю.

...Яны вучыліся на адным курсе, але ў розных групах, і таму ў Дашы апрача Лідачкі была яшчэ процьма сябровак і сяброў. Усе яны хадзілі да нас, як дадому, і ўсімі імі Даша камандавала гэтак жа, як мною і Лідачкаю. Але ніхто на Дашу не злаваўся, і ніхто не баяўся яе.

Даша любіла танцы. І яна не прамінала іх ніколі ні ў сябе ў тэхнікуме, ні ў Летнім садзе, хоць студэнтам хадзіць туды на танцы чамусьці ні то забаранялася, ні то лічылася непрыстойным. Я ўжо не памятаю.

З танцаў Дашу да самага дома кожны раз абавязкова праводзілі кавалеры. Кожны раз — новы. Сваіх кавалераў, дома, перад намі, Даша высмейвала і знішчала на чым свет стаяў.

Лідачка не хадзіла на танцы, хоць ёй, відаць, таксама хацелася. Назіраючы за ёю ўпотай, я добра бачыў: кожны раз пасля таго, як Даша, напудрыўшыся і адзеўшы сваю лепшую сукенку, знікне са смехам за веснічкамі, Лідачка робіцца маўклівая, сумная і як быццам яшчэ больш кволая.

— А чаму ты не ходзіш на танцы? — пытаўся я ў Лідачкі.

— Таму што мне нецікава, — усім сваім выглядам забараняючы мне далейшыя пытанні, незалежна адказвала Лідачка і бралася за кніжку.

Але я добра бачыў, што чытанне ёй не ішло ў галаву.

— Цябе ж Даша звала... — я шчыра шкадаваў Лідачку, што ёй сумна, і ў той жа час, не разумеючы сябе самога,

радаваўся, што яна не ходзіць на танцы і што яе не праводзяць гэтак, як Дашу, «кавалеры».

— Дашы цікава — няхай яна і ходзіць, а мне нецікава! — не падымаючы галавы ад старонкі кнігі, прыкметна званчэйшым, чым звычайна, голасам паўтарала Лідачка.

— А можа, і табе было б цікава... — бубніў я, невядома з якой патрэбы чапляючыся да Лідачкі.

— А табе што! — усхоплівалася з месца Лідачка і, сярдзіта шпурнуўшы кнігу на стол, ішла ў другі пакой.

А я заставаўся і адчуваў сябе так, як быццам я быў самы большы віноўнік у гэтым яе няшчасным настроі.

Праходзіла колькі часу, і з суседняга пакоя паціху абзывалася наша старая гітара. На гітары ў нас любіў іграць бацька-нябожчык. І мама таксама іграла. Яны часта, калі бацька яшчэ быў жывы, любілі вечарам сесці і разам спяваць. Бацька браў гітару, мама захоплена глядзела на яго і, на вачах робячыся вельмі маладой і прыгожай, падавалася крышку наперад. Бацька няўлоўна кратаўся струн, браў адзін акорд, другі... Мамін голас выліваўся з грудзей так, як выліваецца на мурожны бераг нізкая аксамітная хваля.

Ты сидишь у камина и смотришь с тоской,
Как печально камин догорает.
И как яркое пламя то вспыхнет порой.
То бессильно опять угасает…

У нас, вядома, не было ніякага каміна. Але калі б нават і быў, то сядзець перад ім у самоце ўсё роўна не знайшлося б каму: бацькі мае былі яшчэ маладыя і жылі заўсёды ў добрай згодзе, не наракаючы на жыццё, якое ў тыя часы вельмі не турбавала людзей непамернымі да яго патрабаваннямі. А пра мяне і казаць не было чаго: у мяне не тое каб сумаваць — пад’есці і то не заўсёды хапала часу.

У нас, праўда, была заўсёды чамусьці вельмі халодная кватэра, і заўсёды, асабліва асеннімі і зімовымі вечарамі, хацелася цеплыні. Магчыма, таму я любіў слухаць той гітарны «камін». Аднак сам я гітары ніколі нават у рукі не браў: патрэбна было мне тое мяшчанскае брынькanne! (Сваім бацькам я паблажліва даруваў іх слабасць...)

Як толькі пасяліліся ў нас, захацелі навучыцца іграць на гітары і Даша з Лідачкаю. У Лідачкі пакуль што далей старога, яшчэ дарэвалюцыйнага «Вальса гімназісткі» справа не ішла.

Это учение просто мученне.
Ох, надоело оно!
Вечно грамматика и математика,
А про любовь ничего.

Мяне заўсёды разбіраў смех з іх гітарнай навукі. Чамусьці ўсе заўсёды пачыналі яе не інакш як з гэтай тупой гімназісткі.

Але няхай ужо лепей будзе гімназістка, чым слёзы, якія не ведаеш, чым суняць. Бо часам, астаўшыся адна, Лідачка і плакала.

* * *

Неяк зімой, у адзін з такіх сумотных вечароў, я ўгаварыў Лідачку пайсці са мною на каток. Спачатку яна адмаўлялася і слухаць не хацела нават, а потым неяк смешна позіркам змераўшы мяне — доўгага і тонкага, як вудзільна, — раптам пачала рагатаць, пачала паспешліва перад люстрам перапляцаць тоўстую русую касу і — згадзілася.

— Пайшлі!

На вуліцы добра марозіла, і мы не ішлі, а беглі. Я, стараючыся далёка не закідаць свае доўгія ногі, бег наперадзе.

А Лідачка, ледзь паспяваючы, за мной. Адзін раз яна спатыкнулася і ледзь не ўпала. І схапілася за мяне. Я ўтрымаў яе і, як мацнейшы, як мужчына, потым ужо ўсю дарогу трымаў за руку. А на катку вучыў яе перш за ўсё ўпэўнена стаяць на каньках і падхопліваў, калі яна, палахлівая і няўмелая, гатова была вось-вось упасці на лёд. І калі яна, з баязлівым смехам, усё ж падала — то, шчаслівы, я паднімаў яе і зноў як малую дзяўчынку, моцна трымаў за руку, не адпускаючы ад сябе ні на крок. І як я ганарыўся сабою! Што вось я такі вялікі і дужы, што я мог бы не толькі вадзіць яе за руку, а нават здолеў бы падняць яе на рукі і кружыцца з ёю на руках і выпісваць якія хочаш фігуры пад музыку:

Сердце, как хорошо на свете жить...

Аднак на гэта ў мяне адвагі не хапала. Ды і невядома было, як бы яшчэ Лідачка паглядзела на гэту маю адвагу. Яшчэ раззлавалася б і больш ніколі не пайшла б са мною. А так — мы ўсю тую зіму хадзілі з Лідачкаю на каток удваіх. І яна ўжо сама мяне звала і чакала, калі я не паспяваў вывучыць урокі ці быў заняты якой-небудзь справай.

Мама і Даша смяяліся з нас: «Пажэнім Андрэя з Лідачкаю...» Смяялася з імі і Лідачка. А я толькі чырванеў, злаваўся, але ніколі не адмаўляўся.

Мне ў тую зіму неяк вельмі лёгка і незвычайна радасна жылося на свеце. І мама пакінула скардзіцца на мяне. І ў школе я ні з кім ні разу нават не пабіўся, нікога не пакрыўдзіў, слухаў настаўнікаў і вучыўся добра. З устойлівых серадняко̆ў я раптам вырваўся амаль у выдатнікі і надзейна замацаваўся ў іх непахісным авангардзе... А ўжо што я вырабляў на ўроках фізкультуры, якое «сонца» круціў на турніку, якімі «хрысціўся» гірамі... Ад нараджэння я быў хілым і нязграбным хлапчуком, з вузкімі плячыма і грудзьмі, як у кураняці. А тут мне раптам захацелася стаць дужым і прыгожым! Стаць такім

асілкам, пра якога ўвесь горад ведаў бы і гаварыў. І не проста асілкам, які б варочаў бярвенне ці там нейкія мяхі жыта... У марах я бачыў сябе да таго ж яшчэ і рыцарам. Я вельмі яскрава ўяўляў сабе, як позна вечарам вяртаецца з чытальні Лідачка, а на Чортавым мосціку ёй заступае раптам дарогу нейкі п’яны дурань... Ды што там п’яны. П’янага і адным пальцам можна сапхнуць у ваду! Некалькі бандытаў заступілі Лідачцы дарогу... І як яна напалохалася, як кінулася бегчы! Але куды ты ўцячэш ад гэтых жалезных ручышчаў. Лідачка просіць, моліць, плача... А гэтыя бандыты толькі выскаляюцца... Ну добра ж! Вы ў мяне зараз пасмяецеся! І — р-раз! — маланка ў вачах, і брык цераз парэнчы ў ваду! Адзін... І — р-раз! — другі... І — р-раз!.. Каму яшчэ смешна? Табе, гад?.. Атрымлівай! І табе?.. На і табе!.. Усе? Бывайце і ўспамінайце, з кім мелі справу... А Лідачка... Ну, не плач, не плач! Калі я тут — дык чаго ж плакаць?.. Ах вунь што — яна звіхнула нагу, яна зусім не можа ступіць... Ну, бярыся за шыю. Мацней, мацней! Мне не цяжка! Мне зусім не цяжка. Ты ж як пушынка. Як пярынка ўсё роўна. Ты толькі трымайся мацней, і я цябе вось так данясу да самага нашага дома.

Як цудоўна быць дужым і смелым і высакародным!

...Мама ў тую зіму зусім не скардзілася на мяне. Яна дзівілася толькі:

— Не пазнаю я свайго Андрэя, — гаварыла яна пра мяне Дашы і Лідачцы. — Ці даўно было не прымусіць яго памыць шыю і вушы... А зараз ад люстра не адходзіць... Сяк-так сабрала грошай на чаравікі, дык баюся, што ён парве іх, ваксуючы па дваццаць раз.

А я і сапраўды хацеў быць не толькі дужым, але і прыгожым. Я хацеў падабацца Лідачцы... Хацеў, каб ёй было гэтак жа радасна глядзець мне ў твар, як мне самому — на яе... Ах, які я быў шчаслівы і высакародны ў тых сваіх падлеткавых марах і парываннях!

...Але прыйшла вясна. Пачарнеў, змізарнеў і нарэшце ўзняўся ў неба лёгкім воблачкам наш каток — і разам з гэтым воблачкам быццам адляцела кудысьці ў нябачную далеч і Лідаччына зімовая прыхільнасць да мяне.

Ужо даўно зеляненелі падрэчныя лугавіны, ужо адцвіталі сады і буяў у квецені бэз, як аднойчы, схапіўшы па алгебры «дрэнна» (з выдатнікаў цяпер я вельмі імкліва каціўся ўніз па нахіле да той мяжы, за якой, здзекліва выскаляючыся, то паказвалася, то зноў хавалася другагодніцтва), адзінокі і нікому не патрэбны, брыў я па тым самым Чортавым масціку, з якога некалі зімою, у марах сваіх, нёс я на руках аж да самага нашага дома Лідачку...

І раптам я пачуў смех! Знаёмы смех, якога дома ў нас я, аднак, ніколі не чуў. Дома ён проста гучаў, дома ён быў проста смехам. А тут! Тут ён бруіўся недзе з самай глыбіні грудзей ці, можа, з самага сэрца... Лідачка ішла насустрач мне з прыгожым хлопцам. Я гэта адразу ўбачыў, што ён прыгожы. У яго было ўсё прыгожае: і твар, і валасы, і пастава. І ён курыў!

Лідачка глядзела на яго. І вачэй у яе такіх — як і смеху — дома таксама ніколі не было. Яна глядзела і бачыла ва ўсім свеце толькі яго аднаго, гэтага прыгожага хлопца. А мяне, калі мы нават параўняліся (і я адвярнуўся да іх спінаю), яна ці то не пазнала, ці не звярнула на мяне ўвагі, ці проста не заўважыла.

Дадому яна прыйшла позна. І Даша, чамусьці, злуючыся на яе, усяго толькі сказала:

— Ах, як расквітнела!

— І расквітнела! А цябе зайздрасць бярэ? — і сапраўды, зусім не падобная на сябе самую, з выклікам і шчасцем у вачах азвалася Лідачка.

— Ты — дурніца — вось хто ты! — не сцярпела Даша.

— Ну і няхай! Ну і няхай! — заспявала Лідачка і раптам кінулася цалаваць Дашу.

— А ты ведаеш, што ён пра цябе Ларысе казаў? — строга, як маці, спыніла Лідачку Даша.

— Не ведаю і не хачу нічога ведаць! — Лідачка закрыла твар рукамі і засмяялася, і заплакала — адразу.

Я сядзеў у другім пакоі. Дзверы былі прыадчыненыя, і я ўсё чуў і бачыў. І мне было бясконца балюча.

* * *

Прыйшла і мінулася вясна. Мінуліся экзамены. Я сяк-так усё ж перапоўз у наступны клас. І нават без пераэкзаменовак. Даша з Лідачкай таксама скончылі свой педтэхнікум і атрымалі дыпломы і накіраванні на работу. Даша дадому паехала першая. Лідачка чамусьці затрымалася на два дні. Даша, развітваючыся з усімі намі, плакала, і смяялася, і патрабавала, каб мы ўсе абавязкова ёй пісалі пісьмы. І сама абяцала пісаць усім.

Лідачка маўчала. Я здагадаўся, што яна хацела пабыць яшчэ, каб пабачыцца з тым сваім прыгожым хлопцам. Яна некуды хадзіла і сумная вярталася назад, а потым зноў хадзіла...

Праводзіў Лідачку на станцыю ехаць дадому адзін я. Яна пакідала наш дом абыякавая, спакойная, ні слёз, ні смеху, як у Дашы. Як быццам тут заставаліся пустыя сцены і не было людзей, якія любілі яе. Так і мама мая сказала потым, калі я вярнуўся са станцыі.

Мы доўга чакалі цягніка. Лідачка, засмучаная і маўклівая, сядзела на прывакзальнай лаўцы і час ад часу ўсё азіралася на тую сцежачку, па якой мы з ёю ішлі на станцыю. Як быццам чакала некага. І вочы яе былі поўныя слёз.

А калі прыйшоў цягнік, яна гэтак жа моўчкі падала мне руку і пайшла да вагона. Я панёс услед яе рэчы. Я так хацеў, каб яна хоць што-небудзь мне сказала. Хоць якое слова. Хоць адно!

Цягнік крануўся, і Лідачка памахала мне рукою.

— Напішы мне пісьмо! — крыкнуў я ў адчаі.

Яна кіўнула галавой.

Я цэлае лета чакаў яе пісьма.

А калі ўжо страціў усякую надзею, нарэшце прыйшла ад Лідачкі пасылка. Я ледзь дачакаўся маму, каб ісці разам забраць пасылку на пошце. Я так падганяў маму, што яна абурылася нават:

— Андрэй, я цябе не пазнаю! Нават непрыстойна вось так... Як быццам ты галодны ці паміраеш...

Мама нічога не разумела.

Я думаў, што сэрца маё не вытрывае, пакуль мама збіралася, потым пакуль мы ішлі на пошту, потым вярталіся назад, потым адчынялі скрынку.

Божа, папера, газеты... Няма канца гэтай скамечанай паперы і газетам. І нарэшце — слоік мёду! Празрыстага, залатога.

— Ліпавы мёд... Ну і Лідачка! — сказала маці.

А я ўсё трос — перsuccеssтрасаў скамечаную паперу. І не мог вымавіць ні слова. Мама пільна паглядзела на мяне доўгім позіркам і, быццам упершыню ўбачыўшы мяне, адсунула слоік убок.

— Пісьмо Лідачка, напэўна, па пошце паслала, — сказала мама.

Я выбег на вуліцу. На вуліцы свяціла сонца. Я кінуўся ад яго ў сад. У самую гушчыню. Каб нічога не чуць. Каб нікога не бачыць.

Я да вечара плакаў. І з гэтымі слязьмі пакідала мяне назаўсёды маё маленства.

## Пытанні і заданні

1. Якое ўражанне пакінула апавяданне? Хто з герояў вам больш спадабаўся? Чым?

2. Параўнайце Лідачку і Дашу. Чаму, на ваш погляд, Андрэю больш спадабалася сарамлівая Лідачка, а не вясёлая і баявая Даша?

3. Ахарактарызуйце галоўнага героя твора. Якія змены адбыліся ў паводзінах Андрэя ў тую зіму? Раскажыце пра адносіны да вучобы, пра мары і спадзяванні хлопца. З чым вы звязваеце гэтыя змены?

4. Звярніце ўвагу на дыялогі. Якая роля адведзена ім ў тэксце?

Прачытайце яшчэ раз дыялог, які адбыўся паміж гераінямі твора. Як у час размовы характарызуюць сябе дзяўчаты?

Дадому яна прыйшла позна. І Даша, чамусьці, злуючыся на яе, усяго толькі сказала:

— Ах, як расквітнела!

— І расквітнела! А цябе зайздрасць бярэ? — і сапраўды, зусім не падобная на сябе самую, з выклікам і шчасцем у вачах азвалася Лідачка.

— Ты — дурніца — вось хто ты! — не сцярпела Даша.

— Ну і няхай! Ну і няхай! — заспявала Лідачка і раптам кінулася цалаваць Дашу.

— А ты ведаеш, што ён пра цябе Ларысе казаў? — строга, як маці, спыніла Лідачку Даша.

— Не ведаю і не хачу нічога ведаць! — Лідачка закрыла твар рукамі і засмяялася, і заплакала — адразу.

5. Знайдзіце ў тэксце прыклады аповеда, апісання. Як яны звязаны з сюжэтам, дзеяннем твора?

6. Вызначце ў тэксце ролю пейзажных замалёвак. З якой мэтай ужывае іх аўтар? (Каб ахарактарызаваць агульны настрой аповеда, дапамагчы зразумець душэўны стан героя, яго перажыванні і пачуцці, або нешта іншае.)

Напрыклад: «...Але прыйшла вясна. Пачарнеў, змізарнеў і нарэшце ўзняўся ў неба лёгкім воблачкам наш каток — і разам з гэтым воблачкам быццам адляцела кудысьці ў нябачную далеч і Лідаччына зімовая прыхільнасць да мяне».

7. Знайдзіце ў тэксце і зачытайце радкі, якія па сваёй эмацыянальнасці набліжаюцца да вершаваных.

8. Што яднае апавяданне з творам М. Лупсякова «Мэры Кэт»? У чым адметнасць твораў?

## Пра пейзаж

Звярніце ўвагу на тое, што ў самым пачатку твора, калі галоўны герой выпадкова сустракаецца з рознымі людзьмі, сярод якіх «вашчоная бабулька», высокі мужчына з пакункамі ў руках і двое маладых людзей, якія праменяць вакол сябе «токі шчасця», аўтар дае пейзажную замалёўку.

«...Цёмнае бяззорнае неба, не спяшаючыся, вытрасае апошні рукаў старога года і бясконца цярушыць і цярушыць, пасыпае зямлю белай крупчаткай. Паветра пахне лесам, смалой, нядаўна ссечаным ельнікам, і ў гэтай свежасці, напоенай лясным здароўем, здаецца, лунае абяцанне нейкіх бясконца светлых і маладых спадзяванняў і надзей».

Дзякуючы гэтай замалёўцы, мы адразу адчуваем, што гутарка пойдзе не пра бабульку і не пра высокага чалавека. Героямі стануць маладыя людзі, паколькі, падказвае нам аўтар, над усім «лунае абяцанне нейкіх бясконца светлых і маладых спадзяванняў і надзей». Так пейзаж характарызуе агульны настрой аповеда. Можа ён характарызаваць і душэўны стан героя, і яго перажыванні і надзеі.

# ПАДАГУЛЬНЯЮЧЫЯ ЗАНЯТКІ

## Крыжаванка




На працягу навучальнага года вы здзяйснялі падарожжа ў свет літаратуры. Утоеныя словы — у выдзеленых клетках — назвы краін гэтага цікавага свету.

1. Спосаб паказу жыццёвай з'явы, калі важныя думкі і пачуцці не выказваюцца непасрэдна, адкрыта, а як бы стоены за іншымі словамі, угадваюцца па інтанацыі, намёку.

2. Назва прозы з выразнымі адзнакамі паэзіі — павышанай эмацыянальнасцю, багаццем яркіх вобразаў і фарбаў, асаблівай, узнёслай настроенасцю размовы.

3. Назва невялікага па аб'ёме верша, які друкуецца ў слупок, кароткімі радкамі, хоць і не мае строгай рытмічнай арганізацыі, не карыстаецца рыфмай, па мове больш блізкі да прозы.

4. Назва адной з краін вашага падарожжа на працягу года.

5. Кароткае і разам з тым вельмі змястоўнае выказванне, часта з падтэкстам.

Словы для выкарыстання: *афарызм, свабодны, лірычная, паэзія, падтэкст.*

# КАРОТКІ СЛОЎНІК ЛІТАРАТУРНЫХ ТЭРМІНАЎ

**Адухаўленне** — прыпадабненне нежывога прадмета жывой істоце або чалавеку, адзін з відаў **метафары.**

**Амфібрахій** — трохскладовая стапа з націскам на сярэднім, другім складзе: ( __ __́ __ ); вершаваны памер, утвораны з такіх стоп. Гл. верш «Роднае слова» Д. Бічэль.

**Анапест —** трохскладовая стапа з націскам на трэцім складзе: ( __ __ __́ ); вершаваны памер з такіх стоп. Гл. паэму «Курган» Я. Купалы, верш «Ручэй» Я. Коласа.

**Апавяданне** — невялікі празаічны твор, у якім расказваецца пра асобную падзею, здарэнне ў жыцці чалавека, героя твора.

**Вобраз мастацкі** — форма паказу жыцця ў мастацкім творы. Гэта можа быць і герой твора (чалавек), і мастацкае апісанне прадметаў, рэчаў, з'яў прыроды.

**Вымысел** — выдумка, фантазія, да якой звяртаецца пісьменнік у сваёй творчасці для стварэння вобразаў, карцін, сюжэтаў, важнейшы сродак мастацкага паказу жыцця.

**Герой** — дзеючая асоба, персанаж, вобраз чалавека ў творы.

**Гіпербала** — мастацкі прыём, моцнае перавелічэнне ўласцівасцей, якасцей ці памераў прадмета або з'явы з мэтай большай мастацкай выразнасці.

**Гукапіс** — гукавыя паўторы ў мастацкай мове, якія ўзмацняюць яе мілагучнасць і сэнсавую выразнасць.

**Дактыль** — трохскладовая стапа з націскам на першым складзе: ( __́ __ __ ); вершаваны памер, утвораны з такіх стоп. Напрыклад: «Зорка Венера» М. Багдановіча.

**Драматызм** — крайняя напружанасць, вастрыня сітуацыі, падзеі, эпізоду, сюжэта.

**Дыялог** — размова дзвюх або некалькіх асоб.

**Дэталь мастацкая** — падрабязнасць у апісанні пэўных аб'ектаў у творы (пейзажу, партрэта, дзеяння персанажа і г.д.), якая з асаблівай сілай абуджае ўяўленне і творчую думку чытача і нясе значную эмацыянальную і сэнсавую нагрузку.

**Жанр** — від мастацкага твора (апавяданне, аповесць, паэма, байка і г. д.).

**Зваротак** — мастацкі прыём, калі аўтар у вельмі эмацыянальнай форме звяртаецца да чытача, да свайго героя, да роднага краю, з'яў прыроды. Гл. «Радзіме» А. Лойкі.

**Ідэя мастацкая** — асноўная думка твора, якой прасякнуты яго вобразы і карціны, паэтычны сэнс твора, агульная ацэнка тых з'яў, якія паказаны ў творы.

**Інсцэніроўка —** перапрацоўка празаічнага або паэтычнага твора для пастаноўкі на сцэне.

**Інтанацыя** — тон, характар вымаўлення фразы, якія выяўляюць пачуццё, настрой, душэўны стан, адносіны чалавека да таго, пра што ідзе размова.

**Кампазіцыя** — будова мастацкага твора, размяшчэнне і спалучэнне асобных частак, эпізодаў, карцін.

**Лагічны націск** — выдзяленне голасам слова ў сказе, фразе, якому надаецца асабліва важнае значэнне.

**Літаратура мастацкая** — слоўна-вобразная мастацкая творчасць.

**Метафара** (гл. таксама **адухаўленне, увасабленне**) — мастацкі прыём і спосаб паказу жыцця, у аснове якога ляжыць схаванае параўнанне.

**Падтэкст мастацкі** — прыхаваны сэнс якога-небудзь выказвання, эпізоду ці твора ў цэлым.

**Памер вершаваны** — паняцце, якое ўжываецца для вызначэння рытмічнай канвы верша і паказвае колькасць і характар стоп у вершаваных радках.

**Параўнанне** — мастацкі прыём характарыстыкі аднаго прадмета, з’явы пры дапамозе супастаўлення іх з іншымі.

**Партрэт** — такое апісанне знешнасці персанажа, якое характарызуе яго як чалавека.

**Паўза** — адзін з элементаў інтанацыі, большы ці меншы па працягласці прыпынак голасу ў час чытання літаратурнага твора.

**Паэзія** — адзін з асноўных відаў (разам з прозай) мастацтва слова, эмацыянальна-вобразная вершаваная творчасць.

**Пейзаж** — апісанне прыроды, якое мае важнае значэнне для характарыстыкі дзеяння, душэўнага стану героя.

**Персанаж** — дзеючая асоба, герой твора.

**Проза** — адзін з двух асноўных відаў (разам з паэзіяй) слоўна-мастацкай творчасці, заснаваны на празаічнай мове.

**Рытм, рытмічнасць** — адна з найважнейшых адзнак верша, раўнамернае паўтарэнне, чаргаванне націскных і ненаціскных складоў, стоп у вершы.

**Рыфма** — сугучнасць канчаткаў вершаваных радкоў.

**Рэфрэн** — слова, радок або некалькі радкоў, якія паўтараюцца пасля кожнай страфы або абзаца.

**Сімвал** — слова ці выраз, якія ўжываюцца ў пераносным сэнсе і абазначаюць нейкую жыццёвую ці грамадскую з'яву — дружбу, цвёрдасць, смеласць, гл., напрыклад, верш «Хлеб-соль» С. Гаўрусёва, дзе выраз «хлеб-соль» абазначае такую рысу характару беларусаў, як гасціннасць.

**Стапа** — група складоў з адным націскным, якія раўнамерна паўтараюцца ў вершаваным радку. Стопы бываюць двухскладовыя (ямб, харэй) і трохскладовыя (дактыль, амфібрахій, анапест).

**Страфа** — частка верша з пэўнай рыфмоўкай радкоў, якая рэгулярна паўтараецца на працягу твора.

**Сюжэт** — сістэма падзей у апавядальным творы, раскрыццё дзеяння твора і праз яго — характару героя ці герояў. Сюжэт у развіцці праходзіць ад завязкі праз кульмінацыю да развязкі.

**Тропы** — словы або выразы, якія маюць пераноснае значэнне, дадатковы мастацкі сэнс (эпітэт, параўнанне, увасабленне, гіпербала, іронія і інш.).

**Тэма** — тое, пра што ідзе размова ў мастацкім творы, жыццёвая з'ява або кола жыццёвых з'яў, якія прыцягнулі ўвагу аўтара, зацікавілі яго.

**Увасабленне** — мастацкі прыём, разнавіднасць метафары, прыпадабненне з'яў прыроды да паводзін чалавека. Гл. **адухаўленне.**

**Харэй** — двухскладовая стапа з націскам на першым складзе: ( __́ __ ); вершаваны памер, утвораны з такіх стоп.

**Эпіграф** — выказванне, якое змяшчаецца адразу пасля загалоўка і перадае асноўны сэнс зместу твора.

**Эпізод** — пэўны момант у дзеянні (здарэнне, выпадак), у сюжэце мастацкага твора, важны для разумення, характарыстыкі дзеючых асоб.

**Эпілог** — заключная частка твора, у якой паведамляецца пра тое, што адбывалася пасля асноўнага дзеяння.

**Эпітэт** — мастацкае азначэнне, якое адыгрывае важную ролю ў характарыстыцы жыццёвых з’яў, чалавека. Гл. верш «Роднае слова» Д. Бічэль.

**Ямб** — двухскладовая стапа з націскам на другім складзе: ( __ __́ ); вершаваны памер, утвораны з такіх стоп.

## ЗМЕСТ

**Дарагія сябры!** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

**І. Чарадзейная сіла мастацтва** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

Музыка-чарадзей. (Беларуская народная казка) . . . . . . . . . .6

*Генрык Сянкевіч.* Янка-музыка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .11

*Змітрок Бядуля.* Музыка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .22

Пытанні і заданні для падагульнення па раздзеле . . . . . . . .26

**ІІ. Акрыленасць паэзіі і разважлівасць прозы** . . . . . . . 28

*Валерый Пазняк.* Прыходзіць час святы . . . . . . . . . . . . . . .29

*Кастусь Жук.* Скрыпка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .31

*Уладзімір Дамашэвіч.* Абуджэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .33

*Максім Лужанін.* Дождж . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .42

*Янка Сіпакоў.* Чым пахне дождж.
(Урывак з нарыса «Даверлівая зямля») . . . . . . . . . . . . . . . .43

*Паўлюк Трус.* Над возерам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .45

*Іван Пташнікаў.* Возера Нарэчча.
(Урывак з апавядання «На шчасце») . . . . . . . . . . . . . . . . . .47

*Пятрусь Броўка.* Ах, восень, восень… . . . . . . . . . . . . . . . .49

*Іван Шамякін.* У лесе і ў полі восенню.
(Урывак з апавядання «Непрыгожая») . . . . . . . . . . . . . . . .50

*Пятро Глебка.* Хмаркі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .53

*Міхась Лынькоў.* Позняя восень.
(Урывак з апавядання «Недапетыя песні») . . . . . . . . . . . . .55

Пытанні і заданні для падагульнення па раздзеле . . . . . . . .56

**III. Нам родная песня ў сэрца запала** . . . . . . . . . . . . . . . . 58
Прыйдзі, прыйдзі, вясна… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .59
Ох, і сеяла Ульяніца лянок… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .60
Ах ты, сонца-сонейка… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .61
Рабіна, рабіначка… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .62

**IV. Загадкавая краіна Паэзія** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 64
*Анатоль Вярцінскі.* Дзівак чалавек . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .64
Падагульненне ведаў пра вершаскладанне . . . . . . . . . . . . .67
*Максім Танк.* Паэзія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .70
*Алег Лойка.* Радзіме . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .71
*Сцяпан Гаўрусёў.* Хлеб-соль . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .73
*Рыгор Барадулін.* Матылёк . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .75
Пытанні і заданні для падагульнення па раздзеле . . . . . . . .77

**V. Таямнічае ў звычайным і паўсядзённым** . . . . . . . . . . 80
*Васіль Хомчанка.* Звон пад зямлёй . . . . . . . . . . . . . . . . . . .81
*Якуб Колас.* «Дзеравеншчына» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .99
*Янка Маўр.* Палескія рабінзоны. (Скарочана) . . . . . . . . . .106
*Алена Васілевіч.* Горкі ліпавы мёд . . . . . . . . . . . . . . . . . . .144

**Падагульняючыя заняткі** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 160

**Кароткі слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў** . . . . . . 161

В у ч э б н а е   в ы д а н н е

Беларуская літаратура
Факультатыўныя заняткі

**ЛОГІНАВА** Таццяна Уладзіміраўна
**МАРОЗ** Таццяна Іванаўна

# ТАЯМНІЦА ПАЭЗІІ І ЗАГАДКА ПРОЗЫ

**7 клас**

***Дапаможнік для вучняў агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання***

Рэдактар *Н. Ф. Крыцкая*
Камп'ютарная вёрстка *Л. В. Касцюкевіч*
Мастацкі рэдактар *В. П. Калінін*
Стыльрэдактар *Н. Ф. Крыцкая*

Падпісана ў друк 18.10.2010. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Гарнітура Times. Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 9,76. Ул.-выд. арк. 6,99. Тыраж 3400 экз. Заказ .

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва».
ЛИ 02330/0494044 ад 03.02.2009.
Вул. Захарава, 19, 220034, г. Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Друкарня "Перамога"».
ЛП 02330/0494182 ад 03.04.2009.
Вул. Таўлая, 11, 222310, г. Маладзечна, Рэспубліка Беларусь.